91(47)
М-33
2193

ЛАРУСКАЕ
УРЫ
і Народнай
Гаспадаркі

INSTITUT für WEISSRUTHENISCHE KULTUR
Abteilung für Natur-und Volkswirtschaftskunde

МАТАР'ЯЛЫ

ДА ГЕОГРАФІІ І СТАТЫСТЫКІ БЕЛАРУСІ

Пад рэдакцыяй проф. А. [redacted]
правадзейнага члена Інстытуту Бел. Культуры

ТОМ І

BEITRÄGE ZUR GEOGRAPHIE UND STATISTIK WEISSRUTHENIENS

ERSTER BAND

МЕНСК — 1928 — MINSK

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
Аддзел Прыроды і Народнай Гаспадаркі

МАТАР'ЯЛЫ
ДА ГЕОГРАФІІ І СТАТЫСТЫКІ
БЕЛАРУСІ

Выдаваныя пад рэдакцыяй
проф. [illegible]
правадзейнага члена Інстытуту

ТОМ ПЕРШЫ

МЕНСК 1928

INSTITUT FUR WEISSRUTHENISCHE KULTUR
Abteilung für Natur-und Volkswirtschaftskunde

91(47)
M 33

BEITRÄGE

ZUR GEOGRAPHIE UND STATISTIK WEISSRUTHENIENS

Herausgegeben unter der Redaktion
von Prof. A. Smolitsch
wirklichem Mitgliede des Instituts

ERSTER BAND

БИБЛИОТЕКА
Академии Наук БССР

MINSK 1928

Арх 2764

Друкарская работа выканана ў друкарні Інстытуту Беларускае Культуры.
Загадчык складальнага аддзелу Г. Л. Крэйнін.
Мэтранпаж Э. Мэрамінскі.
Друкар І. Шыманскі.
Корэктуру вялі: Н. В. Янчанка і Гурло.
Клішэ прыгатаваны ў цынкографіі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.
Друкам распачаты гэты том у чэрвені, скончаны ў сьнежні 1928 году.

Дазваляецца выпусьціць у сьвет.

Неадменны Сакратар ІБК *В. Ластоўскі.*

БЛ 38347

Библиотека
АН БССР

Менск, Друкарня Інбелкульту. Зак. № 327. Галоўлітбел, № 1436. Тыр. 1000.

ПРАДМОВА.

Спаміж дасягненьняў Беларусі, здабытых за апошняе дзесяцігодзьдзе, заслугоўвае адзначэньня адно, быць можа ня вельмі яскравае, але тым ня менш поўнае глыбокага сэнсу ў пэрспэктыве культурнае гісторыі краю. Я маю на ўвазе разьвіцьцё географічнага і статыстычнага самапазнаньня, якое цяпер ахапіла масы насяленьня Беларусі. Вось ужо некалькі гадоў, як на ўсёй прасторы Беларусі, па вёсках і мястэчках распачалася краязнаўчая праца, якая ў пераважнай большасьці мае географічны зьмест; статыстычнымі органамі зьбіраюцца і распрацоўваюцца лічбавыя матар'ялы ў такіх разьмерах, якіх ніколі ня бачыла Беларусь; стварыліся ўмовы, якія дазволілі вылучыцца новай галіне географічнае навукі—Географіі Беларусі. Апошняя цяпер стала адным з асноўных прадметаў выкладаньня ў школах усіх ступеняй да вышэйшых школ Беларусі ўключна. Гэты процэс географічнага самапазнаньня бясспрэчна стаіць у найцясьнейшай сувязі з тымі вымаганьнямі, якія ставіць навуцы эпоха рэволюцыі, эпоха соцыялістычнае перабудовы ўсяго конкрэтнага, вакольнага жыцьця. Для продукцыйнай працы ў гэтую эпоху асабліва неабходна самае тонкае разуменьне і выкарыстаньне ўсіх географічных асаблівасьцяй краю і кожнага яго раёну, а па магчымасьці і кожнае мясцовасьці.

Але адно зьбіраньне географічнага і статыстычнага матар'ялу ёсьць толькі пачаткам гэтае важнае справы, які патрабуе свайго лёгічнага працягу,—распрацоўкі, сыстэматызацыі і апублікаваньня ўсіх вартых таго матар'ялаў. З гэтага боку застаецца яшчэ шмат працы для выкананьня. Статыстычныя матар'ялы распрацоўваюцца і публікуюцца толькі ў вельмі амбежаваных рамках, з мэтаю пераважна даць пэўныя сярэднія лічбы па ўсёй Беларусі і па яе найбуйнейшых падзелках—акругах. Найцікавейшы для географа матар'ял аб дробных тэрыторыяльных адзінках, аб паасобных паселішчах звычайна не публікуецца, дый наўрад ці можа быць апублікаваны ў поўнай меры, дзякуючы сваёй грамознасьці. Тое самае можна ў яшчэ большай меры сказаць аб географічным матар'яле, зьбіраным краяведамі. Усе гэтыя матар'ялы пакуль што неабходна выкарыстоўваць для навуковых географічных прац у сырым відзе, публікуючы, аднак, разам з працамі і больш каштоўныя з выкарыстаных сыстэматызаваных матар'ялаў, каб даць магчымасьць шырэйшым колам дасьледчыкаў як спраўдзіць вывады кожнае працы, так і далажыць сваіх высілкаў для далейшага дасьледваньня таго самага матар'ялу іншымі мэтодамі, з іншых пунктаў разгляду.

Катэдра Географіі Інстытуту Беларускае Культуры, распачынаючы выданьне „Матар'ялаў да Географіі і Статыстыкі Беларусі" мае на ўвазе публікаваць у іх працы пераважна манаграфічнага характару,

пабудаваныя на шырокім выкарыстаньні сырога матар'ялу, які часткаю таксама будзе публікавацца ў дадатках. Такім сырым матар'ялам, па сутнасьці, для географа зьяўляецца і канчатковая публікацыя статыстычнага матар'ялу. Каб зрабіцца гатовым географічным матар'ялам ён павінен быць ня толькі разьмешчаны па гоеграфічнай карце, але ў кожным пункце гэтае карты павінен быць увязаны з цэлым шэрагам географічных элемэнтаў у суцэльнай характарыстыцы географічнага раёну.

Катэдра географіі мае сваім заданьнем географічную распрацоўку ўсіх пералічаных матар'ялаў, якая павінна з усёй масы іх выбраць тыя, што маюць географічнае значэньне і ў належнай меры характарызуюць раён, да якога адносяцца. Атрыманы ў выніку гэтага адбору географічны матар'ял будзе ўжо трывалым і пэўным фундамэнтам, на якім будзе разьвівацца географія Беларусі.

У 1-м томе „Матар'ялаў" зьмяшчаюцца працы, пабудаваныя на статыстычным матар'яле, што тлумачыцца як тым, што гэты матар'ял ужо даўно чакае навуковага выкарыстаньня, так і яго большай даступнасьцю, паўнатой і аднастайнасьцю зьбіраньня, што дазваляе асьвятліць адразу некаторыя шырокія проблемы з належнай гарантыяй упэўненасьці. У далейшых томах „Матар'ялаў" зьявяцца працы пабудаваныя на даных, зьбіраных краязнаўчымі організацыямі, а таксама і самой Катэдрай Географіі, ды іншымі катэдрамі Інстытуту праз іхнія экспэдыцыі.

Было-б вельмі пажадана, каб у навуковай распрацоўцы абшырнага географічнага і статыстычнага матар'ялу аб Беларусі прынялі ўдзел магчыма шырэйшыя колы дасьледчыкаў-географаў і статыстыкаў. Супольнымі высілкамі нам трэба дабіцца, каб посьпехі географічнага самапазнаньня Беларусі былі замацаваны глыбокімі навуковымі падставамі і каб яны як найхутчэй прынесьлі справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва Беларусі тую карысьць, якой ад іх можна спадзявацца.

А. Смоліч.

VORWORT.

Unter den im letzten Jahrzehnt erreichten Errungenschaften Weissrutheniens verdient eine hervorgehoben zu werden, die vielleicht nicht auf den ersten Blick in die Augen fällt, nichtsdestoweniger aber einen tiefen Sinn für die künftige Kulturgeschichte des Landes hat. Ich meine die Entwicklung der geographischen und statistischen Selbsterkenntnis, die erst jetzt in die breite Masse der Bevölkerung Weissrutheniens vorgedrungen ist. Schon einige Jahre sind jetzt verflossen, seitdem im ganzen weissruthenischen Land, in Dörfern und Städtchen eine heimatkundliche Arbeit eingesetzt hat, bei welcher in den allermeisten Fällen der geographische Inhalt überwiegt; statistische Organe sammeln und verarbeiten Zahlenmaterial in einem Umfange, wie in Weissruthenien nie zuvor gesehen hat; es entstanden Verhältnisse, welche ein neues Reis an der geographischen Wissenschaft erstehen liessen, die Geographie Weissrutheniens. Letztere ist eins der Hauptunterrichtsfächer in den Schulen aller Stufen geworden, die Hochschulen Weissrutheniens eingeschlossen. Dieser Prozess geographischer Selbsterkennung steht unstreitig in engstem Zusammenhang mit denjenigen Forderungen, welche an die Wissenschaft der Revolutionsepoche gestellt werden, einer Epoche sozialistischer Umwertung alles sachlichen, umgebenden Lebens. Zu einer produktiven Arbeit ist in dieser Epoche ein sehr feines Verständnis und eine Benutzung aller geographi scher Besonderheiten des Landes und jedes seiner Rayons, nach Möglichkeit jeder Ortschaft erforderlich.

Sammlung von geographischem und statistischem Material ist aber nur der Anfang dieser wichtigen Sache, der nach logisches Weiterentwicklung verlangt, nach Verarbeitung, Systematisierung und Veröffentlichung aller derjenigen Materialien, bei denen sich eine solche lohnt. In dieser Hinsicht ist noch viel zu tun übrig. Statistisches Material wird noch in sehr begrenztem Rahmen bearbeitet und veröffentlicht und zwar vorzugsweise zum Zweck, eine zuverlässige Durchschnittsziffer für ganz Weissruthenien und für ein grösseren Unterteil desselben, für den Bezirk, herauszubringen. Das für den Geographen interessanteste, kleine territoriale Einheiten, einzelne Siedelungen behandelnde Material wird gewöhnlich nicht der Öffentlichkeit übergeben, kann auch schwerlich dank seines grossen Umfanges in genügender Vollständigkeit veröffentlich werden. Dasselbe lässt sich in noch höherem Masse von dem geographischen Material sagen, welches von der Hiematkunde herangeschafft wird. Alle diese Materialien ist man gezwungen, vorläufig für wissenschaftliche geographische Arbeiten in unbearbeitetem Zustande zu verwenden, veröffentlicht aber zu gleich mit diesen Arbeiten wertvollere der behandelten systematisierten Materialien, um so weiteren Kreisen von Forschern die Möglichkeit zu geben, die Ergebnisse einer jeden Arbeit zu verwerten und die

eigenen Kräfte für eine weitere Erforschung desselben Materials mit anderen Methoden und von anderen Geschichtspunkten aus einzusetzen.

Das Katheder für Geographie beim Institut für Weissruthenische Kultur beabsichtigt bei Herausgabe seiner „Beiträge zur Geographie und Statistik Weissrutheniens vorzugsweise Arbeiten monographischen Charakters zu veröffentlichen, die sich auf weitgehendste Benutzung des noch unbearbeiteten Materials aufbauen, das selbst teilweise gleichfalls im Anhange gegeben wird. Die endgiltige Veröffentlichung des statistischen Materials ist im Grunde genommen auch nur jenes Rohmaterial für den Geographen. Damit fertiges geographisches Matetial entstehe, muss dasselbe nicht nur in die geographische Karte eingefügt, sondern auch in jedem Punkte dieser Karte mit einer ganzen Reihe geographischer Elemente zu einer erschöpfenden Charahteristik eines geographischen Rayons verknüpft werden.

Das Katheder für Geographie hat die Aufgabe, sämtliche erwähnten Materialien zu bearbeiten und hierbei aus deren Gesamtmasse diejenigen auszuwählen, welche geographische Bedeutung haben, und in treffender Weise den Rayon charakterisieren, auf den sie sich beziehen. Das als Resultat dieser Auswahl erhältene geographische Material wird dann eine dauerhafte und sichere Grundlage bilden, auf der sich die Geographie Weissrutheniens entwickeln soll.

Im I Bande der „Beiträge" sind Arbeiten aufgenommen, welche sich auf statistisches Material aufbauen, was sich sowohl dadurch erklärt, dass dieses Mtaterial schon lange wissenschaftlicher Bearbeitung harrt, als auch durch die grosse Verständlichkeit, Vollständigkeit und Einheitlichkeit der Sammlung dieses Materials, wodurch es möglich ist, einige umfangreiche Probleme mit einem Male unter der erforderlichen Gewähr für Reichtigkeit zu lösen. In den weiteren Bänder der „Beiträge" werden Arbeiten erscheinen, die sich auf Angaben stützen, welche von heimatkundlichen Organisationen, sowie vom Katheder für Geographie selbst und von anderen Kathedern des Instituts auf ihrem Expeditionen gesammelt worden sind.

Es wäre sehr wünschenswert, dass an der wissenschaftlichen Bearbeitung des reichen geographischen und statistischen Materials möglichst weite Kreise von Geographen und Statistikern teilnähmen. Wir müssen es mit vereinten Kräften soweit bringen, dass die Fortschritte in der geographischen Selbsterkenntnis in Weissruthenien wissenschaftlich fest begründet werden und sie möglichst schnell dem wirtschaftlichen und kulturellen Aufbau Weisrutheniens jenen Nutzen bringen, den man mit Recht von ihnen erhofft.

A. Smolitsch

Г. ГАРЭЦКІ

Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы

(Нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі)

G. GORETSKY

Frontiers of West White-Ruthenia (Bielaruś) in Poland

(The National Construction of West White-Ruthenia)

У С Т У П.

Пад Заходняю Беларусьсю, у сэнсе асобнага этнографічнага комплексу, трэба разумець заходнюю частку Этнографічнай Беларусі. Большасьць тэрыторыі Заходняй Беларусі ўваходзіць у склад Польскай дзяржавы, таму паступова разуменьне Заходняй Беларусі перанесьлі толькі на тэрыторыю Заходняй Беларусі пад Польшчай. Дзякуючы выключна рэзкай адасобненасьці заходня-беларускіх зямель ад карэнных польскіх абшараў, як у адносінах гаспадарчых, нацыянальных, так і палітычных,—тэрмін „Заходняя Беларусь" і блізкія яму польскія тэрміны—Kresy Wschodnie, Ziemie Wschodnie, Kresy północno-wschodnie, Ziemie północno-wschodnie—прыдбалі права на жыцьцё.

Аднак, разуменьне „Заходняя Беларусь", ці правільней „Заходняя Беларусь пад Польшчай", патрабуе больш дэтальнага вызначэньня. Гэта магчыма зрабіць толькі шляхам вызначэньня меж Заходняй Беларусі ў Польшчы. Разуменьне „Заходняя Беларусь" толькі тады будзе лёгічна адмежавана ад іншых географічных разуменьняў, калі будзе адмежавана ад іншых абшараў Польшчы сама тэрыторыя Заходняй Беларусі.

Пытаньне аб усходняй мяжы Заходняй Беларусі ў Польшчы вельмі проста вырашаецца: такою мяжою, відавочна, будзе палітычная мяжа Польшчы на ўсходзе. Складаным зьяўляецца толькі пытаньне аб паўночна-заходняй, заходняй і паўднёвай межах Заходняй Беларусі.

Падставаю далейшых меркаваньняў зьяўляецца пытаньне аб характары меж, аб іх прыродзе; якімі межамі вылучаць Заходнюю Беларусь у Польшчы—гістарычнымі, палітычнымі, гаспадарча-эканомічнымі, ці нацыянальна-этнографічнымі.

Хаця ў Заходняй Беларусі гістарычная мяжа амаль не цалком зьліваецца з межамі эканомічнымі [1]), а гістарычная і эканомічная межы разам амаль супадаюць з межамі нацыянальнымі, асабліва на захадзе Беларусі, аднак, прымат нацыянальнай мяжы, мяжы этнографічнай, павінен быць высунуты з усёю катэгорычнасьцю. Нацыянальныя межы ў гісторыі найноўшага часу мелі і пэўна захаваюць надалей досыць значны ўплыў [2]). Эканомічныя межы бываюць рэзка выяўленымі толькі тады, калі яны аддзяляюць раёны з вельмі глыбокай гаспадарчай

[1]) Лепшым з даказаў гэтага можа служыць першая спэцыяльная праца па эканомічным раёнаваньні Польшчы, зробленая ў Галоўнай Статыстычнай Управе Янам Пекальскевічам і Ст. Зьдзіславам Руткоўскім „Okręgi gospodarcze Polski", Kwartal St. R. 1927, t. IV, z. 3, у павятовым маштабе, згодна якой межы між эканомічнымі раёнамі карэннай Польшчы і Заходняй Беларусі ідуць па старых гістарычных межах.

[2]) Гл. напрыклад: Roman Umiastowski. Granice polityczne, naturalne i obronne w czasach pokoju i wojny. Kraków. 1925. „Granice dzisiejszych bogatych w materjał ludzki państw buduje świadomość i wola narodowa, a w nikłym już stopniu warunki fizjograficzne. Wprost odwrotnie, jak było przed wiekami" (106).

спэцыялізацыяй, пераважна-ж межы між эканомічнымі раёнамі носяць пераходны характар [1]). Такім пераважна пераходным характарам вызначаюцца і эканомічныя межы між Заходняй Беларусьсю і Польшчай, калі ня браць іх у грубым маштабе (паветы). Гістарычныя межы, як і межы эканомічныя, зьяўляюцца больш зьменьлівымі, чым нацыянальныя межы; зьменьлівасьць гісторыка-палітычных умоў часта параліжуе ўплыў, зроблены гістарычнымі межамі ў ранейшыя часы; найяскраўшы прыклад гэтага — сама сучасная Польшча, дзе ў новых межах дзяржавы ідзе сьціраньне ўплыву старых меж, якімі была падзелена Польшча між Расіяй, Нямеччынай і Аўстра-Вэнгрыяй.

Нацыянальныя-ж граніцы зьмяняюцца толькі на працягу стагодзьдзяў. Характар меж у адносінах іх уплыву на гісторыю, іх рэальнасьці, большай альбо меншай выяўленасьці, іх зьменлівасьці і г. д.,—робяць больш об'ектыўным устанаўленьне толькі этнаграфічных меж. Устанаўленьне меж эканомічных, або маючых яшчэ ўплыў гістарычных дае больш волі суб'ектывізму аўтараў, чымся ўстанаўленьне меж нацыянальных. Так званыя межы натуральныя, або прыродныя павінны быць зусім адкінуты, пры разглядзе сучасных меж між краінамі: гісторыя ёсьць паступовае перамаганьне прыродных уплываў; у сучаснасьці ўжо ня можна адшукаць непасрэднага паралелізму ў фізыяграфіі краіны і яе гістарычным, гаспадарчым і палітычным жыцьцём і лёсам. Тым менш можна адшукаць прыкладаў, каб сучасныя дзяржаўныя межы праводзіліся згодна і супадалі з межамі прыроднымі, якраз наадварот [2]). Межы-ж першапачаткавага расьсяленьня розных нацыянальнасьцяй, у якім быў і бязумоўны ўплыў фізыяграфічных асаблівасьцяй краін, сьцёрты процэсам вялікіх нацыянальных перасовак, вандраваньняў і колёнізацыі.

Толькі нацыянальныя межы павінны быць пакладзены ў падставу вызначэньня меж Заходняй Беларусі ў Польшчы. Нацыянальныя-ж межы Заходняй Беларусі—гэта ёсьць межы расьсяленьня беларускай нацыянальнасьці ў Польшчы, межы большасьці беларускай нацыянальнасьці, значыцца межы, у якіх выяўляюцца тыя ці іншыя к о л ь к а с н ы я адносіны беларускай нацыянальнасьці да іншых: пытаньне аб межах Заходняй Беларусі ў Польшчы становіцца пытаньнем аб межах беларускага народу, пытаньнем аб нацыянальным складзе ўсяго насельніцтва Заходняй Беларусі.

Нашыя веды аб нацыянальным складзе тэй ці іншай краіны залежаць ад тых крыніц, з якіх гэтыя веды ўзяты, ад іх пэўнасьці, дэталёвасьці, аб'ектыўнасьці, паўнаты і г. д.

Крыніцы, якія даюць веды аб нацыянальным складзе ўсяго насельніцтва, можна падзяліць у асноўным на дзьве групы: н е п а с р э д н ы х і п а с р э д н ы х крыніц. У першую групу трэба залічыць поўныя („сплошные") перапісы ўсяго насельніцтва, з паказаньнем іх нацы-

[1]) Гл. багатую літаратуру па эканомічным раёнаваньні.

[2]) Прыкладам можа зьявіцца зноў-жа такі сучасная Польшча, межы якой, асабліва на ўсходзе, ня маюць нічога супольнага з фізыяграфіяй краіны. Проф. Э. Ромэр зьяўляецца ў Польшчы прадстаўніком супраціўных думак. У працы „Polska ziemia i państwo", Kraków, 1917, ён гаворыць аб фізычнай а д н а л і т а с ь ц і Польшчы і п е р а х о д н а с ь ц і Украіны і Беларусі; гістарычны лёс краіны ён шукае ў прыродзе, палітычную перамогу Польшчы бачыць у тым, што Польшча ўладала ў свой час усімі дарогамі Літвы і Русі (Украіны), а таму была „przeznaczona na terytorjalnego łącznika tych trzech składowych jednego terytorjum fizycznego, a przez pół tysiąca lat jednego terytorjum politycznego. Terytorjum—i węzły naturalne to taka potęga, że nawet mimo odrębności (czy znacznej?) narodów, które terytorjum zajmują, muszą się znaleść środki na zgodne spółżycie narodów" (74). Навуковае дасьледваньне ідзе тут шляхам адшуканьня хоць-бы і выпадковага паралелізму фактаў фізыяграфіі з зараней выпрацаванай гістарычна-палітычнай схэмай.

янальнага складу; сюды-ж трэба залічыць этнографічныя дасьледваньні ці ўсіх тэрыторый краіны, ці толькі тых абшараў, на тэрыторыі якіх даная нацыянальнасьць сутыкаецца з іншымі нацыянальнасьцямі, г. зн. так званых пераходных абшараў; да групы непасрэдных крыніц можна залічыць і асобныя манографічныя апісаньні або ведамасьці аб нацыянальным складзе насельніцтва якога-небудзь асобнага пункту. Да групы пасрэдных крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва належыць аднесьці перапісы не ўсяго насельніцтва, а толькі часткі, або групы яго, вылучанай па тым ці іншым прынцыпе, напрыклад школьныя перапісы з паказаньнем нацыянальнага складу вучняў, вайсковыя перапісы з паказаньнем нацыянальнага складу арміі, статыстыка выбараў, з устанаўленьнем нацыянальнага складу выбаршчыкаў, або абраных прадстаўнікоў, статыстыка зямельных уласьнікаў, з перапісам іх нацыянальнай прыналежнасьці і г. д. Да групы пасрэдных крыніц можна адносіць поўныя або няпоўныя перапісы насельніцтва па якім-небудзь паказчыку, які знаходзіцца ў цеснай сувязі з нацыянальнай прыналежнасьцю; сюды залічаецца статыстыка рэлігійнай прыналежнасьці, у некаторых выпадках статыстыка прафэсійнай, або клясавай прыналежнасьці і г. д.

Якія з расклясыфікаваных такім чынам крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва можна лічыць найбольш пэўнымі, аб'ектыўнымі, надзейнымі? Бязумоўна, толькі веды пададзеныя непасрэднымі крыніцамі, поўнымі статыстычнымі перапісамі, або этнографічнымі дасьледваньнямі. Веды, зачэрпнутыя з крыніц пасрэдных, зьяўляюцца толькі сурогатамі ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва, якімі можна карыстацца толькі ў выпадку адсутнасьці непасрэдных ведаў. Карыстацца ведамі пасрэдных крыніц першага роду, г. зн. поўных, або няпоўных перапісаў груп насельніцтва можна было-б з пэўнасьцю толькі ў выпадку ідэальнай здавальняльнасьці гэтых перапісаў усім вымаганьням выбарачнай статыстыкі, перш-на-перш у выпадку поўнай структурнай ідэнтычнасьці часткі або групы насельніцтва з структурай усяго насельніцтва. Ідэальная здавальняльнасьць гэтым вымаганьням зразумела немагчыма; большая ці меншая ступень здавальняльнасьці будзе залежаць ад велічыні групы і ад большай ці меншай меры захаваньня прынцыпаў мэханічнасьці пры складаньні групы; з гэтага погляду нацыянальны склад буйных зямляўласьнікаў (асабліва вымераны паводле процанту зямлі ў іх уладаньні да зямлі ў уладаньні ўласьнікаў іншых няцыянальных груп),—ні ў якай меры не задавальняе высунутых прынцыпаў ідэнтычнасьці структуры групы да структуры цэлага: група буйных зямляўласьнікаў занадта малая, складзена яна аднабока, без захаваньня прынцыпу мэханічнасьці, з прадстаўнікоў аднэй соцыяльнай клясы, маючай свае спэцыфічныя гістарычныя асаблівасьці. У малой меры будзе задавальняць высунутыя вымаганьні, відавочна, і статыстыка нацыянальнай прыналежнасьці выбаршчыкаў, або статыстыка абраных прадстаўнікоў,—па тых-жа прычынах; таксама малое задаваленьне будзе і ў нацыянальным перапісу вайсковых, або вучняў, хаця тут ужо ў значна большай меры.

Карыстацца ведамі пасрэдных крыніц другога роду, значыцца поўнымі або няпоўнымі перапісамі насельніцтва па якім-небудзь паказчыку, які знаходзіцца ў цеснай сувязі з нацыянальнай прыналежнасьцю, можна толькі ў тым выпадку, калі гэтая сувязь, пры даных лёкальных умовах, вельмі цесная, калі коэфіцыент карэляцыі між нацыянальнай прыналеж-

2793

насьцю і даным паказчыкам вельмі вялікі; ідэальна гэта магчыма пры поўным супаданьні груп, вылічаных па нацыянальным паказчыку і па якім-небудзь іншым паказчыку, напрыклад, рэлігійнасьці: гэта было-б супаданьне нацыянальных і рэлігійных груп,—становішча, якое ў Эўропе можна прасачыць у адносінах да вельмі нязначных рэлігійных груп.

Такім чынам найбольш надзейнымі крыніцамі ведаў аб нацыянальным складзе ўсяго насельніцтва зьяўляюцца поўныя перапісы ўсяго насельніцтва (колькасны мэтод), або этнографічныя дасьледваньні (якасны мэтод). Больш-жа об'ектыўнымі і больш пэўнымі з іх зьяўляюцца этнографічныя дасьледваньні, асабліва калі яны якасную характарыстыку злучаюць з колькаснай.

Што-ж належыць да об'ектыўнасьці і пэўнасьці саміх перапісаў, то яны залежаць ад цэлага шэрагу фактараў, частка з якіх ляжыць на баку жывых об'ектаў перапісу—самога насельніцтва, а частка на баку „суб'ектаў" перапісу—агентаў статыстыкі, за якімі стаіць сама дзяржава. Ад суадносін гэтых фактараў, іх лёкальнай комбінацыі, і залежыць большая ці меншая пэўнасьць, верагоднасьць перапісу.

Крытыку ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва, атрыманых перапісам, устанаўленьне верагоднасьці іх, звычайна і прыстасоўваюць да крытыкі гэтых фактараў, або ўмоў перапісу. Аднак, гэтыя фактары або ўмовы бываюць звычайна вельмі конкрэтны, вельмі індывідуальны, і, што самае галоўнае, яны так замаскоўваюцца дзяржаўным апаратам, што на веданьні толькі часткі іх (ведаць-жа ўсе конкрэтныя ўмовы немагчыма) ня можна зрабіць абагуленых, пэўных меркаваньняў у ацэнцы верагоднасьці матар'ялаў перапісу аб нацыянальным складзе насельніцтва; або меркаваньні гэтыя будуць занадта агульнымі, занадта суб'ектыўнымі, бо абапёрты на веданьні часткі конкрэтных умоў перапісу. Таму на дапамогу гэтаму тыпу крытыкі нацыянальнай статыстыкі, які можна было-б называць апрыорным, ужываюць іншыя мэтоды крытыкі, якія абапіраюцца на адшуканьні адпаведнасьці ведаў перапісу ведам аб нацыянальным складзе, сабраным за той-жа час, ці блізкі да яго, па пасрэдных крыніцах.

Такі тып крытыкі па пасрэдных крыніцах, асабліва крыніцах першага роду (перапісы часткі або групы насельніцтва), зьяўляецца адным з горшых мэтодаў крытыкі: верагоднасьць больш пэўных матар'ялаў устанаўліваецца па матар'ялах менш пэўных; гэты мэтод можа прывесьці да найбольшых памылак крытыкі. Некаторае значэньне можа мець крытыка па пасрэдных крыніцах другога роду, па ведах поўнае статыстыкі насельніцтва па другіх паказчыках, зьвязаных з нацыянальнай прыналежнасьцю, напрыклад па статыстыцы рэлігійнай. Але крытыкі гэтым спосабам ня можна дапасаваць, калі розныя нацыянальнасьці належаць да аднэй рэлігіі, калі павялічэньне аднэй нацыянальнасьці коштам другой можа быць рэальным процэсам, але ня зьвязаным з рэлігійнай прыналежнасьцю, або наадварот.

Трэці тып крытыкі гэта—хронолёгічны аналіз зьмен нацыянальнага складу насельніцтва, мэтод адшуканьня хронолёгічнай устойлівасьці зьмен; гэта вельмі каштоўны мэтод у параўнаньні з ранейшымі, ён зьяўляецца цалком об'ектыўным, бо аналізуе ўнутраную законаўпарадкаванасьць ведаў аб нацыянальным складзе ў іх зьменах, грунтуючыся на об'ектыўным характары самога процэсу асыміляцыі або экспансіі данае нацыянальнасьці, які заўсёды бывае ўстойлівым на працягу часу і не дае рэзкіх скокаў або зьмен у кірунку.

Пералічаныя вышэй тры мэтоды крытычнай ацэнкі матар'ялаў нацыянальнай статыстыкі найбольш часта ўжываюцца. Значна радзей

выкарыстоўваецца чацьверты мэтод—хоролёгічнага аналізу паказчыкаў у іх статыцы і дынаміцы, географічна-прасторавы мэтод крытыкі. Ён таксама грунтуецца, як і трэці мэтод, на аналізе ўнутраной законаўпарадкаванасьці зьмен паказчыкаў аб нацыянальным складзе ў прасторы, на абшарах данае краіны; падставай яго зьяўляецца таксама характар процэсу асыміляцыі ці экспансіі данае; нацыянальнасьці, які, адбываючыся ўстойліва ў часе, адбываецца ўстойліва і ў прасторы; другой падставай гэтага мэтоду зьяўляецца характар расьсяленьня „тэрыторыяльных" нацыянальных груп па абшары; гэта характар формацыйнага, пластавага, а не гнездавога расьсяленьня: іначай кажучы, прасторавая ўстойлівасьць расьсяленьня данае нацыянальнасьці без раптоўных гнёзд або правалаў на значных тэрыторыях (не бяручы пад увагу ўскрайкаў абшараў, дзе адбываюцца асыміляцыйныя процэсы). Гэты мэтод менш залежыць ад суб'ектыўнай волі крытыка, зьяўляецца найбольш об'ектыўным; гэты мэтод непадзельна зьвязаны з трэцім мэтодам—хронолёгічных зьмен, і мог-бы быць злучаным з ім у адзіны мэтод аналізу хронолёгічнай і хоролёгічнай устойлівасьці *зьмен* нацыянальнага складу і хоролёгічнай устойлівасьці *паказчыкаў* нацыянальнага складу.

Рэдка ўжываецца ў поўным абхопе і мэтод крытыкі нацыянальнай статыстыкі, які можна назваць мэтодам этнографічнай экспэртызы, мэтод экспэртнага этнографічнага контрольнага дасьледваньня ў раёнах, дзе папярэднія мэтоды выявілі незаконамерныя зьмены ў нацыянальным складзе; гэты мэтод крытыкі зьяўляўся-б і найбольш об'ектыўным і найбольш навуковым, але на жаль ён мала пашыраны з-за сваёй дарагоўлі і незацікаўленасьці ў яго дапасаваньні органаў дзяржавы, бо пануючая ў дзяржаве кляса і нацыянальнасьць забясьпечваюць заўсёды спагадныя вынікі статыстыкі для сваёй клясы і нацыянальнасьці, і вынікі этнографічнай экспэртызы для іх непатрэбны.

Абагульваючы, можна так раскласьці сыстэму мэтодаў ацэнкі вынікаў нацыянальнай статыстыкі:

1) Апрыорны мэтод аналізу ўмоў і вынікаў перапісу,
2) Мэтод крытыкі па пасрэдных крыніцах,
3) Хронолёгічны аналіз зьмен,
4) Хоролёгічны аналіз зьмен і разьмяшчэньня паказчыкаў (прасторава-географічны мэтод),
5) Мэтод этнографічнай экспэртызы.

У парадку пасьлядоўнасьці ідзе ўзрастаньне ўсё большай навуковай вартасьці мэтодаў крытыкі; у тым-жа парадку ідзе зьмяншэньне ўжываньня мэтодаў у практыцы.

НЕПАСРЭДНЫЯ КРЫНІЦЫ ВЕДАЎ АБ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ СКЛАДЗЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Пераходзячы да конкрэтнага разгляду нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Белорусі, застановімся ў першы чарод на крыніцах ведаў аб нацыянальным складзе; адначасна прывядзем фактычныя даныя гэтых крыніц бяз іх дакладнай крытыкі, якую перасоўваем надалей.

Найважнейшай крыніцай ведаў аб межах беларускага народу на Захадзе, аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі, спаміж усіх наагул крыніц і ў прыватнасьці спаміж крыніц непасрэдных, зьяўляюцца этнографічныя дасьледваньні. Сынтэз усіх этногра-

фічных дасьледваньняў Заходняй Беларусі даў акадэмік Е. Ф. Карскі ў сваёй працы „Белорусы". Акадэмік Карскі склаў этнаграфічную мапу расьсяленьня беларускага народу (надрукавана ў 1903 годзе)[1]. У 1918 годзе вышла новае выданьне гэтае мапы, значна перапрацаванае на грунце новых крыніц, дасягаўшых аж 1917 году[2]. Падставаю мапы служаць у большасьці выпадкаў толькі друкаваныя крыніцы і матар'ялы, скарыстаныя акадэмікам Карскім амаль цалком. Апрача таго акадэмік Карскі быў у мірныя часы ў Заходняй Беларусі асабіста і дасьледваў там этнаграфічныя адносіны; з яго працы відаць, што ён быў пераважна ў паўночна-заходніх і заходніх раёнах Заходняй Беларусі[3]. Апрача таго, па паўночнай і паўночна-заходняй этнаграфічнай мяжы Заходняй Беларусі Карскі меў вельмі грунтоўныя і дэталёвыя дасьледваньні Анонима[4]) і Яна Развадоўскага. Праца Анонима абапёрта на матар'ялах, „сабраных сельскімі старшынямі ў 1890 годзе"; па гэтых-жа матар'ялах Я. Развадоўскі склаў добрую мапу літоўскай мовы ў Віленшчыне; на грунце гэтых прац акадэмік Карскі пры правядзеньні мяжы ў Віленшчыне дае дэталёвы матар'ял са спасылкамі на статыстычныя даныя аб нацыянальным складзе па асобных валасьцёх. Мяжа беларусаў у Аўгустоўскім павеце ўстаноўлена Е. Ф. Карскім у значнай меры і на грунце асабістых дасьледваньняў. Наадварот, пры ўстанаўленьні мяжы ў былой Горадзенскай губ., за выключэньнем беларускае мяжы ў Беластоцкім і Бельскім паветах, Е. Ф. Карскі не ўспамінае аб асабістых дасьледваньнях у гэтым раёне, не называе таксама асабліва значных у навуковым сэнсе і дэталёвых этнаграфічных прац; тое самае можна сказаць і пра ўстанаўленьне мяжы беларускай нацыянальнасьці ў паўднёвай Меншчыне. Вось чаму трэба лічыць межы беларускага народу, паданыя акадэмікам Карскім у Віленшчыне і на захадзе Горадзеншчыны больш трывалымі, больш угрунтаванымі, чым паўднёвыя межы Заходняй Беларусі, устаноўленыя Карскім на паўднёвай Горадзеншчыне і Меншчыне[5]).

Другою непасрэднаю крыніцаю ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі зьяўляецца перапіс 1897 году[6]). Дэталёва апрацаваныя і па нацыянальнаму паказчыку і па комбінацыі яго з іншымі адзнакамі[7]) даныя гэтага перапісу былі згрупаваны на жаль толькі па павятовых адзінках.

---

[1]) „Белорусы" т. I. Варшава 1903 г.

[2]) Этнографическая карта Белорусского племени. Ординарного академика Е. Ф. Карского. Петроград. Тип. Рос. Акад. Наук. 1918, ст. 2, увага 1.

[3]) Акадэмік Карскі наведаў: у 1888 г. Троцкі павет, у 1896 (лета) Сакольскі п., у 1899 г. Горадзенскую губ.—Заблудава, Шэдню, Гарадок, Гавейнавічы, Вял. і Мал. Бераставіцу, Алекшыцы, Лошу; у 1901 г. Аўгустоўскі павет, у 1903 г. Пружанскі п. (Шэрашова).

У аснову азначэньня мяжы Беларускага народу акадэмік Карскі паклаў выключна даныя мовы: у „дадатках і папраўках" (Белорусы т. II. Варшава 1912) на стар. 278 ён піша: „Адзінае, што больш упарта трымаецца ў беларусаў,—гэта іх мова".

[4]) Этнографическая карта, стр. 7-8.

[5]) Ужо вядомы беларускі этнограф Е. Р. Раманаў у „Материалах по этнографии Гродненской губ., вып. I., Вильно 1911 г." гаворыць, што беларуская мяжа на поўдні Горадзеншчыны ідзе значна далей на поўдзень, чым паказаў акад. Карскі.

[6]) Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Изд. Центр. Статист. Комит. М. В. Д., под. ред. Н. А. Тройницкого. IV Виленская губ. XI Гроденская губ. XX Минская губ. XVII Ковенск. губ. LIX Сувалкская губ.

[7]) У гэтым сэнсе апрацоўка перапісу 1897 г. стаіць непараўнальна вышэй апрацоўкі польскага перапісу 1921 г. (ня кажучы ўжо аб перапісу 1919 г.), які сумысьля адкідае ўсякія комбінацыйныя групоўкі, зьвязаныя з нацыянальнай адзнакаю.

№ 1. Межы Заходняй Беларусі паводле этнаграфічнай мапы акадэміка Е. Ф. Карскага (1917 г).

Frontiers of West-White-Ruthenia according to the ethnographical map by academician E. Th. Karsky (1917).



Назвы паветаў. Names of districts.

1. Ашмяна.	Oshmiany.	12. Берасьце.	Brest.
2. Вільня.	Vilno.	13. Ваўкавыск.	Wolkowisk.
3. Вялейка.	Vileika.	14. Горадня.	Grodno.
4. Дзісна.	Disna.	15. Кобрын.	Kobrin.
5. Ліда.	Lida.	16. Пружаны.	Prushany.
6. Сьвянцяны.	Svientsiany.	17. Слонім.	Slonim.
7. Трокі.	Troki.	18. Саколка.	Sokolka.
8. Язяросы.	Jasiarosy.	19 Навагрудак.	Nowogrudok.
9. Аўгустаў.	Augustow.	20. Пінск.	Pinsk.
10. Беласток.	Bielostok.	21. Слуцак.	Slutsk.
11. Бельск.	Bielsk.	22. Менск.	Minsk.

У адносных вялічынях нацыянальны склад насельніцтва па перапісу 1897 г. паказаны ў табліцы № 1., як па цэлых паветах, так асобна па гарадох і па паселішчах негарадзкога тыпу.

Ува ўсіх заходня-беларускіх гарадох абсолютнаю або адноснаю большасьцю насельніцтва зьяўляюцца яўрэі; ніякая іншая нацыянальнасьць, ні ў адным з гарадоў, не дасягае ні абсолютнай, ні адноснай большасьці, за выключэньнем гарадоў Трокі і Аўгустова, дзе адносная большасьць пераходзіць да палякоў.

У негарадзкіх паселішчах у асноўнай масе паветаў абсолютная большасьць захоўваецца за беларусамі; з іншых нацыянальнасьцяй абсолютную большасьць маюць украінцы ў Кобрынскім і Берасьцейскім паветах, літоўцы ў Езяроскім і Троцкім паветах [1]); палякі ні ў адным з паветаў ня маюць абсолютнай большасьці.

Адносную большасьць беларусы маюць у Віленскім і Сьвянцянскім паветах [2]), палякі ў Аўгустоўскім і Беластоцкім паветах [3]), украінцы ў Бельскім [4]).

Пры разглядзе нацыянальнага складу цэлых паветаў заўважаецца прыблізна такі-ж парадак лічбаў, што і па негарадзкіх паселішчах: адносная вага негарадзкога насельніцтва перацягвае. Беларусам і пры гэтым разглядзе належыць абсолютная перавага ў большасьці паветаў. Абсолютная большасьць застаецца за украінцамі ў Кобрынскім і Берасьцейскім паветах і за літоўцамі ў адным толькі Троцкім павеце, у Езяроскім павеце яны пераходзяць на становішча адноснай большасьці [5]), адносная-ж большасьць застаецца зноў у Сьвянцянскім і Віленскім паветах за беларусамі, у Бельскім за украінцамі, у Беластоцкім і Аўгустоўскім—за палякамі.

Мяжу беларускай нацыянальнасьці згодна перапісу 1897 г. у параўнаньні з этнографічнай мяжой паводле акадэміка Карскага паказвае зьмешчаная тут схэматычная мапка; з паветаў, у якіх беларусы ня маюць абсолютнай большасьці, а знаходзяцца на становішчы адноснай большасьці, альбо нацыянальнай меншасьці, выдзелены ў беларускую этнографічную тэрыторыю часткі абшараў павету пропорцыянальна долі беларусаў у насельніцтве цэлага павету [6]).

Параўнаньне паказвае блізка што поўнае супаданьне на поўначы-захадзе і захадзе этнографічнай мяжы Беларусі, паданай акадэмікам Карскім і праведзенай згодна перапісу 1897 году. Больш значныя адхіленьні сустракаюцца толькі ў (Нова-Аляксандраўскім) Езяроскім і Аўгустоўскім паветах, дзе беларуская тэрыторыя па перапісу менш, чым па акадэміку Карскаму. Але самыя большыя разыходжаньні спатыкаюцца на паўднёвай мяжы Захадняй Беларусі: у беларускую тэрыторыю адыходзяць абшары значна большыя, чым гэта павінна быць згодна

---

[1]) Езяроскі і Троцкі паветы, як паветы ў большасьці бясспрэчна небеларускага характару, маглі-б быць выкінуты з далейшага разгляду; аднак з прычыны ўсё-ж досыць значнай колькасьці беларусаў (17,53 % і 15.86 %), яны ўключаны ў разгляд.

[2]) Зраўнаважваюць іх літоўцы: Віленскі пав. беларусаў 41,86 %, літоўцаў 34,93 %, палякоў 12,11 %; Сьвянцянск. п. беларусаў 49.03 %, літоўц. 34,81 %, паляк. 5,47 %.

[3]) Зраўнаважваюць іх беларусы: Аўгустоўск. п. палякі 49,75 %, беларусы 38,14 %; Беластоцкі п. палякі 41,76 %, беларусы 39.13 %.

[4]) Зраўнаважваюць іх палякі: Бельскі п. украінцы 42,16 %, палякі 36,51 %, беларусы 5,35 %.

[5]) За імі ідуць беларусы: Езяроскі п. літоўцы 49,76 %, беларусы 16,80 %.

[6]) Адхіленьні зроблены толькі па Беластоцкім і Віленскім паветах, дзе мяжа беларусаў праведзена па проценту беларусаў у насельніцтве негарадзкіх паселішч, бо, дзякуючы прысутнасьці на беларускай этнографічнай тэрыторыі небеларускіх па нацыянальным складзе гарадоў—Вільні і Беластоку, процант беларусаў на належачай ім тэрыторыі зьніжаецца пры разьлічэньні процанту па цэлым павеце: у Віленшчыне з 41,86 % да 25,85 %, у Беластоцк. п. з 39,13 % да 25,12 %.

Е. Ф. Карскаму—павялічваецца значна беларуская частка Пружанскага павету, а ў яшчэ большай меры павялічваецца беларуская тэрыторыя ў Пінскім павеце, які цалком становіцца беларускім, бо украінцаў толькі 0,62%.

У гэтым характэрным зьявішчы—несупаданьні паўднёвых меж Заходняй Беларусі і поўным супаданьні меж на захадзе і поўначы-захадзе па этнаграфічнай мяжы Карскага і перапісу 1897 году—ёсьць яскравае сьведчаньне ўжо зробленага вываду аб меншай трываласьці паўднёвай мяжы, устаноўленай для Заходняй Беларусі акадэмікам Карскім, як неўгрунтаванай вынікамі паважных этнаграфічных дасьледваньняў.

У лік непасрэдных крыніц павінен быць залічан і перапіс 1909 году[1]), зроблены па загаду Сталыпіна ў мэтах высьвятленьня нацыянальных і рэлігійных адносін у „Западных губерниях" пры ўвядзеньні ў іх земства; аднак пры гэтым перапісу беларусы і украінцы ня былі вылучаны асобна, а паказаны разам з вялікаросамі, як „русские"; дзеля гэтага перапіс 1909 году можа быць выкарыстаны толькі часткова ў тэй частцы, дзе ён устанаўляе лічбу палякоў. Асабліва важным гэты перапіс зьяўляецца для нашых мэт з тае прычыны, што ў ім вылучана група, „расійцаў—неправаслаўных", у якую па аднадушным прызнаньні папалі беларусы-каталікі[2]); гэта дае магчымасьць вызначыць у другі раз лічбу беларусаў-каталікоў на падставе перапісу ўсяго насельніцтва; у першы раз такая лічба была вызначна перапісам 1897 году; як пабачым пазьней, вызначэньне ліку беларусаў-каталікоў будзе цэнным матар'ялам для крытыкі нацыянальнай статыстыкі.

Процант палякоў у насельніцтве згодна перапісу 1909 г. ў параўнаньні з перапісам 1897 г. паказаны ў дадатку[3]). За выключэньнем Віленскага, Троцкага, Беластоцкага і Бельскага паветаў, дзе заўважаюцца рэзкія зьмены ў проценце палякоў[4]), ва ўсіх іншых паветах процант палякоў не дае рэзкіх зьмен, а самі абсолютныя велічыні процантаў надта малыя, сярэдне 2-3 проценты, і нідзе не перавышаюць 6 процантаў; такім чынам зьмены ў проценце палякоў заўважаюцца найбольшыя там, дзе значэньне палякоў сярод іншых нацыянальнасьцяй было найбольшым; зьмены ў паўночнай частцы ідуць з знакам + для палякоў (Віленскі і Троцкі паветы), у паўднёвай частцы са знакам— (Беластоцкі і Бельскі паветы).

Да шэрагу непасрэдных крыніц належаць і такія крыніцы ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі, як нямецкія перапісы насельніцтва ў часе імпэрыялістычнай вайны 1916, 1917 і 1918 г. г. Вынікі гэтых перапісаў мелі вялікі ўплыў на польскую крытыку нацыянальнай статыстыкі[5]): яны найбольш відавочна сьведчылі аб „фальшывасьці" ўсіх ранейшых перапісаў і іншых крыніц ведаў аб нацыянальным складзе.

---

[1]) Министерство внутренних дел. 20 янв. 1910 г. В Государственную Думу. О применении положения о земских учреждениях 12 июня 1890 г. к губ. Витебск., Волын., Киев., Минск., Могилев. и Подольской. Приложение. Статистические материалы по 9 западным губерниям.

[2]) E. Romer i Ign. Weinfeld. Rocznik Polski. Tablice statystyczne. Kraków. 1917. Jan Czekanowski. Stosunki narodowościowo—wyznaniowe na Litwie i Rusi. Prace geograficzne wydane przez Eugenjusza Romera. Zeszyt I, Lwów, 1918, стар. 24.

[3]) Табліца № 2. У Ў. Вакара („Rozwój terytorjalny narodowości Polskiej", cz. III) па Віленшчыне іншыя лічбы; дзесятыя процантаў адкінуты.

[4]) А якраз: Віленскі павет з 20% у 1897 годзе да 43% у 1909 годзе, Троцкі п. з 11 да 22%, Беластоцкі п. з 34 да 18%, Бельскі з 35 да 9%.

[5]) Гл. Jan Czekanowski „Stosunki...", стар. 24. Таксама Edward Maliszewski. Ze statystyki Litwy i Białej Rusi. Wschód Polski. 1920. № 6 і 7, стар. 46: „Ale najsilniejszy

№ 2. Межы беларускай нацыянальнасьці ў Польшчы згодна з перапісам 1897 году.

Frontiers of the White-Ruthenian Nation in Poland according to Census of 1897.



Нямецкі перапіс 1916 году[1]) ахапіў толькі нязначную і самую заходнюю частку Заходняй Беларусі. Дапасаваны ён быў да нямецкіх адміністрацыйных адзінак, якія не супадалі ні з валасьцямі, ні з паветамі перадваеннага падзелу, чаму параўнаньне нямецкага перапісу з перапісам 1897 году зрабіць вельмі цяжка. Карыстаемся параўнаньнем, зробленым Э. Малішэўскім[2]). Вайсковы перапіс 1916 году рэгіструе перш-на-перш страшэнны спад ліку насельніцтва, параўнаўча ня толькі з перадваенным часам (1913 г.), але нават і з канцом XIX стагодзьдзя (1897 г.). Насельніцтва ў Горадзеншчыне, Лідчыне зьменшылася паводле гэтага перапісу больш як у два разы, у Троцкім павеце прыблізна ў два разы, у Віленскім толькі на 1/3 параўнаўча з 1897 годам. Зьмены ў нацыянальным складзе нямецкі сьпіс паказвае таксама надзвычайна вялікія. Асноўны характар гэтых зьмен—проста фэерычны ўзрост ліку і значэньня палякоў за кошт, галоўным чынам, беларусаў: доля беларусаў у Віленшчыне спадае ў 20 раз, у Лідчыне з 3/4 насельніцтва і з 2/3 у Горадзеншчыне яна зьнізілася да 1/5; доля-ж палякоў узрасла ў апошніх паветах у 10 і больш разоў.

У літаратуры аднак ёсьць проста адваротныя весткі аб нацыянальным складзе окупаванай немцамі часткі Віленскай губэрні[3]), якія грунтуюцца таксама на нямецкім перапісу 1916 году; падаем гэтыя весткі згодна А. Wileńsk'аму. І па гэтай крыніцы нямецкі сьпіс паказвае зьмены лічбы беларусаў супроць лічбаў 1897 г., але значна меншыя: у Віленскім павеце беларусаў налічваецца па гэтай крыніцы ў 13-14 разоў больш, чымся па першай, іх адносная доля вышэй 1/4 насельніцтва; у Лідзкім павеце за імі абсолютная большасьць; таксама абсолютную большасьць маюць беларусы і ў Ашмянскім павеце, а ў Сьвянцянскім павеце большасьць адносную[4]). Па гэтай крыніцы ведаў аб выніках нямецкага вайсковага сьпісу ніякага катастрофічнага зьніканьня беларусаў няма; палякі па гэтай крыніцы хаця і займаюць большу долю ў насельніцтве параўнаўча з 1897 г., але з усіх пяці паветаў Віленшчыны нідзе ня маюць абсолютнай большасьці, а большасьць адносную захоўваюць толькі ў адным Віленскім павеце.

---

cios obliczeniom statystyki urzędowej rosyjskiej zadał dopiero również urzędowy i również niechętny Polakom spis niemiecki z r. 1916...“ Проф. Э. Ромэр таксама надае выключную вагу нямецкім перапісам: „Wschód Polski. 1920. № 2. O Litwie historycznej i woli jej mieszkańców. (стар. 15): „Zasłona, starannie zarzucana na prawdę przez władze i statystyki rosyjskie, zwiana została przez silny podmuch wielkiej wojny. Ktokolwiek przyszedł na Litwę, przekonywał się ze zdumieniem, jak fałszywe były informacje rosyjskie, któremi świat od lat dziesiątków bałamucono. A tym ważniejsze były te świadectwa, iż pochodziły ze źródeł niemieckich, a więc nie dających się posądzić o przychylność dla Polaków“.

[1]) Bericht über die Einrichtung und Fortentwicklung der Verwaltung Wilno für das I Viertel und das Wilno—Suwalki für das II Viertel des Jahres 1916.

[2]) „Ze statystyki Litwy i Białej Rusi...“ Гл. Табл. № 3. Лік насельніцтва за 1913 г. пададзены паводле „Статистического Ежегодника России“.

[3]) Wileński A. Nationalitätenfrage in Litauen und Weissruthenien. Polnische Blätter. Berlin. 1917. Band VI. Лічбы зьмешчаны ў Я. Чэканоўскага („Stosunki“, стар. 29).

[4]) Проф. Э. Ромэр „Spis ludności...“, стар. 4. іначай перадае зьмест ведаў аб нацыянальным складзе часткі Віленшчыны і Горадзеншчыны па гэтай-жа крыніцы „Polnische Blätter, Berlin, 1917, Band VI“;ён піша: ...„ nietylko miasta wielkie Wilno i Grodno, ale nawet cały wówczas przez Niemców okupowany obszar dawnej Litwy historycznej, obejmujący znaczne części bylej gubernji grodzieńskiej i wileńskiej jest zamieszkany przez cztery elementy etniczne (Polacy, Białorusini, Litwini i Żydzi), z których wprawdzie żaden nie ma absolutnej większości, lecz z pośród których najliczniejszymi są Polacy“. Як ужо паказана (табл. № 3-а) якраз наадварот: беларусы маюць абсолютную большасьць у Ашмянскім і Лідзкім паветах і адносную большасьць у Сьвянцянскім.

Па тэй-жа крыніцы нямецкага вайсковага сьпісу ёсьць паказаньні аб агульнай лічбе беларусаў-каталікоў у Віленскім і Троцкім паветах [1]).

Па перапісу 1916 году (па першай крыніцы—„Bericht"...—веды якой, як бачым, зьяўляюцца спрэчнымі) палякі набываюць абсолютную большасьць насельніцтва ў горадзе Вільні, у Віленскім і Лідзкім паветах. У Горадзеншчыне да іх пераходзіць адносная большасьць. У Троцкім павеце, які ўсё-ж захоўвае літоўскую большасьць, палякі робяць паважную меншасьць ($^1/_3$ насельніцтва).

Ні апісаньня ўмоў, мэтодаў і прынцыпаў правядзеньня нямецкага сьпісу, ні дэталёвых лічбаў сьпісу, ні тым болей лічбаў гэтага сьпісу ў комбінацыі з іншымі паказчыкамі, хаця-б напрыклад з рэлігійнымі прыналежнасьцямі насельніцтва, ня ўдалася адшукаць [2]).

Лічбы нямецкага перапісу ад 14/XII-1916 і 10/I-1917 па нямецкіх адміністрацыйных адзінках прыводзіць і Adam Zakrzewski [3]). З дэталёвых лічбаў відаць, што больш-менш значны процант беларусаў быў толькі ў нямецкіх адміністрацыйных адзінках: Ліда 42,9 % (палякі 33,2 %), Плянты 55,7 % (палякі 28,8 %), Васілішкі 26,9 (палякі 57,8 %).

У другой сваёй працы [4]) проф. Ян Чэканоўскі піша, што табліцы нямецкіх перапісаў 1916 і 1918 гадоў былі скрадзены ў немцаў віленскімі палякамі і прывезены ў Парыж гр. Путкаммэрам, а агалошаны аўтарам у асобнай працы [5]). Гэта дазваляе меркаваць, што лічбы пададзеныя Я. Чэканоўскім больш адпавядаюць нямецкім орыгіналам, чымся лічбы Э. Малішэўскага [6]).

Зусім мала вестак і першакрыніц ёсьць аб нямецкім вайсковым сьпісу 1918 г. З нямецкай мапы [7]) „Völkerverteilung in Verwaltungs-gebiet Ob. Ost.", складзенай відавочна на выніках сьпісу 1918 году, можна здабыць такое выяўленьне аб проценту палякоў у паасобных нямецкіх адміністрацыйных адзінках:

1. Звыш 80 процантаў палякоў—Вільня, Радунь, Аўгустоў, Беласток.
2. Абсолютная большасьць палякоў—Падбродзьдзе, Васілішкі, Горадня, Саколка, Бельск.
3. Адносная большасьць палякоў—Маляты.
4. Звыш 25 процантаў палякоў—Кашадары, Ліда, Плянты, Алекшыцы, Зьдзенцёл.
5. Звыш 5 процантаў—Ваўкавыск, Сьвіслач.

---

[1]) Яна досыць значная: з 92.160 беларусаў 84.490 каталікоў, або 91,7 %. З гэтай прычыны Ян Чэканоўскі піша: („Stosunki" стар. 30): „Otrzymaną przez niemców nadmierną, bez żadnej wątpliwości sztuczną, ilośc mieszkańców, podających się za Białorusinów-katolików, wyjaśniają najzupełniej wysiłki władz okupacyjnych".

[2]) Нямецкі Reichsarchiv (у Потсдаме пад Бэрлінам), дзе знаходзяцца архіўныя матар'ялы вайсковага сьпісу 1916—18 г. г., як гэта давялося мне высьветліць у 1926 г., ня змог даць гэтыя матар'ялы для скоп'яваньня: матар'ялы нібы былі заняты вялікай навуковай распрацоўкай.

[3]) Obszar i zaludnienie Polski. У „Dziejè gospodarcze Polski porozbiorowej w zarysie. Dzieło zbiorowe pod kierunkiem St. A. Kempnera. t. II. Warszawa. 1922".

[4]) „Wschodnie zagadnienie graniczne Polski. I. Stosunki etniczne—społeczne. Lwów, 1911, стар. 20—21.

[5]) „Note sur la statistique demographique des confins orientaux de la Pologne. Commission Polonaise des Travaux Preparatories au Congrés de la Paix. Paris. Mai. 1919".

[6]) Гісторыю зьяўленьня ў сьвет даных нямецкага перапісу падае і проф. Э. Ромэр „Spis ludności na terenach administrowanych przez Z. C. Z. W." Lwów—Warszawa, 1920, стар. 4; яна аналёгічна гісторыі, паданай проф. Я. Чэканоўскім. Там-жа Э. Ромэр гаворыць аб супярэчнасьці лічбаў нямецкага сьпісу 1916 г. па дзьвюх крыніцах („Polnische Blätter..." і „Bericht..."); для Віленскага павету Э. Ромэр гаворыць аб 4-х нямецкіх сьпісах, між сабою абсолютна нязгодных.

[7]) Gezeichnet u. gedrückt v. Verw. Abt. 10 in Mai 1918. Mass-stab 1 : 500.000. Darstellung Verteilung der Polen.

Гэтыя веды ня можна параўнаць ні з перадваеннымі, ні з ранейшымі нямецкімі ведамі па перапісах 1916 і 1917 гадоў. Для раёну Вільні і Горадні сьпіс 1918 году сьцьвярджае нібы яшчэ далейшае ўзрастаньне палякоў, чым гэта было адзначана сьпісам 1916 г.

Пасьля перапісу 1897 г. перапіс насельніцтва, праведзены Цывільным Урадам Усходніх Зямель „Z. C. Z. W." Польшчы, зьяўляецца першым поўным перапісам насельніцтва Заходняй Беларусі, у тым сэнсе, што ён ахапіў амаль не цалком тэрыторыю сучаснай Заходняй Беларусі пад Польшчай, і поўным у тым сэнсе, што ім былі перапісаны ўсе нацыянальныя групы насельніцтва. Калі першы поўны перапіс у Заходняй Беларусі, перапіс 1897 году, можна лічыць расійскім перапісам, то перапіс 1919 году можна лічыць першым польскім перапісам на тэрыторыі Заходняй Беларусі: у гэтым яго гістарычнае значэньне. Вынікі польскага перапісу 1919 году прыцягнулі да сябе ўвагу відных польскіх дасьледчыкаў; усімі імі падкрэсьлівалася выключнае значэньне гэтага перапісу, напрыклад Эдвард Малішэўскі [1]) лічыць сьпіс 1919 г. „za niewątpliwie najlepszy ze wszystkich spisów dotychczasowych. Dzięki tej pracy dopiero opinja świata całego ma dziś po raz pierwszy możność należytego zorjentowania się w skomplikowanych stosunkach narodowościowych rozległego kraju, przeważającego swym obszarem byłe Królewstwo Kongresowe".

Усю важнасьць перапісу 1919 году прызнае і E. Romer [2]): „Spis ludności dokonany na obszarach zajętych przez wojska polskie jest jednym z najwspanialszych dokumentów pracy administracyjnej z czasów wielkiej wojny światowej".

Для об'ектыўнага навуковага дасьледваньня вартасьць перапісу 1919 году асабліва павялічваецца не таму, што ён першы польскі перапіс, а таму, што ён адбыўся ў выключна цікавы з многіх поглядаў час (у сэнсе дэмаграфічным, гаспадарчым і інш.) і што яго правядзеньне і друкаваньне было прыстасавана да старых адміністрацыйных адзінак, старых валасьцей і паветаў, а да таго-ж вынікі сьпісу выдрукаваны ў першы раз для тэрыторыі Заходняй Беларусі па самых дробных тэрыторыяльных адзінках—валасьцёх [3]): гэта дае магчымасьць больш дэталёвай крытыкі вынікаў гэтага перапісу, дае магчымасьць ужыць ужо разабраныя мэтоды хронолёгічнага і хоролёгічнага аналізу статыстычных даных перапісу; мэтод хоролёгічнага аналізу зусім ня можна было-б скарыстаць, каб вынікі перапісу агалошаны былі-б толькі ў павятовых межах, як гэта рабілася раней.

Прагледзім фактычныя даныя перапісу спачатку ў павятовых межах [4]).

Але перад разглядам фактычных даных некалькі ўваг. Выдрукаваньне матар'ялаў перапісу 1919 г. зроблена без падзелу ведаў, асобна па гарадзкім і негарадзкім насельніцтве. У „Spisie" Э. Ромэра ёсьць асобная таблічка з паказаньнем у асобных гарадох толькі процанту палякоў. Няма ў „Spisie" і дакладных ведаў аб усіх нацыя-

[1]) Polski spis ludności na Ziemiach Wschodnich z Grudnia 1919 r. Wschód Polski. 1920. № 10—11, стар. 21.

[2]) Prace geograficzne, wydawane przez Eugenjusza Romera. Zeszyt VII. Spis ludności na terenach administrowanych przez Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (grudzień 1919). Z mapą. Wydał Eugenjusz Romer. Lwów—Warszawa. 1920, стар. 3.

[3]) Павет Навагрaдзкі падзелены быў пры перапісу на два паветы: Баранавіцкі і Навагрaдзкі; новы павет Браслаўскі быў вылучаны з частак Ілукштанскага павету Курляндзкай губ. і Езяроскага пав. Ковенскай губ. (Нова-Аляксандраўскі п.). Сьпіс не ахапіў Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага паветаў.

Ня можна не адзначыць навуковую заслугу проф. Э. Ромэра, стараньнем якога сьпіс быў надрукаваны па самых дробных тэрыторыяльных адзінках—валасьцёх.

[4]) Гл. Табліцу № 4.

нальнасьцях, а толькі аб галоўных з іх (палякі, беларусы, яўрэі, тутэйшыя). Не падае Ромэр і абсолютных вялічынь, а толькі адносныя па асобных нацыянальных групах. Недахопы „Spisu“ прышлося выпраўляць па копіях архіўных матар'ялаў перапісу 1919 году [1]), але, на жаль, і гэтыя матар'ялы не даюць дакладных зьвестак аб колькасьці ўсіх паасобных нацыянальнасьцяй.

Паводле перапісу 1919 году, як і паводле перапісу 1897 г., у большай частцы гарадоў Заходняй Беларусі абсолютная, або адносная большасьць належыць яўрэям. Аднак перапіс паказвае некаторыя зьмены параўнаўча з перапісам 1897 г. Зьяўляюцца гарады з абсолютнай большасьцю беларусаў (Вялейка і Радашкавічы). Ёсьць ужо гарады і з польскай абсолютнай большасьцю, чаго ня было ў 1897 годзе; сюды належаць Вільня, Ліда, Трокі, Кобрын, у якіх у 1897 годзе палякі ня мелі нават адноснай большасьці (апрача Трок). У Дзісьне палякі дасягаюць адноснай большасьці. Расійцы амаль цалком выходзяць з складу гарадзкога насельніцтва Заходняй Беларусі.

У паселішчах негарадзкога тыпу адбываюцца, згодна перапісу 1919 г., таксама вельмі рэзкія зьмены ў нацыянальным складзе насельніцтва. Беларусы, параўнаўча з 1897 годам, трацяць абсолютную большасьць у паветах: Ашмянскім, Дзісьненскім, Лідзкім, Ваўкавыскім, Горадзенскім і Слонімскім [2]). У Віленскім і Сьвянцянскім паветах, дзе беларусы мелі ў 1897 годзе адносную большасьць, яны робяць зусім няпрыметную меншасьць у 1919 годзе [3]).

Такім чынам, асноўная рыса перапісу 1919 г.—гэта рэзкая рэдукцыя ў складзе насельніцтва беларусаў, якая ў некаторых паветах падобна нейкай катастрофе, бо перапіс сьведчыць аб раптоўных зьніканьнях і зьмяншэньнях беларусаў у дзесяткі разоў параўнаўча з 1897 годам. Гэта рэдукцыя беларусаў у найбольш інтэнсыўным разьмеры ахапіла заходнія і паўночна-заходнія раёны Заходняй Беларусі. У паўднёвых паветах адбываецца нібы адваротны процэс: тут значэньне беларусаў павялічваецца; у Берасьцейскім павеце да беларусаў пераходзіць адносная большасьць, а разам з тутэйшымі абсолютная большасьць. Пінскі павет дае зусім малое зьмяншэньне долі беларусаў, у Кобрынскім павеце беларусы разам з тутэйшымі складаюць абсолютную большасьць [4]).

Украінцы, згодна перапісу 1919 году, блізка што зусім зьнікаюць з Кобрынскага і Берасьцейскага паветаў, дзе за імі была абсолютная большасьць у 1897 годзе.

Зьмяншаецца і значэньне ў негарадзкім насельніцтве літоўцаў, хаця ў значна меншай меры, чым гэта адбылося з беларусамі і украінцамі. Адносная большасьць ліцьвінаў у Троцкім павеце пераходзіць да палякаў [5]).

Расійцы, як і ў гарадох, цалком зьнікаюць са складу насельніцтва і ў негарадзкіх паселішчах [6]). Зьніжаецца і значэньне яўрэяў.

---

[1]) Скоп'яваны ў бібліотэцы Галоўнай Статыстычнай Управы Польшчы ў 1926 г.

[2]) Процант беларусаў зьменшыўся з 1897 г. да 1919 г. так: Ашмянскі п. 81,6% да 6,0%, Дзісьненскі п. 84,5%—24,2%, Лідзкі 76,2%—14,7%, Ваўкавыскі 87,1%—19,4%, Горадзенскі 81,8%—33,5%, Слонімскі 86,3%—41,6%.

[3]) Процант беларусаў зьніжаецца: Віленскі п. з 41,9% да 0,3%, Сьвянцянскі п. з 49,0% да 13,8%.

[4]) Берасьцейскі п. беларусаў у 1897 г. 1,6%, у 1919 г. 45,3%, плюс тутэйшых 17,7%, а разам 63,0%; Пінскі п. 84,0%—75,0%, Кобрынскі п. у 1897 г. беларусаў 0,9%, у 1919 г. 6,0% плюс тутэйшых 74,5%, разам 80,5%.

[5]) Процант літоўцаў у 1897 г. і 1919 г. Віленскі п. 34,9%, і 7,5%. Сьвянцянскі п. 34,8% і 28,2%, Троцкі 59,0% і 40,4%. Тут адбілася і зьмена граніц паветаў, адыход літоўскіх частак, іх да Літвы.

[6]) Значны процант расійцаў у 1919 г. нібы быў у Дзісьненскім павеце—34,8%

№ 3. Межы беларускай нацыянальнасьці ў Польшчы згодна з польскім перапісам 1919 г.

Frontiers of the White-Ruthenian Nation in Poland according to Polish Census of 1919.



Характэрным зьявішчам перапісу 1919 г. зьяўляецца ўстанаўленьне новай нацыянальнай групы—так званых „тутэйшых“ і людзей з „невядомай“ нацыянальнай прыналежнасьцю. Тутэйшых вельмі многа ў паўднёвай частцы Заходняй Беларусі: у Кобрынскім павеце іх 3/4 ўсяго насельніцтва, 1/6 насельніцтва належыць тутэйшым і невядомым у Ашмянскім, Берасьцейскім і Слонімскім паветах; блізкім да іх зьяўляецца па колькасьці тутэйшых Ваўкавыскі павет; не малое значэньне тутэйшыя і невядомыя займаюць і ў Наваградзкім і Пінскім п. п. „Тутэйшыя“—людзі з неакрэсьленаю нацыянальнаю прыналежнасьцю, людзі з нявысокай нацыянальнай сьвядомасьцю; зразумела імі не маглі быць ні палякі, ні літоўцы; гэта, бязумоўна, беларусы і часткай беларусы-паляшукі, або украінцы-паляшукі, гэта група, якая ня вышла яшчэ са стадыі так званай „этнографічнай масы“. Прысутнасьць і ў такой паважнай долі тутэйшых у складзе насельніцтва Заходняй Беларусі сьведчыць аб нявысокай нацыянальнай сьвядомасьці мясцовога беларускага насельніцтва наогул, аб няскончаным процэсе консолідацыі гэтай сьвядомасьці; а гэты факт зьяўляецца грунтам для ўсякіх неспадзяванак, да якіх могуць прывесьці вынікі нацыянальнай статыстыкі Заходняй Беларусі, калі імі карыстацца без адпаведнай крытыкі.

Асноўным фонам зьмен у нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі па перапісу 1919 г. зьяўляецца, як бачым, зьмяншэньне ўсіх нацыянальных груп (беларусы, яўрэі, украінцы, літоўцы, расійцы) апрача тэй, якая здабыла дзяржаўнасьць у гэтай краіне, апрача палякоў.

Палякі, якія ў 1897 г. ня мелі ні абсолютнай, ні адноснай большасьці ні ў адным з паветаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а х о п л е н а й п е р а п і с а м 1919 г., набываюць абсолютную большасьць у Ашмянскім, Віленскім, Лідзкім, Троцкім, Горадзенскім і Ваўкавыскім паветах, гэта зн. пераважна ў паўночна-заходніх і заходніх паветах Заходняй Беларусі; адносную большасьць палякі набываюць у Дзісьненскім павеце, Сьвянцянскім і Браслаўскім, г. зн. зноў-такі ў паўночных паветах Заходняй Беларусі.

Пры разглядзе нацыянальнага складу насельніцтва цэлых паветаў (насельніцтва гарадоў і негарадзкіх паселішчаў разам) заўважаецца тая-ж законаўпарадкаванасьць, што і пры разглядзе насельніцтва негарадзкіх паселішч.

Мяжа беларускага народу, праведзеная на падставе вынікаў перапісу 1919 г.[1]), як бачым, адхіляецца значна на ўсход. Гэтае адхіленьне дужа вялікае на паўночным захадзе і захадзе Беларусі, дзе ад беларускай этнографічнай тэрыторыі адыходзіць амаль палова абшараў да Польшчы; гэта так званы „Віленскі корыдор“ і часткі Горадзенска-Ваўкавыскага раёну. На поўдні адхіленьні ідуць наадварот за этнографічную мяжу Беларусі па Карскаму: да беларускай тэрыторыі далучаецца каля чатырох паветаў (Пінскі, Кобрынскі, Берасьцейскі, Пружанскі); адхіленьне ідзе яшчэ далей на поўдзень, як яно ішло супраць мяжы акадэміка Карскага згодна перапісу 1897 году, калі да беларускай тэрыторыі далучаліся толькі два паветы (Пінскі і Пружанскі).

Крытычны разгляд матар'ялаў перапісу 1919 г. адкладаем надалей; пакуль што падаем фактычныя веды, сабраныя перапісам.

Праз два гады (30/XII-1919 г.—30/IX-1921 г.) на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбыўся другі польскі перапіс, які не ахапіў на жаль Ві-

---

супраць 5,9% у 1897 годзе; ніякай колёнізацыі расійцамі Дзісьненскага п. за час 1897—1919 г. г. ня было—„расійцы“ Дзісьненскага павету ёсьць беларусы; у такім разе ў Дзісьненскім павеце беларусы будуць мець абсолютную большасьць.

[1]) Гл. схэматычную мапку № 3.

ленскага, Троцкага, і Сьвянцянскага паветаў і часткі Ашмянскага і Браслаўскага. Гэты перапіс ахапіў усю Польшчу і быў фактычна першым усепольскім перапісам насельніцтва. Каштоўнасьць яго для Заходняй Беларусі, у сэнсе высьвятленьня нацыянальнага складу насельніцтва, дужа павялічваецца тым фактам, што гэта быў другі польскі перапіс на тэй-жа тэрыторыі Заходняй Беларусі, што стварылася, дзякуючы гэтаму, магчымасьць параўнаньня вынікаў перапісу 1919 г. з вынікамі перапісу 1921 г., а праз гэта стварылася магчымасьць ужыць больш матар'ялу і больш складаны мэтод для крытыкі нацыянальнай статыстыкі. Вынікі перапісу аб нацыянальным складзе выдрукаваны і па валасьцёх, і па паселішчах; гэта дазваляе самую дробную апрацоўку даных перапісу. Але з другога боку ня былі выдрукаваны комбінацыйныя табліцы насельніцтва, дзе-б у комбінацыю ўваходзілі і паказчыкі нацыянальнай прыналежнасьці: гэта значна звужае магчымасьці крытыкі.

Прывядзем фактычныя даныя перапісу 1921 г., пакуль што ў павятовых межах і ў пералічэньні ўсіх даных на старыя адміністрацыйныя павятовыя адзінкі, у старых павятовых межах, бо толькі ў такім выпадку можна будзе рабіць параўнаньні вынікаў перапісу 1921 г. з вынікамі перапісу 1919, 1897 г. і іншымі данымі аб нацыянальным складзе, прыстасаванымі да паветаў у старых межах [1]).

Перапіс 1921 г. адзначае нібы поўны пераварот у нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі, які закрануў ня толькі вёскі і негарадзкія паселішчы наагул, дзе пачуцьцё нацыянальнай прыналежнасьці і сьвядомасьці ў заходня-беларускіх умовах ня так востра, але і гарады, дзе нацыянальныя адносіны носяць выразна-акрэсьлены характар.

Заходня-беларускія гарады, дзе па абодвух ранейшых перапісах абсолютнай, або адноснай большасьцю былі яўрэі, раптоўна і рэзка зьменшылі яўрэйскі характар, яўрэі нібы перайшлі на становішча нацыянальнай меншасьці ў гарадох, за выключэньнем толькі Браславу, Слоніму і Пінску, дзе за яўрэямі застаецца абсолютная большасьць і Берасьця і Пружан, дзе захоўваецца адносная яўрэйская большасьць [2]). Рэшта гарадоў зрабілася нібы выразна польскімі: Вялейка, Ліда, Аўгустоў, Ваўкавыск, Кобрын, Саколка [3])—прыдбалі ў 1921 г. абсолютную польскую большасьць; Дзісна, Беласток, Бельск, Горадня—адносную польскую большасьць [4]). Адзіныя гарады з беларускай абсолютнай большасьцю ў 1919 г.—гарады Вялейскага павету—нібы сталі польскімі; зьявіліся гарады з адноснай беларускай большасьцю, гэта гарады Наваградзкага павету. Наагул-жа характэрнай рысай перапісу 1921 г. было сьцьвярджэньне неспадзяванага факту вялікай устойлівасьці беларусаў сярод гарадзкога насельніцтва [5]); толькі ў некаторых паветах процант беларусаў у гарадох зьменшыўся значна—Вялейка, Ліда, Горадня; у рэшце гарадоў значэньне беларусаў або ўзрастае, або застаецца вельмі ўстойлівым.

---

[1]) Гл. табліцу № 5.

[2]) Асабліва рэзкія зьмены ў процанце яўрэяў адбыліся з 1919 да 1921 г. у такіх гарадох: Браслаў—73,5-56,8, Берасьце—71,7-46,2; Ваўкавыск—58,0-39,3, Горадня—58,9-43,4; Пружаны—74,8-46,5; Слонім—79,2-67,4; Наваградак—59,0-28,5.

[3]) Процант палякоў зьмяніўся з 1919 да 1921 г.: Вялейка 21,2-53,6; Ліда 58,4-65,6; Ваўкавыск 36,4-57,3; Кобрын 53,7-55,3.

[4]) Процант палякоў зьмяніўся з 1919 да 1921 г.: Дзісна 49,4-49,3; Горадня 32,9-49,9.

[5]) Процант беларусаў быў у 1919 і 1921 г. Вялейка 64,6-19,9; Дзісна 10.4-15,0; Ліда 1,6-1,0; Берасьце 8,3-7,3; Ваўкавыск 2,1-2,2; Горадня 7.5-4,3; Кобрын 4,6-10,9; Пружаны 16,7-20,6; Слонім 6,1-6,3; Наваградак 26,9-41,4; Пінск 3,3-9,8.

Асноўным зьявішчам, якое нібы адбывалася ў зьмене нацыянальнага складу насельніцтва гарадзкіх паселішч з 1919 да 1921 г., было зьмяншэньне значэньня яўрэяў і адпаведнае ўзрастаньне значэньня палякоў, відавочна коштам яўрэяў, бо значэньне беларусаў больш-менш устойлівае.

У паселішчах негарадзкога тыпу перапіс 1921 г. паказвае абсолютную большасьць палякоў ува ўсіх паветах Заходняй Беларусі, апрача паўднёвай і ўсходняй групы—Вялейскага, Берасьцейскага, Кобрынскага, Пружанскага, Слонімскага, Наваградзкага і Пінскага, дзе абсолютная большасьць (Кобрын, Пружаны) належыць беларусам. Павялічэньне процанту палякоў у асобных паветах ішло няроўнамерна. Найбольшае павялічэньне было ў паветах: Вялейка, Дзісна, Браслаў, Ваўкавыск, Кобрын, Пружаны, Наваградак і Пінск; у Слонімскім павеце значэньне палякоў трохі зьнізілася, у рэшце паветаў павялічылася, але нязначна. Павялічэньне процанту палякоў ахапіла, такім чынам, тыя паветы, дзе процант палякоў у 1919 г. быў невялікім, г. зн. паўднёвую і ўсходнюю групу паветаў, і чым менш быў процант палякоў, тым павялічэньне было большае; у Пінскім павеце павялічэньне палякоў было ў пяць раз, у Пружанскім у чатыры разы, у Кобрынскім у тры разы, у Наваградзкім у два разы і г.д.[1]).

У 1921 г. амаль цалком зьніклі прадстаўнікі так зв. „тутэйшай" нацыянальнасьці, апрача больш-менш значнай групы яе ў Кобрынскім павеце і мізэрнай групкі ў Берасьцейскім і Пінскім паветах. Зьніклі амаль зусім расійцы з Дзісьненскага і Вялейскага павету[2]), значна спаў і процант яўрэяў у негарадзкім насельніцтве[3]).

Такім чынам, агульным зьявішчам зьмен нацыянальнага складу негарадзкога насельніцтва Заходняй Беларусі ад 1919 г. да 1921 г. было таксама зьніжэньне „недзяржаўных" нацыянальнасьцяй (яўрэі, літоўцы, тутэйшыя, расійцы, асноўная маса насельніцтва—беларусы) і павялічэньне долі ў насельніцтве тэй нацыянальнасьці, у руках якой была дзяржаўнасьць—палякоў.

Процант беларусаў зьменшыўся няроўнамерна[4]). У частцы паўночна-заходніх паветаў ёсьць узрост беларусаў коштам пераходу ў іх групу ўсіх тутэйшых, у Дзісьненскім павеце ўзрост беларусаў коштам пераходу ў іх групу „расійцаў"; павялічэньне беларусаў ёсьць і ў паўднёвых паветах: у Берасьцейскім павеце да беларусаў пераходзіць група тутэйшых, у Ваўкавыскім таксама пераходзіць частка тутэйшых (большая частка групы тутэйшых Ваўкавыскага павету пераходзіць да палякоў), у Кобрынскім частка тутэйшых таксама пераходзіць да беларусаў. Стацыянарным застаецца значэньне беларусаў у паветах: Лідзкім, Браслаўскім і Горадзенскім. У іншых паветах значэньне бе-

---

[1]) Процант палякоў у 1919 і 1921 г.: Ашмяна 68,7-71,1; Вялейка 31,7-45,0; Дзісна 38,1-41,8; Ліда 78,3-77,8; Браслаў 53,0-70,5; Берасьце 21,3-27,4; Ваўкавыск 59,8-70,9; Горадня 54,0-57,1; Кобрын 11,8-37,2; Пружаны 11,7-45,2; Слонім 32,4-28,3; Наваградак 15,7-39,6; Пінск 3,5-17,0.

[2]) Проц. расійцаў зьнізіўся з 1919 да 1921 г.: Вялейка 5,5-0,3; Дзісна 34,8-0,5.

[3]) Найбольш характэрныя зьмены: Ашмяна 4,7-1,5; Берасьце 11,1-8,8; Ваўкавыск 7,2-6,1 Горадня 10,6-8,9; Пружаны 6,9-3,9; Пінск 6,4-5,2; гэта зьмена процантаў яўрэяў за кароткі двухгадовы час значна перавышае зьмены % яўрэяў за 12 год—з 1897 да 1909 г.: % яўрэяў за 12 г. зьмяніўся: Ашмяна 12,1-13,3; Берасьце 21,9-22,0; Ваўкавыск 12,6-12,2; Горадня 20,7-20,8; Пружаны 13,0-12,9; Пінск 19,6-17,9; лічбы ўзяты адносна яўрэяў у цывільным насельніцтве (W. Wakar).

[4]) Процант беларусаў быў у 1919 і 1921 г.: Ашмяна 6,0-27,2. Вялейка 56,0-51,7; Дзісна 24,2-55,0; Ліда 14,7-14,0; Браслаў 15,5-15,0; Берасьце 63,0-61,2; Ваўкавыск 30,9-22,7; Горадня 33,5-32,9; Кобрын 80,5-50,4; Пружаны 71,8-49,7; Слонім 61,4-65,1; Наваградак 74,6-54,2; Пінск 78,2-77,8.

Б Л 38347 Библиотека АН БССР

ларусаў зьмяншаецца і найбольш там, дзе асабліва павялічваецца значэньне палякоў (напрыклад, Пружаны, Навагрудак).

У гарадзкіх і негарадзкіх паселішчах разам нацыянальны склад бліжэй і ў 1921 годзе да складу насельніцтва негарадзкіх паселішч. І ў разьмяшчэньні паказчыкаў нацыянальнага складу, і ў іх зьмене законаўпарадкаванасьці застаюцца прыблізна аднымі і тымі-ж.

Прагледзім, як ідзе мяжа беларускага народу ў Польшчы па перапісу 1921 г. [1]). У беларускую тэрыторыю адмежаваны часткі паветаў пропорцыянальна проценту ў іх беларусаў; гэта чыста ўмоўны спосаб і азначэньне дакладнай мяжы беларусаў значна зьменіцца пры дэталёвым разглядзе разьмяшчэньня беларусаў па тэрыторыі хаця-б па валасьцёх. Як бачым, мяжа беларускага народу, якую можна правесьці паводле перапісу 1921 г., вельмі блізка ў асноўных рысах да мяжы праведзенай, згодна перапісу 1919 г., з тэю толькі розьніцай, што на поўначы-захадзе мяжа з 1921 г. адыходзіць яшчэ далей на ўсход, аддзяляючы да Польшчы частку Дзісьненскага і Вялейскага паветаў, а на захадзе мяжа гэтая стацыянарна і нават пасуваецца трохі на захад, захопліваючы значную частку Бельскага павету (звыш 1/4) у беларускую тэрыторыю; на поўдні мяжа стацыянарна, яна аддзяляе ў беларускую тэрыторыю, як і ў 1919 г. ўсе палескія паветы цалком: Пінскі, Кобрынскі, Пружанскі і Берасьцейскі.

У параўнаньні з этнографічнай мяжой Беларусі акадэміка Карскага польскі перапіс 1921 г. вызначае ўсю заходнюю і паўночна-заходнюю палову этнографічнай беларускай тэрыторыі Заходняй Беларусі, як п о л ь с к і я абшары. Польскі перапіс залічае ў Польскую тэрыторыю амаль усе прасторы „Віленскага корыдору“ і ўвесь Горадзенска-Ваўкавыска-Беластоцкі раён. На поўдні польскі перапіс 1921 г., як і перапіс 1919 г., паказвае рэзкае разыходжаньне меж беларускай нацыянальнасьці з этнографічнай мяжой акад. Карскага, але ўжо ў бок павялічэньня беларускай тэрыторыі і павялічэньня вельмі значнага. Тлумачэньне таго а ня іншага праходжаньня мяжы згодна польскаму перапісу 1921 г. будзем шукаць пазьней.

Польскі перапіс 1921 г. быў апошнім перапісам насельніцтва Заходняй Беларусі. Іншых непасрэдных крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі мы ня маем. Разглядаць апошнюю катэгорыю непасрэдных крыніц, якою зьяўляюцца паасобныя манаграфічныя апісаньні нацыянальнага складу паасобных географічных пунктаў, ня варта ў гэтай працы і з прычыны іх нямногалікасьці на тэрыторыі Заходняй Беларусі з часу яе жыцьця пад Польшчай, і з прычыны патрэбнасьці падыходзіць да іх разгляду і аналізу іншымі мэтодамі, чым якімі тут карыстаецца аўтар.

Як абразок паасобных адзіночных апісаньняў і нагляданьняў нацыянальнага складу Заходняе Беларусі можна прывесьці заўвагі польскага аўтара неспэцыяліста-этнографа. Проф. d-r Witold Staniewicz [2]) піша пра нацыянальную прыналежнасьць сялян вёскі Матуйзы—Баландзішкі Лідзкага павету:

... „Matujzy są dość typową katolicką wsią białoruską z kulturą wybitnie polską. Matujzianie w życiu codziennem mòwią gwarą polsko-białoruską, czyli, jak się tu mówi, „po prostemu“... ... „Wszyscy jednak mieszkańcy, zarówno mężczyźni, jak kobiety, a także dzieci doskonale mówią po polsku i uważają siebie za polaków...“


---

[1]) Гл. схэматычную мапку № 4.

[2]) Dr. Witold Staniewicz. Matujzy—Bołondziszki, wieś powiatu Lidzkiego Studjum społec ne i gospodarcze“. з „Bibljoteki zakładu polityki agrarnej Szk. Gł. Gosp. Wiejskiego, redag. przez Prof. dr. Ludkewicza“, № 3. Wilno. 1923, стар. 115.

№ 4. Межы беларускай нацыянальнасьці ў Польшчы згодна з другім польскім перапісам насельніцтва 1921 году.

Frontiers of the White-Ruthenian Nation in Poland according to the second Polish Census of 1921.



Гэта паведамленьне проф. В. Станевіча аб беларускай мове і нібы польскай нацыянальнай сьвядомасьці беларуска-каталіцкага насельніцтва аднэй вёскі на паўночным захадзе Лідчыны, а фактычна і ўсяго беларуска-каталіцкага насельніцтва Віленшчыны, зробленае зусім нядаўна, вельмі цікава. Яно паказвае, каго польская статыстыка і грамадзкасьць лічыць за палякоў (насельніцтва вёскі Матуйзы па перапісу 1921 г. паказала сябе палякамі). Гэтыя афіцыйна палякі, фактычна беларусы, гавораць пабеларуску, папросту, і толькі часова, пакуль што, слаба зачэплены нацыянальным беларускім рухам [1]).

Да непасрэдных крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва, ахапляючых не паасобныя пункты, а паасобныя часткі тэрыторыі Заходняй Беларусі, трэба заліцыць этнографічныя дасьледва́ньні dr-a Людвіка Чаркоўскага ў Бельскім павеце [2]).

Згодна матар'ялаў Л. Чаркоўскага этнографічная мяжа ў гэтым павеце ідзе недалёка ад Драгічына на Боцькі, праходзіць між Бранскам і Бельскам, бліжэй да Бельску, і адтуль накіроўваецца на Сураж, аддзяляючы ў беларускія і украінскія абшары паўднёва-ўсходнюю і ўсходнюю часткі Бельскага павету. Е. Czyński [3]), прыймаючы па Бель-

[1]) Тут варта прывесьці, як прыклад навуковых недарэчнасьцяй, разважаньні і нагляданьні проф. М Handelsmana. (M. Handelsman. O dzisiejszą politykę naszą na Białej Rusi. Wschód Polski. 1921. № 1—3, стар. 35). Ён лічыць, што Беларусь не складае суцэльнае географічнае краявіднае індывідуальнасьці:

„kzajobrazowo pod względem wyglądu swego zewnętrznego Białej Rusi niema. Jeżeli mimo to nie można ziemi tej omawiać jedności, to jedność tą daje jej system rzeczny, rozbijający Białoruś na dwie odrębne całości, z których zachodnia, aż po Mińsk włącznie związana jest przez Niemen i wschodnie dopływy Wisły z Litwą i Polską właściwą".

Так, падобна проф. Э. Ромэру, проф. М. Handelsman хоча абаперці сваю палітычную тэзу на факты фізыографіі, хаця-б яны ня мелі ні ў эканомічным, ні ў культурным жыцьці краіны больш-менш паважнага значэньня. Нібы давёўшы адсутнасьць географічнага адзінства Беларусі, M. Handelsman лічыць, што няма на Беларусі і адзінае беларускае мовы:

„Wrażenie ogólne jest takie, że każda wieś mówi językiem zupełnie innym" (Там-жа, стар. 35 і 36).

„... właściwie nie może być mowy o jednym języku, lecz o szeregu języków na Białej Rusi".

„A przy niewyrobieniu języka białoruskiego literackiego, przy słabym rozpowszechnieniu prasy białoruskiej, przy dużym wpływie rosyjskim na twórczość literacką białoruską, zwłaszcza np. w okresie bolszewickim, język literacki, słabo docierający na wieś, jest w małym stopniu czynnikiem ujednostajniającym mowę ludu, jest raczej pośrednikiem, ułatwiającym jej rusifikację"...

Адным словам (стар. 36. Курсыў мой. Г. Г.) „Białorusinów, jako jednego narodu z świadomością narodową, nie widzimy" Беларус Заходняе Беларусі бліжэй нібы да польскага пана з Заходняй-жа Беларусі, чым да беларусаў з Усходняй, цяпер Савецкай Беларусі: (Там-жа, стар 39).

...„rodzi się poczucie solidarności całej ludności tego kraju. Naprzekór propagandzie, chłop nie daje sie użyć przeciwko dworom, raczej przeciwnie".

[2]) L. Czarkowski. Powiat Bielski w gub. Grodzieńskiej. Zarys ludoznawczy. Rocznik Towarzystwa przyjaciół nauk w Wilnie. 1907. Большая і найважнейшая частка гэтай працы зьмешчана была яшчэ ў тыднёвіку „Głos" 1887 г. „Listy z Podlasia". Аб гэтай працы A. Zakrzewski („Dzieje gospodarce Polski porozbiorowej") піша, што ёсьць яна „jedyne bodaj w literaturze polskiej studjum etnograficzne o powiecie Bielskim" (стар. 14).

[3]) Etnograficzno-statystyczny zarys liczebności i rozsiedlenia ludności Polskiej. Opracował Edward Czyński przy współpracownictwie T. Tillingera. Wyd. drugie. Warszawa. 1909. Праца гэтая выклікала агульнае нездаваленьне ў польскай літаратуры, бо Czyński ў асноўным карыстаецца лічбамі перапісу 1897 году. Аб этнографічнай мяжы ў Бельскім і Беластоцкім паветах ён піша: „Dokładny przebieg granicy w pow. Bielskim jest przedstawiony na jednej z map atlasu, przyczem oparliśmy się głównie na ankiecie w r. 1887 przez

скім павеце межы Л. Чаркоўскага, праводзіць, але вельмі прыблізна, беларускую этнаграфічную мяжу у Беластоцкім павеце. Яна ад Суражу ідзе далей скрозь па былой мяжы Горадзенскай губэрні, па р. Бабры, г. зн. далей к захаду, чым мяжа акад. Карскага.

Да непасрэдных крыніц належыць і праца ўжо цытаванага A. Zakrzewsk'ага; ён падае дакладныя лічбы аб нацыянальным складзе па пяці асобных валасьцёх Аўгустоўскага павету за 1913 год[1]). У гэтых валасьцёх была налічана абсолютная большасьць беларусаў (27.196 чалавек, або 94,4% ўсяго насельніцтва); асноўнай масай беларусаў Аўгустоўшчыны зьяўляюцца беларусы-каталікі (25.787, або 94,8% ад усіх беларусаў).

Непасрэднай крыніцай ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва можна лічыць і „сьпісы паселішчаў", калі ў іх падаюцца даныя аб нацыянальным складзе. Такія сьпісы па Сувалскай губэрні ёсьць за 1888 г.[2]). Згодна гэтых сьпісаў пяць валасьцей з дванаццаці ў Аўгустоўскім павеце маюць беларускую абсолютную большасьць; да гэтых валасьцей далучаюцца яшчэ дзьве з беларускай абсолютнай большасьцю па матар'ялах 1913 г.; такім чынам большасьць Аўгустоўскага павету была перад вайною (1913 г.) беларускаю.

ПАСРЭДНЫЯ КРЫНІЦЫ ВЕДАЎ АБ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ СКЛАДЗЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Аднэю з першых пасрэдных крыніц і крыніцай поўнаю, бо яна ахапіла ўсе нацыянальныя групы, зьяўляецца статыстыка нацыянальнага складу расійскай арміі па паветах, але яе цалком трэба адкінуць, як занадта старую (1858 год.)[3]).

Другою крыніцаю пасрэдных ведаў аб нацыянальным складзе была нацыянальная статыстыка зямляўласьнікаў і зямляўладаньня і статыстыка выбаршчыкаў у Земства. Згодна статыстыцы зямляўладань-

---

czasopiśmo „Głos" przeprowadzonej. Co do pow. białostockiego bieg granicy jest tylko do. myślny, gdyż dotąd niema spisu narodowościowego wszystkich wsi rzeczonego powiatu" (73)

[1]) „Dzieje gospodarcze", стар. 7. У 1913 годзе лічылася ў валасьцёх: Вялікая Бальля—беларусаў 6697, палякоў 150; Валавічоўцы—белар. 6095, паляк. 1257; Галынка—белар. 5787, паляк. 36; Лабна—белар. 5583, паляк. 119; Петрапаўлаўск—белар. 3034, паляк. 46; разам па 5-ці валасьцёх—белар. 27196, паляк. 1608. З беларусаў 1439 праваслаўных і 25787 каталікоў, або 94,8%. Па перапісу 1921 г. ў 5-ці вал. было нібы талькі 49 белар., а ўсе іншыя палякі!?

[2]) „Списки населенных мест Сувалкской губ., как материал для историко-этнографической географии края. Собрал Э. А. Вольтер. СПБ 1901 г."

У 1888 г. лічылася:

Воласьці:	Усяго:	Белар.:	Воласьці	Усяго:	Белар.:
Шчэбра-Альшаны . .	6991	632	Дэмбова	3218	3192
Петрапаўлаўск . . .	3247	295	Галынка	5709	4316
Лабна	4554	2321	Валавічоўцы . .	7970	910
Кур'янка	4275	4133	Вял. Бальля . . .	5584	5382

На гэтую працу робіць спасылку акад. Карскі ў „Этнографической карте". стар. 10. Карскі лічыць увесь Аўгустоўскі павет беларускім, але ён піша: „Ввиду сильного ополячения августовских белоруссов не находим возможным заметно увеличивать общую их цифру (25712)" (к 1917 году. Г. Г.). Параўнаньне лічбаў Э. Вольтэра з лічбамі A. Zakrzewsk'ага паказвае, аднак, дужа значнае павялічэньне беларусаў у 5-ці вал. з 13224 у 1888 г. да 27196 у 1913 г.; і гэта згодна польскай крыніцы. Мінімальны лік беларусаў у Аўгустоўскім павеце ў 1913 г. 35209 чал.

[3]) А. Ф. Риттих (полк. Ген. Штаба) Племенной состав контингентов русской армии и мужского населения Европейской России. Спб. 1875.

няў, якую падаў W. Wakar [1]), на абшарах усёй сучаснай Заходняй Беларусі перавагу мела польскае зямляўладаньне. Паказчык перавагі польскага зямляўладаньня W. Wakar выстаўляе як адзін з тых, па якіх ён праводзіць мяжу польскасьці на Літве і Беларусі. Нацыянальную прыналежнасьць зямляўласьнікаў выкарыстоўвае ў сваёй працы і Jan Cżekanowski [2]); ён-жа найбольш поўна скарыстаў для вызначэньня нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Беларусі статыстыку выбаршчыкаў у Земства. Але пяршынства ў скарыстаньні нацыянальнай статыстыкі выбаршчыкаў у Земства для ўстанаўленьня нацыянальнага складу ўсяго насельніцтва належыць Э. Ромэру [3]):

„Przewròt w poglądach polskich na stosunki narodowościowe na Litwie i Rusi wywołały dopiero obliczenia Romera". Гэтыя аблічэньні былі ў працы: Atlas Polski. W-wa i Kr. 1916.—дзе Ромэр зварочвае ўвагу на нац. склад выбаршчыкаў Земства, як падставу вызначэньня нац. складу ўсяго насельніцтва. У працы „Die Gesamtzahl der Polen. Wochenschrift für polnische interessen. Wien 1917. b. X" ён абапірае свае аблічэньні на тэй падставе „że odsetek Polaków, Białorusinów-katolików i Rusinów-katolików wśród przedstawicieli własności nieszlacheckiej równa się odsetkowi Polaków wśród ogółu ludności poszczególnych gubernji".

Сам Jan Czekanowski давёў мэтод даны Ромэрам да крайніх граніц яго ўжываньня. На падставе нацыянальнага складу прадстаўнікоў дробнай уласнасьці на выбарах у Земства, J. Czekanowski вылічыў процант польскага насельніцтва. Па гэтых вылічэньнях толькі ў адным Наваградзкім павеце з усіх паветаў Заходняй Беларусі палякі нібы складаюць абсолютную большасьць насельніцтва. Адносную большасьць палякі мелі, згодна J. Czekanowsk'аму, толькі ў Дзісьненскім павеце, Лідзкім, Сьвянцянскім, Троцкім і Віленскім,—калі лічыць асобна такую групу, як беларусы-каталікі і праваслаўныя (беларусы), а калі скласьці гэтыя групы разам, дык палякі трацяць адносную большасьць і ў Лідзкім павеце. Такім чынам усе аблічэньні J. Czekanowsk'ага даюць падставы залічыць у польскую тэрыторыю толькі Віленскі, Троцкі і Сьвянцянскі паветы (калі адкінуць такія недарэчнасьці, як залічэньне ў лік польскіх Наваградзкага і Дзісьненскага паветаў, беларускі характар якіх сьцьвердзілі нават польскія перапісы 1919 і 1921 гадоў).

Jan Czekanowski ўважае, што яго аблічэньні маюць вялікую пэўнасьць [4]):

„Badanie nasze doprowadzają nas zatem do wniosku, ze wyniki naszych obliczeń pośrednich, na podstawie przedstawicieli drobnej własności, osiągają niedostępny poprzednim badaniom stopień dokładności".

Угледзеўшы, што процант польскага насельніцтва па самых багатых разьлічэньнях ня надта вялікі ў паветах Заходняй Беларусі, Jan Czekanowski залічае да палякоў усіх беларусаў-каталікоў, усіх так званых „расійцаў неправаслаўных", бо: „ci „Rosjanie" nie tylko używają języka polskiego w kościele, ale też uważają się za polaków, utożsamiając polskość z katolicyzmem" [5]).

[1]) Włodzimierz Wakar. Rozwój terytorjalny narodowości polskiej. Część III. Statystyka narodowościowa kresów wschodnich. Kielce 1917. Вакар спасылаецца на Чыньскага (Гл. „Etnograficzno-Statystyczny Zarys...").

[2]) Jan Czekanowski. Stosunki narodowościowo-wyznaniowe na Litwie i Rusi. Lwów. 1918.

[3]) Jan Czekanowski „Stosunki", стар. 11—12. Курсыў мой. Г. Г. Э. Ромэр залічае такім спосабам усіх беларусаў-каталікоў у палякі.

[4]) „Stosunki"; стар. 30, стар. 24.

[5]) J. Czekanowcki налічыў такі процант у насельніцтве палякоў і беларусаў-каталікоў:

Такім спосабам і ў J. Czekanowsk'ага ствараецца польская большасьць і якраз там, дзе ёсьць большасьць каталікоў паводле рэлігіі межы Польшчы на ўсходзе зразумела будуць у такім разе ўсходнімі межамі каталіцызму.

Іншых пасрэдных крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва польскія дасьледчыкі ня прыцягвалі да вывучэньня нацыянальных адносін у Заходняй Беларусі. А між тым такія крыніцы і вельмі паважныя былі і захаплялі яны час, якраз блізкі да таго, за які польскія дасьледчыкі бралі веды аб нацыянальным складзе з іншых крыніц. Такою нескарыстанаю польскімі дасьледчыкамі крыніцаю зьяўляецца школьны перапіс 1911 году [1]). Перапіс ахапіў па Заходняй Беларусі ў абсолютнай лічбе 147645 вучняў або 3,2% ўсяго насельніцтва (супроць 0,14% насельніцтва—процант, які складалі прадстаўнікі дробнай зямельнай уласнасьці).

Школьны перапіс паказвае, што ў гарадох абсолютная, або адносная большасьць належала яўрэям, за выключэньнем Вялейскага, Лідзкага, Пружанскага, Сакольскага і Наваградзкага паветаў, дзе большасьць мелі беларусы, і Бельскага павету, дзе большасьць належала палякам, а таксама Берасьцейскага і Кобрынскага паветаў з расійскай большасьцю. Школьны перапіс 1911 году сьцьвярджае факт, што ў заходня-беларускіх гарадох сярод вучняў, а значыцца і сярод насельніцтва, ёсьць значныя беларускія масы.

У паселішчах негарадзкога тыпу беларусы мелі, згодна школьнага перапісу 1911 г., адносную большасьць у Беластоцкім і Берасьцейскім паветах, а абсолютную большасьць ува ўсіх іншых паветах Заходняй Беларусі, апрача Віленскага з польскай адноснай большасьцю і Троцкага з літоўскай адноснай большасьцю.

Пры разглядзе гарадзкіх і негарадзкіх паселішч разам, беларусы захоўваюць абсолютную або адносную большасьць ува ўсіх паветах Заходняй Беларусі, зноў-жа апрача Віленскага [2]) і Троцкага паветаў. З іншых нацыянальнасьцяй больш-менш значную вагу ў агульным насельніцтве маюць украінцы ў Берасьцейскім і Кобрынскім паветах [3]), ліцьвіны [4]) ў Сьвянцянскім і Троцкім паветах. Школьны перапіс 1911 г. зарэгістраваў і групу вучняў з мяшанаю моваю; найбольшы процант вучняў з мяшанаю моваю быў у 1911 годзе якраз у тых паве-

Паветы:	Палякі:	Белар.-катал.:	Паветы:	Палякі:	Белар.-катал..
Ашмяна	36,6	31,5	Бельск	10,2	46,8
Вільня	41,3	12,5	Берасьце . . .	16,1	9,6
Вялейка	29,5	32,9	Ваўкавыск . . .	27,5	40,2
Дзісна	48,2	18,1	Горадня . . .	32,9	14,6
Ліда	45,3	28,1	Кобрын	9,4	29,4
Сьвянцяны. . . .	39,3	22,7	Пружаны . . .	8,0	26,7
Трокі	47,6	3,7	Слонім	12,4	38,4
Браслаў	34,3	2,9	Саколка . . .	2,5	54,1
Беласток	13,0	31,7	Наваградак . .	56,1	0,9
			Пінск	33,8	—

Гэтыя процанты выведзены Czekanowskim з нацыянальнага складу 5336 выбаршчыкаў, або 0,14% усяго насельніцтва.

[1]) Однодневная перепись начальных школ в империи, произведенная 18 января 1911 г. Вып. VIII (10). Виленский учебный округ Ред. В. И. Покровского СПБ 1914 г. Гл. табліцу № 6.

[2]) Вілен. п. белар. 26,1%, паляк. 26,6%; Троцкі—белар. 10,3%, паляк. 26,0%; ліцьвіны—38,1%.

[3]) 32,6% і 25,9% украінцаў.

[4]) Троцкі п. 38,1%, Сьвянцянск. п. 17,9%.

тах, дзе ў 1919 і 1921 годзе па польскіх перапісах налічаны быў найбольшы лік тутэйшых, г. зн. у паўднёвых паветах: Берасьцейскім, Кобрынскім, Пінскім і Пружанскім.

Этнографічная мяжа Беларусі, калі-б яе правесьці па выніках школьнага перапісу 1911 г., прайшла-б на поўначы-захадзе і захадзе якраз па мяжы акадэм. Карскага, і толькі на поўдні дала-б значныя ўхіленьні, бо аддзяляе ў беларускую тэрыторыю значна большыя абшары, чым гэта павінна быць паводле акадэм. Карскага. У гэтых адносінах перапіс 1911 г. папераджае тыя вынікі, якія былі потым выяўлены польскімі перапісамі 1919 і 1921 г., і яшчэ раз сьцьвярджае нятрываласьць і памылковасьць паўднёвай мяжы Беларусі акад. Карскага.

Паўторных школьных перапісаў за царскія часы на абшарах Заходняй Беларусі ня было. Сучасная польская школьная статыстыка дае багатыя рэгулярныя веды, але яна як-бы пужаецца даваць веды аб нацыянальнай прыналежнасьці вучняў польскіх школ.

Веды аб нацыянальнай прыналежнасьці вучняў ёсьць толькі за адзін год—1920-21, і то толькі па Палескім і Беластоцкім ваяводствах, прычым даныя прыведзены без паказаньня вучняў асобна па гарадзкіх і асобна па негарадзкіх паселішчах. Выкарыстаем і гэтую (хаця і зусім няпоўную, пасрэдную крыніцу) [1]). Спаміж палескіх паветаў, згодна школьнай статыстыцы 1920-21 году адносная большасьць належыць беларусам: у Пружанскім, Пінскім, Лунінецкім і Берасьцейскім паветах; у Кобрынскім і Драгічынскім паветах яна належыць украінцам [2]). Палякі далёка не заўсёды дасягаюць сярод вучняў таго процанту, які яны маюць сярод насельніцтва па перапісу 1921 г. [3]). Асабліва рэзкая дыспропорцыя процанту палякоў сярод насельніцтва і сярод вучняў у паветах Драгічынскім і Кобрынскім, Пінскім і Пружанскім; тут процант палякоў сярод вучняў у 2-5-6 разоў менш, чым процант палякоў сярод насельніцтва згодна перапісу 1921 г. Процант беларусаў сярод вучняў менш, чым процант беларусаў у насельніцтве згодна статыстыкі 1921 году [4]), але не ў такой меры, як у палякоў; нормальна павінна было-б быць якраз наадварот, бо беларусы па шэрагу эканомічных прычын не аддаюць сваіх дзяцей у школу ў такой меры, як палякі. Ня лічачы нават факту бойкоту польскае школы беларусамі. У беларускіх паветах Беластоцкага ваяводства абсолютная большасьць належыць нібы палякам. Процант беларусаў сярод вучняў гэтага ваяводства робіцца больш-менш паважным толькі ў Горадзенскім і Бельскім паветах [5]); у Аўгустоўскім павеце вялікая доля сярод вучняў належыць „расійцам", магчыма, гэта таксама беларусы [6]).

Веды аб нацыянальным складзе вучняў пачатковых школ за 1924-25 і 1925-26 навучальныя гады па ваяводствах Заходняй Беларусі (не па паветах) паказваюць паступовае ўзрастаньне беларусаў сярод вучняў:

---

[1]) Гл. табліцу № 7. Няма ведаў па Ваўкавыскім пав.

[2]) У Косаўскім п. большасьць належыць паляком, але процант вучняў да ўсяго насельніцтва такі малы (0,8 %), што прыймаць пад увагу гэтую лічбу і гэты павет немагчыма.

[3]) Процант палякоў па перапісу 1921 г. і па школьнай статыстыцы 1920-21 г.; Берасьце—25,6 і 29,6; Драгічын—11,9 і 5,7; Кобрын—61,9 і 12,8; Косава—13,9 і 43,9; Лунінец 16,7 і 19,6; Пінск—15,4 і 2,7; Пружаны—38,0 і 18,9%.

[4]) Процант беларусаў у насельніцтве і сярод вучняў: Берасьце 46,7 і 31,4; Кобрын 26,4 і 20.1; Лунінец 70,2 і 45,7; Пінск 65,3 і 45,0, Пружаны 46,8 і 48,9 і г. д.

[5]) 28,5% і 15,3%.

[6]) 11,7% пры 0,9% расійцаў сярод насельніцтва Аўгустоўскага павету.

Лік вучняў у тысячах:

	Усіх вучняў		Палякі			Беларусы		
	1924-25	1925-26	1924-25	1925-26	+%	1924-25	1925-26	+%
Польшча . .	3.137.3	3.152.1	2.334.7	2.333.4	—	90.3	125.0	+ 38.4
Беластоцк. в-ва	127.7	147.8	97.2	112.7	+15.9	6.1	20.1	+229.5
Віленскае . .	83.3	91.2	59.9	55.4	— 7.6	17.2	27.7	+ 61.1
Навагрaдзкае .	71.9	83.4	33.5	35.4	+ 5.7	35.5	44.2	+ 24.6
Палескае . .	54.5	64.4	10.5	12.8	+21.8	31.4	32.6	+ 3.9

Беларусы ўзрастаюць у шмат разоў шыбчэй, чым палякі.

(Крыніцы: Rocznik Statystyki Rzeczypospolitej Polskiej—za R. 1925-26 і 1927).

Такая-ж законаўпарадкаванасьць заўважаецца і ў прыватных школах: (тыс чал.)

	Усіх вучняў		Палякі			Беларусы		
	1924-25	1925-26	1924-25	1925-26	+%	1924-25	1925-26	+%
Польшча . .	100.0	87.8	36.2	23.7	—34.5	1.5	1.7	+13.3%
Беластоцк. в-ва	7.6	7.1	0.2	0.3	+50%	—	—	—
Віленскае . .	13.3	12.2	2.5	2.0	—20%	1.3	1.7	+30.8
Навагрaдзкае .	4.7	3.1	0.1	0.1	—	0.1	—	—
Палескае . .	5.4	5.9	0.0	0.2	—	—	0.1	—

У 1920-21 г. у Беластоцкім в-ве было беларусаў сярод усіх вучняў толькі 3.0 тыс., у 1924-25 г. ужо 6.1 тыс. і ў 1925-26 г. 20.1 тыс. у Палескім в-ве ў 1920-21 г. толькі 6.3 тыс., далей 31.4 і 32,6 тыс. (Палякоў сярод вучняў 3.2 тыс., 10.5 і 12.8 тыс.—узрост слабейшы). Нацыянальная сьвядомасьць усё шырэй ахоплівае беларускае насельніцтва Заходняй Беларусі.

Пасрэднай крыніцай ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі зьяўляецца і статыстыка нацыянальнай прыналежнасьці паслоў польскага Сойму і статыстыка самих выбараў у першы Сойм. Хаця-б аналіз гэтае статыстыкі даў-бы спагадныя для беларусаў вынікі, бо ведама, што беларусам задалося правесьці значны лік паслоў Сойму,—аднак трэба адкінуць гэты шлях адразу: ён можа прывесьці да самых неспадзяваных вынікаў, ненавуковых вынікаў, бо па нацыянальным складзе малой групы, складзенай пад уплывам цэлага шэрагу розных прычын, ня можна меркаваць аб нацыянальным складзе вялікіх груп насельніцтва: гэтым быў-бы парушаны прынцып структурнай ідэнтычнасьці [1]), прынцып рэпрэзэнтатыўнасьці. У польскай літаратуры мы маем прыклады выкарыстаньня і гэтае крыніцы [2]) з спагаднымі для беларусаў вынікамі.

Да шэрагу пасрэдных крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва належыць наагул нацыянальная статыстыка розных груп насельніцтва, вылучаных па тэй ці іншай адзнацы. Да ліку груп, маючых у польскай урадовай статыстыцы вельмі добрыя матар'ялы аб нацыянальнай прыналежнасьці, трэба залічыць і ўсіх чыноўнікаў і служачых у польскай дзяржаве [3]). Ува ўсіх ваяводзтвах Заходняе Беларусі асноўны кадр чыноўнікаў у ваяводзкіх установах і старостваx, кадр вышэйшых і ніжэйшых поліцэйскіх, поліцэйскіх чыноўнікаў і адміністрацыі асьветы складаецца на 99% з палякоў; склад судзьдзяў, настаўніцкага пэрсоналу, вышэйшых чыноўнікаў дзяржаўнай га-

[1]) Гл. уступ.

[2]) Konstanty Srokowski. Sprawa narodowościowa na Kresach wschodnich. Kraków, 1924.

[3]) Маю на ўвазе выданьне Gł. Urz. Statystycznego „Funkcjonarjusze Państwowej służby. Wyniki spisu ze stycznia 1923 r." Warszawa 1925. Гл. табліцу № 8.

спадаркі і лясоў—зьяўляецца польскім звыш чым на 90 процантаў [1]). Хаця група ўрадаўцаў Заходняй Беларусі, якой нацыянальны склад тут пададзены, ахапляе значную колькасьць насельніцтва—20982 чал., г. зн. у 4 разы больш таго ліку прадстаўнікоў дробнай зямельнай уласьнасьці абраных у Земства ў 1910 г., на падставе нацыянальнага складу якіх Jan Czekanowski рабіў заключэньні аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі,—аднак відавочна, што гэтая група, як і іншыя, вылучаныя па якім-небудзь паказчыку, неідэнтычнаму па сваёй структуры агульнай нацыянальнай будове грамады, ня можа брацца пад увагу пры меркаваньні аб нацыянальным складзе. Конкрэта-ж, узятая зараз група сьведчыць больш аб тым ці іншым тыпе палітыкі дзяржавы ў адносінах да сваіх акраін, крэсаў, чымся аб нацыянальным складзе насельніцтва. Такі нацыянальны склад, які ёсьць зараз сярод урадаўцаў Заходняй Беларусі сьведчыць аб тыпе т. зв. імпэрыялістычных, цэнтралістычных дзяржаў, ён характарызуе адносіны такой дзяржавы да сваіх колёній, або інша-нацыянальных акраін. Падобны-ж нацыянальны склад урадаўцаў быў у Заходняй Беларусі і за часы старой Расіі; толькі месца палякоў займалі чыноўнікі расійцы [2]). У 1897 годзе, згодна перапісу, процант расійцаў сярод асоб занятых самастойна ў адміністрацыі, судзе, поліцыі, войску, набажэнстве, настаўніцкай дзейнасьці, чыгункі, пошце і тэлеграфу быў ува ўсіх паветах Заходняй Беларусі ў шмат разоў больш, чым процант расійцаў ува ўсім насельніцтве Заходняй Беларусі. Прычым па некаторых галінах заняткаў процант расійцаў (вялікаросаў) быў асабліва вялікі; гэткімі галінамі зьяўляліся якраз тыя, праз якія дзяржава найбольш пашырае свой уплыў: адміністрацыя, суды і поліцыя, войска, набажэнства, чыноўнікі пошты і тэлеграфу [3]). Паданыя факты сьведчаць не аб нацыянальным складзе карэннага насельніцтва, а аб тэй палітыцы, якой трымаецца ў адносінах Заходняй Беларусі сучасная Польшча і якой трымалася старая Расія. Об'ектыўныя сьведкі—статыстычныя лічбы—кажуць, што прынцыповай розьніцы тут няма: у абодвух выпадках статыстыка паказвае на асыміляцыйную палітыку дзяржавы, на імпэрыялістычна-колёнізацыйны тып яе.

Да пасрэдных крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі належыць яшчэ адна, у нашым разглядзе апошняя крыніца—нацыянальная статыстыка рэпатрыянтаў [4]). Хваля высяленства (рух бежанцаў, уцекачоў) з Заходняй Беларусі была, як вядома, надзвычайна моцнай: яна ахапіла ў свой час многія сотні тысяч заходня-беларускага насельніцтва [5]), дасягнуўшы па тэорэтычных

[1]) Толькі ў Палескім ваяводстве проц. палякоў сярод настаўніцкага пэрсоналу ніжэй—50,9%, ды зьмяншаецна проц. палякоў сярод ніжэйшых служачых дзярж. гаспадаркі і лясоў (у Палескім ваяводстве 39,8%, Наваградзкім 58,6, іншых звыш 80%).

[2]) Гл. табліцу № 8-а.

[3]) Зварочвае на сябе ўвагу пры параўнаньні табліц № 8 і № 8-а параўнаўча малы процант вялікаросаў сярод настаўніцтва ў 1897 г. і вялікі проц. палякоў сярод настаўніцтва ў 1924 г.

[4]) На выключную вартасьць нацыянальнай статыстыкі рэпатрыянтаў („нязьмерная цікавасьць" гэтай статыстыкі) зварочвае ўвагу польскіх дасьледчыкаў проф. Э. Ромэр у спэцыяльнай брошуры аб заганах польскай урадовай статыстыкі.

[5]) Дакладных вестак аб агульнай лічбе уцекачоў з Заходняй Беларусі няма; прыблізна можна вызначыць гэтую лічбу такім спосабам: насельніцтва сучаснай Зах. Беларусі, без Аўгустоўскага і Браслаўскага паветаў, было ў 1913 г. згодна вестак ЦСК 4869,1 тыс.; па тэй-жа тэрыторыі насельніцтва ў 1919 г. з дадаткам насельніцтва Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага пав. па перапісу 1921 г.—было 2958,0 тыс.; значыцца мінімальная колькасьць уцекачоў з Зах. Белар. навінна быць 1911,1 тыс. „Всероссийский С'езд беженцев из Белорусии", які адбыўся ў Маскве 15—21/VII-1918 г. (гл. Протоколы, постановления и материалы" гэтага зьезду, Москва 1918), на жаль, не заняўся хаця-б прыблізным высьвятленьнем ліку бежанцаў-уцекачоў.

вылічэньнях да 1900 тыс. чалавек, г. зн. да 1/3 ўсяго тагочаснага насельніцтва Заходняй Беларусі. Затое магутнай была і адваротная хваля—зварот уцекачоў з Заходняй Беларусі (рэпатрыянтаў) на сваю бацькаўшчыну. З 1918 году да канца рэпатрыяцыі да 1924 г. з усходу у Польшчу зьвярнулася 1.264,7 тыс. рэпатрыянтаў, з гэтага ліку 491,7 тыс. беларусаў і 122,7 тыс. „расійцаў", фактычна таксама беларусаў, а разам каля 614,4 тыс. чалавек [1]). Як выхад уцекачоў, так і іх зварот, адбываўся компактнымі масамі з вядомых тэрыторый. Таму магчыма па нацыянальным складзе рэпатрыянтаў, асеўшых у тых ці іншых паветах Заходняй Беларусі, меркаваць аб нацыянальным складзе гэтых паветаў, бо прынцып ідэнтычнасьці структуры, дзякуючы значнай масе рэпатрыянтаў і характару іх расьсяленьня, цалком захоўваецца.

На жаль, польская статыстыка рэпатрыянтаў не дае такіх дакладных вестак. Але яна падае агульную колькасьць рэпатрыянтаў, без падзелу на нацыянальныя групы, асеўшых у розных паветах Заходняй Беларусі, і агульную лічбу рэпатрыянтаў-беларусаў для ўсёй Польшчы. Лічачы, што рэпатрыянты-беларусы асядаюць, зразумела, амаль выключна толькі ў Заходняй Беларусі,—можна, адкінуўшы іх лік ад агульнай лічбы рэпатрыянтаў, асеўшых у Заходняй Беларусі, бачыць колькі-ж асела ў Заходняй Беларусі рэпатрыянтаў іншых нацыянальнасьцяй.

На жаль, нават і веды аб асяданьні рэпатрыянтаў па паветах ёсьць толькі за час з 1/VI 1921 г. да 1/VII 1922 г. [2]). За гэты час, праўда, прайшло каля паловы ўсіх польскіх репатрыянтаў [3]) і каля 4/5 усіх рэпатрыянтаў-беларусаў. У 4-х беларускіх ваяводзтвах—Беластоцкім, Віленскім, Навагрудзкім і Палескім—асела за гэты час 394,1 тыс. рэпатрыянтаў, наагул-жа ў Польшчу прайшло за гэты-ж час 399,5 тыс. беларусаў; вынік відавочны: рэпатрыянты іншых нацыянальнасьцяй, апрача беларускай, не асядалі ў больш-меньш значным ліку ў беларускіх ваяводзтвах; у тым-жа ўпэўнівае параўнаньне асяданьня рэпатрыянтаў па 4-х беларускіх ваяводзтвах і прыходу рэпатрыянтаў-беларусаў у Польшчу па асобных месяцах, два рады гэтых лічбаў увесь час ідуць роўнамерна [4]).

Калі-б лічыць нацыянальную структуру рэпатрыянтаў, якія аселі ў Заходняй Беларусі, ідэнтычнай з нацыянальнай структурай усяго насельніцтва Заходняй Беларусі, а гэта можна рабіць, бо адны толькі беларусы-рэпатрыянты складаюць да ўсяго насельніцтва Заходняй Беларусі 1/5—1/6 частку, а разам з „расійцамі" нават 1/4—1/5 частку, значыцца ўсе вымаганьні выбарачнай статыстыкі задаволены,—дык трэба зрабіць вынік аб пераважнасьці і нават выключнай пераважнасьці беларускай нацыянальнасьці спаміж іншых на значных абшарах Заходняй Беларусі. Гэты вынік зьяўляецца, бязумоўна, бясспрэчным для тых паветаў, у якіх асеўшыя рэпатрыянты складалі значную частку да ўсяго насельніцтва, быўшага тут ў 1921 годзе. Павятовы разгляд [5]) паказвае, што такім зьяўляюцца: большасьць паветаў Палесься (Пружанскі, Берасьцей-

[1]) Гл. таб. № 9, скоп'яваную з матар'ялаў Głównego Urzędu Emigracyjnego.

[2]) Гл. табліцу № 9-а, складзеную па крыніцах: „Miesięcznik Statystyczny", 1922, т. V, zeczyt 4 i 10.

[3]) Большасьць усіх рэпатрыянтаў прайшла да перапісу 1921 г.; большасьць паловы рэпатрыянтаў-„палякоў" прайшло нават да 1921 году (найбольш у 1919 г.).

[4]) Табліца № 9-в.

[5]) Гл. табліцу № 9-а, складзеную па тых-жа крыніцах, што і табліца № 9-в.

кі, Драгічынскі і Косаўскі), значная частка паветаў Беластоцкага ваяводства (Белавескі, Бельскі, Ваўкавыскі, Горадзенскі) і некалькі паветаў Навагрудзкага ваяводства (Баранавіцкі, Слонімскі, Лідзкі). У гэтых паветах лік рэпатрыянтаў блізка сярэдне да 25-30% усяго насельніцтва па перапісу 1921 г., а гэта такі процант выбаркі, што ўсе вымаганьні рэпрэзэнтатыўнасьці тут цалком выкананы. Гэтыя паветы зьяўляюцца бясспрэчна беларускімі, яны маюць бязумоўную беларускую большасьць.—Трэба адразу тут-жа адзначыць, што пасьля перапісу 1921 г. вярнулася ў Польшчу 310.964 рэпатрыянтаў-беларусаў і 8452 рэпатрыянтаў-расійцаў, а разам каля 320 тыс. Гэта не магло не зьмяніць таго нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Беларусі, які быў зарэгістраваны офіцыйным перапісам 1921 г.

Проф. dr Zofja Daszyńska-Golińska [1]) прызнае, аднак, што лік беларусаў-рэпатрыянтаў, якія вярнуліся на бацькаўшчыну да перапісу 1921 г., быў значна большы.

„Najcięższe straty poniosły powiaty Grodno, Słonim, Prużana i Kobryń. Powrót uchodźców z tych okolic był największy. Przez etapy Urzędu Emigracyjnego pszeszło od jesieni 1918 r. do chwili spisu w 1921 r. samych Białorusinów 511.117".

Z. Daszyńska-Golińska налічае прыблізна на 330,4 тыс. больш рэпатрыянтаў-беларусаў, чымся пададзеныя раней весткі [2]). Такім чынам з папраўкай проф. Daszyńskiej-Golińskiej лічба рэпатрыянтаў-беларусаў будзе агулам каля 800 тыс. [3]), а разам з „расійцамі" звыш 900 тысяч. Правільным здаецца і заключэньне цытаванага аўтара, што пад уплывам рэпатрыянтаў „całe okolice przyjmują nowy pod względem narodowym charakter" [4]).

Разгледжанымі крыніцамі абмяжоўваецца лік пасрэдных крыніц першага роду. Да пасрэдных крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва другога роду, г. зн. такіх крыніц, якія падаюць дакладную статыстыку насельніцтва па якім-небудзь іншым пасрэдным паказчыку, зьвязаным з нацыянальнай прыналежнасьцю, а не самы нацыянальны склад насельніцтва, ці яго часткі,—трэба залічыць першую крыніцу ў заходня-беларускіх умовах—статыстыку рэлігійнай прыналежнасьці, статыстыку веравызнаньня.

Да перапісу насельніцтва 1919 і 1921 г.г., польская крытыка нацыянальнай статыстыкі Заходняй Беларусі грунтавалася, галоўным чынам, на статыстыцы рэлігійнай прыналежнасьці. E. Czyński [5]) у сваёй першай працы аб нацыянальным складзе насельніцтва ў Заходняй Беларусі за 1887 г. залічыў у лік палякоў усіх каталікоў Заходняй Беларусі. Той-жа мэтод выкарастаў W. Wakar [6]), усе беларусы-каталікі залічаны ім палякамі. F. Rasiński [7]) залічае ў палякі ўсіх беларусаў-каталікоў толькі ў „бясспрэчна польскім абшары", якім ён прызнае Сакольскі, Бельскі і Беластоцкі паветы. E. Maliszewski [8]) залічае да па-

[1]) Zagadnienia polityki populacyjnej. Warszawa 1927, стар. 192. Разьбіўка мая Г. Г.

[2]) Табліца № 9; згодна табліцы да мамэнту перапісу 1921 г. зьвярнулася 180,7 тыс. беларусаў, згодна Z. Daszyńskiej-Golińskiej 511,1 тыс. за той-жа час,—розьніца 330,4 тыс.

[3]) Да перапісу 511,1 тыс. згодна Z. Daszyńskiej-Golińskiej плюс 311,0 тыс. пасьля перапісу 1921 г., разам 822,1 тыс., плюс „расійцаў" 122.7 тыс., разам 944,8 тыс.

[4]) „Zagadnienia", стар. 192. Памыляецца аднак аўтар ў адносінах Зах. Беларусі, нібы: „Ludność polska powraca w znacznie większej liczbie, niż białoruska i ruska" (стар. 192).

[5]) „Etnograficzno-Statystyczny zarys...".

[6]) „Rozwój terytorjalny...".

[7]) Faustyn Rasiński. Prace Statystyczne. IV. Polska etnograficzna Cz. I. Stan posiadania Warszawa 1915, стар. 86-ая.

[8]) „Białoruś w cyfrach i faktach. Piotrków 1918 г." і інш. працы.

лякоў толькі палову беларусаў-каталікоў. Праф. J. Czekanowski [1]) хаця і прызнае адсутнасьць выразнай тэндэнцыі разьвіцьця этнічных процэсаў у Заходняй Беларусі і Беларусі наагул, аднак лічыць што гэтыя процэсы ідуць у бок полёнізацыі беларусаў-каталікоў [2]):

„...proces polonizacji Białorusinów-katolików postępuje tak szybko naprzód, że już teraz pszeszło 80% podało się za polaków". На гэтай падставе Czekanowski залічае ўсіх беларусаў-каталікоў палякамі.

Проф. Э. Ромэр таксама згодзен лічыць беларусаў-каталікоў палякамі [3]):

„...istnieje ścisła bardzo korelacja między wyznaniem i narodowością. Katolicy są narodowości polskiej i litewskiej, prawosławni są narodowości białoruskiej i rosyjskiej. Katolicy białoruskiego pochodzenia przyznali się w znacznej mierze do narodowości polskiej".

Бліскі да яго погляду ў гэтым сэнсе і проф. Ludwik Krzywicki [4]).

Прызнаньне каталікоў і асабліва беларусаў-каталікоў за палякаў зьяўляецца як-бы непарушным падмуркам польскай нацыянальнай політыкі [5]), а як бачым, на жаль, і навукі.

Прызнаньне роўназначнасьці рэлігійнай і нацыянальнай прыналежнасьці і зьявіліся падставай вельмі пашыранага ў польскай літаратуры ўжываньня для вызначэньня нацыянальнага складу насельніцтва мэтоду пасрэдных крынц другога роду.

Прагледзім фактычныя матар'ялы. Рэлігійныя адносіны ў Заходняй Беларусі насілі і носяць вельмі ўстойлівую форму ў сэнсе колькаснага значэньня паасобных рэлігійных груп. Доля каталікоў сярод усяго насельніцтва з 1897 г. да 1909 г. узрасла зусім нязначна, праўдзівей, заставалася стацыянарнай: Віленшчына+1,7%, Горадзеншчына+1,5%, Меншчына—1,6% [6]). Абсолютны лік каталікоў зьменшыўся з 1914 да 1919 году на тэрыторыі Заходняй Беларусі на—10,3% [7]). Зьмены процанту каталікоў па перапісах 1919 і 1921 г. былі вельмі нязначнымі: процант увесь час трымаецца вельмі ўстойліва на адным узроўні [8]).

---

[1]) Prof. Dr. Jan Czekanowski. Wschodnie zagadnienia graniczne Polski. I. Stosunki etniczno-społeczne. Lwów. 1921.

[2]) „Wschodnie zagadnienia", стар. 60, стар. 50 (Czekanowski ўважае на перапіс 1919 г.). „Brak wyraźnej tendencji rozwojowej w przebiegu procesów etnicznych na terytorjum białoruskim, najlepiej odzwierciadla układ sił tego biednego i nieszczęśliwego kraju! Trudno przypuszczać by Białoruska Republika Sowiecka mogła tu wytworzyć poważniejszy ośrodek życia lubności tubylczej".

[3]) „Spis" стар. 8-я.

[4]) Ludwik Krzywicki. Rozbiór krytyzny wyników spisu. Miesięcznik Statystyczny, 1922, t. V, z. 6, стар. 22, 30 і інш.

[5]) Політычная, пераважна папулярна-політычная літаратура аб нацыяльных адносінах у Польшчы і Зах. Беларусі і аб польскай нацыянальнай політыцы надзвычайна багата па форме і падыходу аўтараў да трактоўкі пытаньня. Аднак сутнасьць, зьмест усёй гэтай літаратуры самых розных політычных кірункаў зьяўляецца аднолькавым: бязумоўнае прызнаньне тоесамасьці каталікоў і палякоў, рэлігійнай і нацыянальнай прыналежнасьці. Гл. напрыклад, тыповую ў гэтым сэнсе брошуру: „Zygmunt Dreszer „Sprawa mniej szości narodowych w Polsce a program państwowy demokracji. Warszawa. 1925". Аўтар заве беларусаў толькі нязначнай нацыянальнай меншасьцю, лічыць нізкай іх нацыянальную сьвядомасьць, прызнае адсутнасьць у іх гістарычных традыцый, малую роль беларускіх зямель у жыцьці польскай рэспублікі і „лёгкасьць асыміляцыі беларусаў:"

„gdyż mowy nie było o tem, by lud białoruski buntował się przeciw panom. Wprost przeciwnie. Białorusin chętnie przyjmował i przyjmuje kulturę polską i staje się polakiem. Uwaga ta tyczy się w szczególności Białorusinów-katolików, gdy z drugiej strony Białorusini-prawosławni za czasów rządów rosyjskich dość łatwo asymilowali się z Rosjanami" (41) Тыпам беларусаў ёсць [illegible] усы—цяпер багатыры, якія памруць за Польшчу. Сама-ж Заходняя Беларусь—гэта „Польскі Сыбір" і г. д. і г. д.

[6]) Rocznik Polski. E. Romer і Ig. Weinfeld., стар. 15-ая.

[7]) Studnicki Wł. Zarzys statystyczno-ekonomiczny Ziem Północno-Wschodnich. Wilno. 1922.

[8]) Гл. табліцу № 10.

Некаторыя зьмены ў процанце каталікоў адбыліся ў пасьляваенны час: прасачыць іх можна параўнаньнем перапісу 1897 г. з 1919 годам, бо вынікі перапісу 1909 г., як бачылі раней, вельмі блізкія да даных перапісу 1897 г. Зьмены ў процанце каталікоў зачапілі толькі некаторыя паветы Заходняй Беларусі. Паветамі з найбольш устойлівым процантам каталікоў па перапісах 1897 і 1919 г.г. былі: Ашмянскі, Вялейскі, Дзісьненскі, Лідзкі, Сьвянцянскі, Троцкі, Браслаўскі [1]), г. зн. паветы з максымальным процантам каталікоў, паветы пераважна паўночнай часткі Заходняй Беларусі. Да гэтай-жа групы належаць паветы, неахопленыя перапісам 1919 г., але таксама з максымальным процантам каталікоў у 1897 годзе; процант каталікоў у іх з перапісу 1897 г. да перапісу 1921 г. рэзка таксама не зьмяніўся; гэта паветы—Сакольскі, Бельскі, Беластоцкі, Аўгустоўскі, прычым апошнія тры паветы з значна большым процантам зьмены, чым першыя. З гэтай групай паветаў ідзе і Віленскі павет, з прыблізна паўтараразовым павялічэньнем процанту каталікоў. Найбольш-жа рэзкія зьмены ў рэлігіных адносінах адбыліся ў паветах з мінімальным процантам каталікоў у 1897 годзе: гэта паветы былой Горадзеншчыны—Берасьцейскі, Ваўкавыскі, Кобрынскі, Горадзенскі, Пружанскі, Слонімскі і павет былой Менскай губэрні Наваградзкі [2]). У гэтых паветах заўважаецца бязумоўнае павялічэньне процанту каталікоў у насельніцтве, хаця адноснае значэньне каталікоў, апрача Ваўкавыскага і Горадзенскага паветаў, дзе каля 50% каталікоў, у гэтых паветах невялікае (нідзе ня вышэй 1/5 насельніцтва). Абсолютная лічба павялічэньня каталікоў у гэтых паветах вельмі нязначна—22,6 тысяч (з 179,1 тыс. у 1897 г. да 201,7 тысяч 1919 г.).

Даволі ўстойлівым зьяўляўся процант беларусаў-каталікоў спаміж усіх каталікоў у 1897 і 1909 г.г.; выключэньне складалі толькі паветы, дзе процант беларусаў быў наагул малы па перапісу 1897 году [3]), у 1909 годзе процант беларусаў-каталікоў спаміж усіх каталікоў Заходняй Беларусі [4]) ня зьменшыўся параўнальна з перапісам 1897 г., ён зьяўляецца вельмі ўстойлівым. У паўднёвых паветах і часткаю ў паўднёва-заходніх (Беластоцкі, Бельскі, Берасьцейскі, Кобрынскі), дзе ўсе пазьнейшыя статыстычныя весткі сьведчаць аб беларускай большасьці ў насельніцтве, процант беларусаў-каталікоў спаміж усіх каталікоў павялічыўся. У абсолютных лічбах беларусаў-каталікоў налічвалася ў Заходняй Беларусі па перапісу 1897 г. 809,3 тыс. чалавек, у 1909 г. 1147,9 тыс. Процант беларусаў-каталікоў ува ўсім насельніцтве быў у 1909 г. па некаторых паветах вельмі значны [5]), і якраз у найбольш заходніх паветах, найбольш спрэчных у адносінах іхнацыянальнай прыналежнасьці зараз; па ведах 1909 г. гэтыя паветы носяць беларускі характар, значна больш беларускі, чым ён быў згодна перапісу 1897 г.

---

[1]) Да гэтае групы належыць і Пінскі павет, але процант каталікоў у ім зусім нязначны (4, 6 і 4,4%).

[2]) Процант каталікоў у гэтых пав. зьмяніўся так: Берасьцейскі—6,3—11,1; Ваўкавыскі 29, 2—50,9; Горадзенскі 27,2—44,6; Кобрынскі 2,8—4,4; Пружанскі 7,8—13,7: Слонімскі 10,3—20,1; Наваградзкі 11,8—17,8. Гл. табліцу № 10.

[3]) Троцкі, Віленскі, Беластоцкі, Бельскі, Берасьцейскі, Кобрынскі, Браслаўскі, Аўгустоўскі (зьмены ідуць у бок памяншэньня беларусаў-каталікоў).

[4]) Калі ня лічыць прыгранічных паветаў: Нова-Аляксандраўскага, Віленскага, Троцкага, Аўгустоўскага, Беластоцкага, Бельскага-Берасьцейскага, дык у Зах. Беларусі % беларусаў-каталікоў у 1897 г. спаміж усіх каталікоў 79.1 (617,059 чал. з 779,906) а без Сьвянцянскага п. 85,5% (551,263 чал. з 645,476).

[5]) Сакольскі—70%, Лідзкі—58%, Ашмянскі—52%, Сьвянцянскі—39%, Беластоцкі—31%, Бельскі—30%, Ваўкавыскі—33%.

І толькі польскі перапіс—1919 г. прыносіць поўную неспадзяванку ў вызначэньні процанту беларусаў-каталікоў.

Абсолютны лік беларусаў-каталікоў катастрофічна зьнізіўся. Па паветах, ахопленых перапісам 1919 г., было налічана толькі 66,5 тыс. беларусаў-каталікоў [1]) супроць 809,3 тыс. у 1897 г. 1147,9 тыс. у 1909 г. Адносна ліку беларусаў і тутэйшых па перапісу 1919 г. процант беларусаў-каталікоў складаў у 1919 г. зусім мізэрную лічбу 7,3%, супроць прыблізна 80,85% ліку беларусаў-каталікоў да ўсіх каталікоў Заходняй Беларусі па перапісу 1897 г. і 1909 г. г.

Пры разглядзе паасобных паветаў катастрофічнае зьніканьне беларусаў-каталікоў у ліку ўсіх каталікоў вызначаецца яшчэ больш выразна: зьмяншэньне колёсальнае, у многія дзесяткі, па некаторых паветах нават у сотні разоў!?

КРЫТЫКА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СТАТЫСТЫКІ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Разгляд крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі, крыніц пасрэдных ведаў і крыніц ведаў непасрэдных, больш-менш скончаны. У гэты разгляд трапілі ўсе галоўныя крыніцы, спатканыя аўтарам у літаратуры. Калі зрабіць параўнаньне ведаў аб нацыянальным складзе па розных крыніцах, дык ня можна не заўважыць вельмі вялікай розьніцы паказаньняў аб нацыянальным складзе па розных крыніцах. Рабіць мэханічнае параўнаньне ведаў розных крыніц было-б не да рэчы. Спачатку трэба зрабіць крытычны агляд саміх крыніц, надаць большую, ці меншую адносную вагу розным крыніцам, і толькі тады рабіць абагуленьне.

Крытычны агляд будзем рабіць згодна тэй схэме, ці тэй сыстэме крытыкі нацыянальнай статыстыкі, якая была падана раней, г. зн. 1) апрыорны мэтод аналізу ўмоў і вынікаў перапісаў, 2) мэтод крытыкі па пасрэдных крыніцах, 3) хронолёгічны аналіз зьмен, 4) хоролёгічны аналіз зьмен і разьмяшчэньня паказчыкаў (прасторава-геаграфічны мэтод), 5) мэтод этнографічнай экспэртызы.

Зразумела, што паданую схэму мэтодаў крытыкі нацыянальнай статыстыкі можна было-б дапасаваць усю цалком да кожнай крыніцы ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва; але гэта перагрузіла-б працу. Таму не да кожнай крыніцы будзем дастасоўваць усю гэтую схэму мэтодаў крытыкі. Да некаторых крыніц прыдзецца дастасаваць толькі некаторыя мэтоды. І перш-на-перш адразу трэба адлучыць, як няроўнацэнныя, крыніцы непасрэдныя ад крыніц пасрэдных [2]). Галоўная ўвага будзе аддана крытыцы крыніц непасрэдных. Самі пасрэдныя крыніцы зьяўляюцца ня больш як матар'ялам для крытыкі непасрэдных крыніц (для „мэтоду крытыкі па пасрэдных крыніцах").

Пасрэдныя крыніцы падзелены былі на дзьве групы: пасрэдныя крыніцы першага роду—гэта ёсьць тыя крыніцы, якія даюць веды нацыянальнага складу не ўсяго насельніцтва, а толькі тэй ці іншай часткі яго, вылучанай па вядомым паказчыку, — і пасрэдныя крыніцы другога роду, або тыя крыніцы, якія даюць не непасрэдныя веды аб нацыянальным складзе ўсяго насельніцтва, ці паасобных частак яго, а толькі веды аб структуры ўсяго насельніцтва па якой-небудзь іншай адзнацы, зьвязанай з нацыянальнай прыналежнасьцю больш ці менш цесна.

---

[1]) Табліца № 10. J. Czekanowski налічыў 1 1/3 мільён усіх беларусаў-каталікоў („Stosunki", стар. 41, у нямец. тэксьце стар. 96).

[2]) Аб гэтым было ўжо ў уступе.

У залежнасьці ад такога падзелу фокусным крытычнымі вымаганьнямі ад тэй і другой групы пасрэдных крыніц будуць розныя вымаганьні. Для пасрэдных крыніц першага роду будуць мець месца ўсе вымаганьні выбарачнай статыстыкі, бо самі гэтыя крыніцы ёсьць як-бы рознавіднасьць выбарачнай статыстыкі: галоўнае вымаганьне—рэпрэзэнтатыўнасьць групы; яна магчыма пры найбольшым набліжэньні структуры (будовы) групы да структуры ўсяго насельніцтва (прынцып ідэнтычнасьці структуры). Такое набліжэньне залежыць ад велічыні групы і ад захаваньня мэханічнасьці пры складаньні групы.

Для пасрэдных крыніц другога роду фокусным крытычным вымаганьнем будзе выбар такога паказчыка, які быў-бы найбольш цесна зьвязаны з нацыянальнай прыналежнасьцю. Надзейнасьць ведаў нацыянальнай статыстыкі па пасрэдных крыніцах другога роду будзе залежаць ад блізкасьці сувязі абранага паказчыка з паказчыкамі нацыянальнай прыналежнасьці, ад коэфіцыенту карэляцыі між імі.

Пераходзячы з погляду гэтых фокусных вымаганьняў да ацэнкі ведаў аб нацыянальным складзе па разгледжаных тут пасрэдных крыніцах[1]), трэба адразу адкінуць, як мала вартыя,—нацыянальную статыстыку ўрадаўцаў, зямляўласьнікаў і прадстаўнікоў у Земства. Першыя дзьве крыніцы таму, што не захоўваецца ні ў якай меры прынцып мэханічнасьці, бо абедзьве групы складзены вельмі аднабока ў соцыяльным (а разам і нацыянальным) сэнсе; усе тры крыніцы вельмі мізэрныя па сваёй абсолютнай велічыні, каб больш-менш здаволіць прынцып рэпрэзэнтатыўнасьці; даволі сказаць, што лічба прадстаўнікоў у Земства, на падставе нацыянальнага складу якіх J. Czekanowski рабіў меркаваньні аб нацыянальным складзе ўсяго насельніцтва Заходняй Беларусі, раўнялася 0,14% усяго насельніцтва. Не дарма нават у польскай літаратуры спроба выкарыстаць гэтыя крыніцы спаткала жорсткую крытыку з боку некаторых дасьледчыкаў. Напрыклад, E. Maliszewski[2]) так ацэньвае працы проф. Э. Ромэра і Я. Чэканоўскага, дзе гэтыя аўтары хацелі ўжыць нацыянальную статыстыку прадстаўнікоў у Земства для вылічэньня нацыянальнага складу ўсяго насельніцтва[3]).

„Niestety, wszystkie te obliczenia prof. Romera w zakresie sił i zasobów polskości na Litwie i Rusi uznać musimy za zupełnie bezwartościowe", Ацэнка працы Чэканоўскага яшчэ больш рэзкая[3]): „Ogółem na Litwie i Rusi znalazł prof. Czekanowski olbrzymią wprost liczbę 6½ miljona Polaków, z tego 3½ miljona na Litwie i Białorusi".

Малішэўскі падае параўнаньні процанту каталікоў і палякоў у аблічэньнях Чэканоўскага:

Паветы:	% палякоў:	% каталікоў:
Чэрыкаўскі . . .	22,0	1,8
Аршанскі	39,6	4,1
Полацкі	32,7	10,5
Лепельскі	61,8	8,7
Наваградзкі . . .	56,1	11,2
Слуцкі	46.2	10,6
Пінскі.	33,8	4,5

Падаўшы гэтае параўнаньне Малішэўскі піша:

„Sądzimy, że podane powyżej (параўнаньні Г.Г.) aż nadto dostatecznie

[1]) Нацыянальная статыстыка зямляўласьнікаў і зямляўладаньня, нацыянальны склад прадстаўнікоў у Земства, поўны школьны перапіс 1911 г., частковыя веды школьнай статыстыкі 1920-21 г., нацыянальны склад урадаўцаў Зах. Беларусі за 1924 і 1897 г., нацыянальны склад рэпатрыянтаў—уцекачоў Зах. Беларусі за 1918-1924 г.г.

[2]) Białoruś w cyfrach i faktach.

[3]) Там-жа, стар. 8.

charakteryzują jego (J. Czekanowskiego. Г. Г.) metodę. Jeśli wogóle zatrzymaliśmy się dłużej nad tą książką („Stosunki narodowościowo-wyznaniowe na Litwie i Rusi". Г. Г.), która bezwarunkowo powinna być jak najszybciej wycofana z obiegu księgarskiego, to uczyniliśmy to jedynie ze względu na stanowisko autora w świecie naukowym, oraz z obawy, że ten oczywisty, jaskrawy błąd w obliczaniu ilości Polaków na Litwie i Rusi szerzyć się będzie dalej, budząc złudne, na niczem nieoparte widoki i nadzieje" [1]).

Значную вартасьць з погляду рэпрэзэнтацыйнасьці мае нацыянальная статыстыка вучняў пачатковых школ, асабліва сабраная спэцыяльным школьным перапісам 1911 г. Школьная статыстыка ў 1920/21 г., сабраная ня шляхам перапісу і толькі з часткі Заходняй Беларусі, мае значна меншую вартасьць. Але і школьныя перапісы рэпрэзэнтуюць невялікую параўнаўча частку насельніцтва (у 1911 г. напрыкл. 3,2% насельніцтва Заходняй Беларусі). Сама школьная група насельніцтва не пазбаўлена вядомай аднабокасьці ў сваім складзе, асабліва ў краінах з нацыянальным прыгнечаньнем, з рознымі па культурным узроўні групамі насельніцтва, з рознай ахопленасьцю гэтых груп школьным навучаньнем, з магчымасьцю хатняга, або патайнага навучаньня і г. д. Прынцып мэханічнасьці адбору, прынцып рэпрэзэнтацыйнасьці не цалком захоўваецца і пры школьнай статыстыцы. Аднак гэта ёсьць адна з вельмі паважных пасрэдных крыніц.

Але самай паважнай з усіх пасрэдных крыніц зьяўляецца нацыянальная статыстыка рэпатрыянтаў—уцекачоў. Абсолютны лік рэпатрыянтаў Заходняй Беларусі дужа вялікі—600-900 тыс. чал. або 1/5-1/4 часткa ўсяго насельніцтва Заходняй Беларусі; вымаганьні выбарачнай статыстыкі (рэпрэзэнтацыйнасьць, велічыня груп, мэханічнасьць складу груп) тут захована цалком.

У далейшым з пасрэдных крыніц першага роду будзе выкарыстоўвацца толькі нацыянальная статыстыка вучняў паводле перапісу 1911 г. і нацыянальны склад рэпатрыянтаў 1918-1926 г. г.

З пасрэдных крыніц другога роду найбольшае значэньне мае статыстыка рэлігійнай прыналежнасьці. Аднак выкарыстаць яе для вызначэньня нацыянальнай прыналежнасьці ў умовах Заходняй Беларусі абсолютна немагчыма, бо няма цеснай карэляцыі між нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасьцю: нельга казаць, як гэта робяць некаторыя польскія аўтары, што ўсе каталікі Заходняй Беларусі зьяўляюцца палякамі, у Заходняй Беларусі вельмі значныя групы насельніцтва належаць да беларусаў-каталікоў, ня згубіўшых сваёй беларускай нацыянальнасьці; гэты факт сьцьвярджаецца ня толькі перапісам 1897 году, які налічыў у Заходняй Беларусі звыш 800 тыс. беларусаў-каталікоў, але і перадваеннай статыстычнай крыніцай 1909 г., згодна якой у Заходняй Беларусі жыве каля 1.150 тыс. беларусаў-каталікоў. Ад прызнаньня фактаў, што Заходняя Беларусь, асабліва яе паўночна-заходняя—і заходняя часткі, населены беларусамі-каталікамі не адмаўляюцца і многія з польскіх паважных крыніц і крытыкаў. Adam Zakrzewski [2]) на самым захадзе Заходняй Беларусі—у Аўгустоўскім павеце, толькі ў 5-ці валасьцёх налічвае каля 26 тыс. бела-

[1]) Разьбіўка мая. Г. Г.

[2]) У зборнай працы: Kempner. Dzieje gospodarcze Polski porozbiorowej...

русаў-каталікоў, з іх абсолютнаю большасьцю ў складзе насельніцтва[1]) перад самаю вайною, у 1913 г. A. Zakrzewski сваю навуковую сумленнасьць падкрэсьлівае ня толькі гэтым фактам, але і простым адмаўленьнем ад выкарыстаньня рэлігійнай статыстыкі для вызначэньня нацыянальнай прыналежнасьці і розных папраўак у нац. статыстыцы[2]): „Jaką kolwiek jest wartość cyfr, wyżej przytoczonych (Аб Зах. Бел. Г. Г.), nie możemy jednak, jak to czynią niektórzy autorowie, przerabiać ich i poprawiać na mocy całkiem dowolnych przypuszczeń, od scisłości naukowej dalekich".

Konstanty Srokowski[3]), ня гледзячы на ўсю няпрыхільнасьць да беларусаў і беларускай крытыкі нацыянальнай статыстыкі[4]), усё-ж ня можа ня прызнаць, што[5]):

„Tak więc wyniki spisu okazują się sprzecznemi z dwoma notorycznemi faktami: 1) że istnieją Białorusini katolicy, których spis w ogólnych sumach nie wykazał wcale, 2) że nie istnieją Polacy prawosławni, których mimo to spis wykazał w stosunku 22% Polaków".

На падставе гэтых сваіх меркаваньняў, ён уносіць папраўку ў афіцыйную польскую статыстыку: гэтая статыстыка налічала ў 3-х беларускіх ваяводзтвах Польшчы па перапісу 1921 г. толькі 1.001.879 беларусаў. K. Srokowski павялічвае гэтую лічбу да 1.500 тыс. у 3-х беларускіх ваяводзтвах і да 1.600 тыс. ува ўсёй Польшчы, уключаючы сюды 229.849 чал. палякоў-праваслаўных, якіх ён лічыць беларусамі, 100 тыс. беларусаў прыкідае на Беластоцкае ваяводзтва і іншыя мясьціны Польшчы і рэшту 268.272 відавочна лічыць за беларусаў-каталікоў.

Папраўкі K. Srokowsk'ага былі адзінымі ў польскай літаратуры, карыснымі для беларусаў, (як мінімальныя, але, бясспрэчна, патрэбныя з погляду на відавочную недакладнасьць польскай афіцыйнай статыстыкі),—папраўкамі ў ведах самих польскіх дасьледчыкаў і крытыкаў. Папраўкі былі прызнаны некаторымі другімі аўтарамі, ня толькі ў Польшчы, але і за межамі. Так Leon Wasilewski, падаўшы лічбу беларусаў па афіцыйнай статыстыцы: піша[6]): „Ale p. Srokowski dowodzi, że liczby te są zbyt niskie i że należy je podwyższyć do 1.600.000 w Rzeczypospolitej. Jstotnie, skutkiem zaliczenia zbyt dużej liczby Białorusinów-katolików do rubryki polskiej, co nie ulega wątpliwosci, ogólna suma ludności białoruskiej ulega zmniejszeniu. To też można by przyjąć cyfry p. Srokowskiego za odpowiadające rzeczywistości".

Так сьледам за K. Srokowskim лічбу беларусаў у 1.600 тыс. прызналі і некаторыя з нямецкіх дасьледчыкаў[7]).

Нават такія прыхільнікі залічэньня ў палякі ўсіх каталікоў, як E. Maliszewski, які спагадліва крытыкуе працу W. Wakara[8]), дзе ўсе беларусы-каталікі залічаны палякамі, ня можа не згадзіцца[9]), што:

„Nie jest to metoda całkiem pewna, ponieważ nie ulega wątpliwości, że dość liczne grupy Białorusinów-katolików... nie mają w sobie bynajmniej poczucia narodowego polskiego". E. Maliszewski сьцьвярджае факт, што[10]): „Białorusini zamieszkują głównie powiaty: Oszmiański, Wi-

[1]) Там-жа, стар. 7. Усяго беларусаў-каталікоў у 1913 годзе ў Аўгустоўскім павеце мінімальна 35 тысяч.
[2]) „Dzieje gospodarcze"... стар. 53.
[3]) Sprawa narodowościowa na Kresach wschodnich.
[4]) Аб беларускай крытыцы K. Srokowski піша: „O danych, przytaczanych przez badaczy białoruskich, niema wogóle co mówić" (стар. 5).
[5]) Sprawa narodowościowa, стар. 6.
[6]) Leon Wasilewski. Litwa i Białoruś. W. Kr. 1925., стар. 248-ая.
[7]) Dr. C. Poralla. Polen. Breslau. 1927. Стар. 11-ая.
[8]) „Rozwój terytorjalny"...
[9]) Białoruś w cyfrach i faktach, стар. 10.
[10]) Там-жа, стар. 16. Разьбіўка мая. Г. Г.

lejski i Dziśnieński, ale język ich usłyszeć można w chatach wiejskich, również we wszystkich pozostałych powiatach gubernji, nie wyłączając pow. Trockiego".

E. Maliszewski лічыць, што Заходняя Беларусь ёсьць [1]): „Kraj polsko-bialoruski... o podkładzie ludowym naogół białoruskim... z całkowitą przewagą kulturalną żywiołu polskiego"...

Тая-ж думка аб адноснай меншасьці палякоў у Заходняй Беларусі і толькі іхняй значнай культурнай і гаспадарчай моцы E. Maliszewskim выяўляецца і ў іншай працы [2]):

„A więc przedewszystkiem: Polacy naròwni z Bialorusinami, Litwinami i in. stanowią na Liłwie i Rusi rdzenny żywioł miejscowy, gorujący jednak przeważnie nad otoczeniem tradycyami, intelegencyą i zamożnością. Polacy nie myślą tam o panowaniu, chcą jednak mieć równe z innymi prawo do życia".

Аднак, прызнаньне бязумоўнага беларускага асноўнага характару насельніцтва Заходняй Беларусі не перашкаджае Малішэўскаму залічыць палову беларусаў-каталікоў у палякі. Такая непасьлядоўнасьць была адзначана польскай крытыкай. Так F. Rostafiński [3]) піша:

„Przytaczają nam przykłady, jak administratorowie rządcowctw przerabiali w swych kancelarjach wszystkie wykazy spisu: boję się czy przeróbka E. Maliszewskigo nie posiada tejże cechy roboty gabinetowej".

Пакуль ня будзе корэктыў на мейсцы „musimy zaniechać wszelkich przeròbek statystyki rządowej sposobem gabinetowym".

Але і сам аўтар адступае ад сваіх меркаваньняў—прызнае паветы Сакольскі, Бельскі і Беластоцкі „за бясспрэчна польскі абшар, а ўсіх яго каталікоў за палякоў" [4]).

Што такое беларусы-каталікі на поўначы-захадзе Заходняй Беларусі паказвае, як было ўжо зазначана раней, проф. W. Staniewicz. Гэта—насельніцтва, якое ўжывае ў хаце, між сябе сваю—беларускую, простую, хатнюю мову, а ў гміне, у касьцёле, на людзёх, пераходзіць на ламаную мешаніну беларускай і польскай мовы. У этнографічным сэнсе гэта бясспрэчна беларусы; можа быць, што нацыянальная сьвядомасьць гэтых людзей з „простай" мовай яшчэ не выкрышталізавалася, можа нават часамі яна пад уплывам палітычных і іншых фактараў можа быць нязьвязанай з этнографічнай асновай. Але этнографічны грунт ня можа зьнікнуць у кароткі час: процэс асыміляцыі можа скончыцца вельмі няскора (прыклад чаму — беспасьпяховасьць асыміляцыі беларусаў расійцамі на ўсходзе Беларусі, ня гледзячы на паўтаравекавую даўнасьць).

Такім чынам найбольш важная з пасрэдных крыніц другога роду—статыстыка рэлігійнай прыналежнасьці—ня можа быць выкарыстана для вызначэньня нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Беларусі: ня ўсе каталікі зьяўляюцца палякамі, каля 80% каталікоў Заходняй Беларусі былі ў 1909 годзе беларусамі-каталікамі, у 1897 годзе з усіх каталікоў у Заходняй Беларусі належала да беларусаў-каталікоў таксама каля 80—85% [5]). Але для крытыкі нацыянальнай статыстыкі веды гэтых пасрэдных крыніц вельмі карысны, асабліва ў комбінацыі з нацыянальнаю адзнакаю.

Абагульваючы ўсе крытычныя заўвагі аб пасрэдных крыніцах першага і другога роду, трэба лічыць больш верагоднымі крыніцамі

[1]) Białoruś w cyfrach i faktach, стар. 19 і 11.
[2]) Polacy i polskość na Litwie i Rusi. Wyd. II. Warszawa. 1916, стар. 36.
[3]) Prace statystyczne.... стар. 84-ая.
[4]) Там-жа, стар. 86.
[5]) 79,1% і 85,5%, гл. заўвагу на ст. 29.

нацыянальную статыстыку рэпатрыянтаў і вучняў па школьным перапісу 1911 г. З пасрэдных крыніц другога роду заўважаем толькі весткі аб рэлігійна-нацыянальнай прыналежнасьці за 1897 і 1909 г. г. (беларусы-каталікі).

Пераходзячы да крытычнага агляду непасрэдных крыніц, трэба ў першую чаргу адабраць тыя з іх, якія не патрабуюць поўнага разгляду па ўсёй схэме крытыкі нацыянальнай статыстыкі. Такімі зьяўляюцца перш-на-перш няпоўныя статыстычныя перапісы (у тэрыторыяльным сэнсе) і этнографічныя дасьледваньні.

Этнографічныя дасьледваньні будзем лічыць найбольш пэўнымі крыніцамі. У адносінах устанаўленьня паўночна-заходніх і заходніх меж Заходняй Беларусі такою крыніцаю трэба лічыць сынтэтычную працу акадэміка Карскага. У адносінах паўднёва-заходніх і паўднёвых меж Заходняй Беларусі, нятрываласьць устанаўленьня якіх Карскім была сьцьверджана фактамі ўсіх пазьнейшых крыніц нацыянальнай статыстыкі,—трэба на захадзе лічыць мяжу згодна дасьледваньняў Людвіка Чаркоўскага; паўднёвую мяжу Заходняй Беларусі па існуючых этнографічных дасьледваньнях устанавіць немагчыма; яе будзем шукаць па іншых крыніцах [1]).

Нямецкія перапісы 1916—18 г. г. былі праведзены ў выключных умовах вайскова-окупанскага рэжыму і часу. Значная частка насельніцтва ўцякла на ўсход, пакінуўшы старую тэрыторыю. Магчыма, што пакідалі бацькаўшчыну найбольш беларусы і праваслаўныя, а заставаліся на месцы найбольш палякі і каталікі; аб гэтым ёсьць сьведчаньні ў польскай літаратуры; напрыклад St. Podwiński [2]) аблічае, што з 1909 году да 1919 г. ня стала на месцы ў Ваўкавыскім павеце 63.037 чал., з якога ліку на праваслаўных падае 53.378, „co stanowi 84.7% do ogólnej liczby nieobecnych w powiecie", тады як праваслаўных у насельніцтве было толькі каля $^2/_3$. Аб пераважным выезьдзе праваслаўных і „расійцаў" піша I. E. Maliszewski [3]). Аднак гэта толькі паасобныя факты; вельмі рэзкай розьніцы ў уцяканьні на ўсход паміж беларусаў і палякоў быць не магло [4]). Таму хаця на павялічэньне лічбы палякоў па нямецкім перапісу 1916 г. і магла ўплываць большая адсутнасьць на месцы беларусаў, чым палякоў, аднак гэта толькі адзін з невялікіх фактараў. Маглі мець ролю і псыхолёгічныя мотывы пры нямецкім перапісу, як страх называць сябе пры перапісу і наогул перад окупантамі—„беларусамі", „рускімі", наагул „русамі". Рэпрэсіі супраць палякоў, якія нібы ўжываліся немцамі, згодна польскіх аўтараў, і спрыяючыя нібы адносіны да беларусаў не маглі мець значэньня для шырокіх мас насельніцтва: бо гэтых фактаў палітычнай тактыкі, апрача польскай і беларускай інтэлігенцыі, насельніцтва не

[1]) Проф. І. Шымановіч у працы: „Західна-Украіна. Територія і населення. Статистична розвідка. Львів. 1927" пры разглядзе мяжы між Заходняй Беларусьсю і Заходняй Украінай піша: „Границі між Украінцями і Білорусами ще й досі остались спірними, хоч маемо в цій справі досить росьліджень цілого ряду вчених" (стар. 16). Проф. І. Шымановіч залічае ў украінскія абшары ўсё Палескае ваяводзтва, апрача паўтара паветаў—Косаўскага—і паловы Пружанскага,—г. зн. тэрыторыю большую, чым якая лічылася украінскаю згодна перапісу 1897 г.

[2]) Stosunki wyznaniowe i narodowościowe powiatu Wołkowyskiego ziemi Grodzieńskiej (1897—1909—1919). Wschód Polski, 1920, № 6 і 7.

[3]) Białoruś w cyfrach i faktach, стар. 18.

[4]) Аб гэтым сьведчыць устойлівасьць % католікоў спаміж насельніцтва па перапісах 1897, 1919 і 1921 г. г. (аб чым ужо было вышэй). Уцекачы-рэпатрыянты (а з іх да моманту перапісу прайшло ў Польшчу 180.7 тыс. беларусаў+114.2 тыс. „расійцаў", а разам 294.9 тыс. чал.) нямінуча зьмянілі-б рэлігійны склад насельніцтва Зах. Беларусі, калі-б структура рэпатрыянтаў не адпавядала даваеннай структуры ўсяго насельніцтва паасобных мясцовасьцяй. (Па проф. Z. Daszyńska-Golińskiej лік беларусаў-рэпатрыянтаў, якія вярнуліся да перапісу 1921 г. 511.1 тыс. чал.).

магло адчуваць. Апроча ненормальных умоў, у якіх адбываліся ўсе нямецкія перапісы—окупацыя, высяленьні, вайсковы рэжым і г. д.— вынікі перапісаў непараўнавальны паміж сабою, а ў такой меры, у якой можна іх параўнаць, даюць цалком супярэчныя лічбы аб асобных нацыянальнасьцях у Заходняй Беларусі [1]).

Гэта прымушае адкінуць нямецкія перапісы, як паважную крыніцу ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі. Такая-ж ацэнка ёсьць і ў польскай літаратуры. Проф. E. Romer піша[2]): „...fakt zupełnej niezgodności podziału administracyjnego kraju nietylko z poprzednim podziałem administracji rosyjskiej, ale nawet pomiędzy podziałem administracji okupacyjnej z r. 1916 i 1918, uniemożliwia wszelką kontrolę lub porównanie wyników, wogóle wszelką ścisłą pracę naukową nad problemem polskości na obszarach dawnej Litwy historycznej, do którego to problemu okupacyjny spis niemiecki dał niewątpliwie najgruntowniejsze i najpoważniejsze podstawy materjalne".

Ня гледзячы на такую ацэнку, не зважаючы на поўную адсутнасьць навуковае крытыкі вынікаў нямецкага перапісу, ды і немагчымасьць такой крытыкі без дакладных матар'ялаў перапісу, у польскай літаратуры вынікі нямецкіх перапісаў былі шырака выкарыстаны, як даказ польскасьці Заходняй Беларусі, як даказ няправільнасьці ўсіх ранейшых статыстычных вестак аб беларускім характары Заходняй Беларусі. Польскія дасьледчыкі, як проф. J. Czekanowski, проф. E. Romer, E. Maliszewski і інш. [3]) лічылі, што вынікі перапісаў, праведзеных немцамі, уносяць цэлы пераварот у ранейшыя погляды на нацыянальныя адносіны ў Заходняй Беларусі. Такіх крыніц нямецкіх-жа перапісаў, па якіх беларусы маюць абсолютную або адносную большасьць у Сьвянцянскім, Лідзкім і Ашмянскім паветах [4]), або што ў Віленска-Троцкім павеце 91,7% усіх беларусаў зьяўляюцца беларусамі-каталікамі і што абсолютная лічба іх вельмі высокая (85 тыс. чалавек, або ў адным павеце больш, чымся па польскім перапісу 1919 г. налічана беларусаў-каталікоў ува ўсёй Зах. Беларусі—66,5 тыс.),— польскія вучоныя відавочна не бяруць пад увагу, або апрыоры лічаць гэтыя вынікі неправільнымі.

Вынікі перапісу 1897 г. былі найбольш варожа спатканы польскай крытыкай. Аднак самі-ж польскія дасьледчыкі яшчэ ў 1918 г. прызнавалі, што ўрадовая расійская статыстыка аб нацыянальным складзе насельніцтва, у тым ліку і нацыянальная статыстыка па перапісу 1897 году, ня мае яшчэ навуковае крытыкі [5]). Ня гледзячы на адсутнасьць навуковае крытыкі вынікаў перапісу 1897 г., у польскай літаратуры звычайнай, тыповай зьяўляецца такая ацэнка вынікаў гэтага перапісу, якую, напрыклад, дае E. Maliszewski:

„Jedyny rosyjski spis ludności, przeprowadzany na odszarze całego państwa w r. 1897, stał się tu, na terenie Litwy i Białorusi, jednym wielkim skandalem naukowym. Tak bezwzględnego, tak powszechnego, i tak najzu-

---

[1]) Гл. аб гэтым стар. 11. „Аб разьбежнасьці вынікаў нямецкага перапісу гл. у „Spisie" E. Romer'a, стар. 5: процант палякоў па 4-х нямецкіх перапісах для Віленскага пав. хістаецца ад 47,7 да 94,7 %.

[2]) „Spis"..., стар. 4-5.

[3]) Гл. раней стар. 10-11 гэтае працы.

[4]) Гл. стар. 11.

[5]) Jan Czekanowski. „Stosunki", стар. 3: „Stwierdzić należy, że systematyczne fałszowanie statystyki osiągnęło zamierzony cel. Nie tylko zdołano na czas długi zbagatelizować w oczach Europy sprawą polską na Litwie i Rusi, lecz nawet obałamucono opinję. polską do tego stopnia, że statystyki, urzędowe nie doczekały się krytycznej oceny aż do czasów ostatnich". Разьбіўка моя. Г. Г.

pełnlej nieliczącego się z istniejącemi faktycznie stosunkami, fałszerstwa spisowego nie dopuszczono się bodaj jeszcze nigdy i nigdzie“ [1]).

...„ogłoszone przez rząd rosyjski sfałszowane rezultaty spisu ludności przyjęte zostały przez naukę europejską za dobrą monetę i znalazły niebawem szerokie rozpowszechnienie w najrozmaitszych wydawnictwach, przyczyniając się do wytworzenia wśród szerokich kół uczonych, polityków i publicystów europejskich najzupełniej błędnych wyobrażeń o istotnym układzie stosunków narodowościowych w tym kraju“ [2]).

У другім месцы Е. Maliszewski бліжэй адзначае недахопы перапісу 1897 г. [2]).

„Spis ten był jednem wielkiem uragowiskiem nad elementarnemi wskazaniami nauki. Przeprowadzali go w tym kraju wyłącznie urzędnicy rosyjscy. Społeczeństwo miejscowe od wschelkich przy nim czynności było najzupełniej odsunięte“...

„...lud wiejski, bez względu na swą najniewątpliwszą nawet polskość, jak np. w pow. wileńskim, zaliczony został wszędzie w poczet Białorusinów“.

Агульнай тэзай для ўсіх польскіх крытыкаў зьяўляецца сьцьвердджаньне, нібы перапіс 1897 г. залічыў запраўдных палякоў у лік беларусаў (не расійцаў!), асабліва ў паселішчах негарадзкога тыпу. Расійцаў па перапісу 1897 г. было зарэгістравана ў негарадзкіх паселішчах Заходняй Беларусі ня вельмі многа: толькі ў некалькіх паветах— Дзісьненскі, Сьвянцянскі, Троцкі, Нова-Аляксандраўскі Беластоцкі, Бельскі і Берасьцейскі — звыш 4-х процантаў. Наадварот, шмат расійцаў паказана ў Заходня-Беларускіх гарадох (15-20%). Калі ў гарадох Заходняй Беларусі лік расійцаў і мог быць больш-менш значным, дзякуючы наезду чыноўнікаў, урадоўцаў, вайсковых, расійскай інтэлігенцыі і г. д.,—то ў вёсках бязумоўна не магло быць і таго процанту расійцаў, які паказаны па перапісу. Бясспрэчна, большасьць так зв. „расійцаў“ па перапісу 1897 г. зьяўляецца беларусамі. Гэта прызнаюць некаторыя польскія аўтары; напрыклад Е. Maliszewski лічыць расійцаў „за неўсьвядомленых нацыянальна беларусаў“ [4]). Акадэмік Е. Ф. Карскі мяркуе, што „к белоруссам следует присоединить во многих случаях и „поляков“ (белоруссов-католиков), а кое-где белоруссы, вероятно, записались великоруссами“ [5]); аб Віленшчыне акад. Карскі піша, што ў гэтым выпадку, „как и в других подобных случаях, многие „поляки“ принадлежат к белоруссам-католикам, белоруссы-православные отчасти попали в отдел великоруссов“ [6]); у агульнай ацэнцы Е. Ф. Карскі прызнае: „перепись 1897 г. очень несовершенной, т. к. во многих местах белоруссы-православные, смешивая народность с религией, назвавшие себя при опросе просто „русскими“, счетчиками присоеденены к великоруссам, а кое-где и к малоруссам, если счетчик плохо отличал белоруссов от малоруссов; в других местах белоруссы-католики, которые при опросе по указанной выше причине называли себя „поляками“, присоединены к полякам“ [7]).

Ва ўсякім выпадку агульнапрызнаным і ў польскай і ў расійскай літаратурах зьяўляецца факт, што лік расійцаў па перапісу 1897 г. у Заходняй Беларусі ня зьменшаны, а перавялічаны; але таму што

[1]) Polski spis ludności na Ziemiach Wschodnich z grudnja 1919 r. Wschód Polski. 1920. № 10-11. (стар. 14).

[2]) Там-жа, стар. 15.

[3]) Edward Maliszewski. Ze statystyki Litwy i Białorusi. Wschód Polski. 1920. № 6 i 7. (стар. 46).

[4]) „Polski spis ludności na Ziemiach Wschodnich“, стар. 20.

[5]) „Этнографическая карта“, стар. 3-4.

[6]) Там-жа, стар. 9.

[7]) Там-жа, стар. 25.

расійцы нават і па перавялічаных лічбах складаюць толькі нязначную нацыянальную меншасьць у Заходняй Беларусі, спрэчкі аб выніках перапісу 1897 году ішлі ў польскай літаратуры не за іх, а за галавы беларусаў, ці яшчэ больш пэўна, за галавы беларусаў-каталікоў. Згодна польскай крытыцы, перапіс 1897 г. нібы спрыяў беларусам, нібы расійскі ўрад імкнуўся падтрымаць беларусаў і г. д.

Вядома, што расійскі ўрад нёс нацыянальнае прыгнечаньне, як паляком, так і беларусам; толькі беларусы ў дадатак адчувалі яшчэ нацыянальнае прыгнечаньне з боку польскіх паноў і ўсёй складанай соцыяльнай сыстэмы, зьвязанай з панствам. Аб „спрыяючых" адносінах расійскага ўраду да беларусаў няма чаго казаць.

Калі-ж адкінуць усе ўмовы перапісу, якія ляжаць на баку суб'ектаў—агэнтаў перапісу (у тым ліку і „спагадлівасьць", „спрыяючасьць"), а ўзяць умовы, якія ляжаць на баку об'ектаў перапісу—самога насельніцтва, дык трэба прызнаць, што об'екты з найбольшай нацыянальнай сьвядомасьцю заўсёды знаходзяцца ў найбольш „спрыяючых", „спагадных" умовах. Прадстаўнікі мала сьвядомага нацыянальна народу могуць запісацца ў лік іншых нацыянальнасьцяй, асабліва прадстаўнікі т. зв. народаў—„этнографічных мас", але цяжка выявіць сабе, каб прадстаўнікі народаў з выразнай нацыянальнай сьвядомасьцю, прадстаўнікі народаў, якія вядуць „актыўную" нацыянальную палітыку, палітыку асыміляцыйную, каб гэтыя прадстаўнікі запісаліся ў лік несконсолідаванай нацыянальнасьці. Беларусы маглі—па несьвядомасьці—запісацца і палякамі і расійцамі; ні расійцы, ні палякі не маглі запісацца беларусамі.

Між тым польская крытыка імкнецца сьцьвердзіць якраз адваротны факт: палякі па перапісу 1897 г. нібы былі запісаны беларусамі. А таму што палякоў-праваслаўных няма, дык трэба шукаць гэтых запісаных беларусамі палякоў спаміж беларусаў-каталікоў. Галоўныя ўвагі польскай крытыкі і былі накіраваны на гэты пункт, на групу беларусаў-каталікоў.

Польская крытыка перапісу 1897 г. з разабраных намі пяці мэтодаў крытыкі нацыянальнай статыстыкі карысталася толькі першымі двумя: апрыорным мэтодам аналізу ўмоў і вынікаў перапісу і мэтодам крытыкі па пасрэдных крыніцах; прасторава-географічны мэтод хоролёгічнага аналізу зьмен і рязьмяшчэньня паказчыкаў нацыянальнага складу цяжка было ўжыць да перапісу 1897 году, бо вынікі яго былі выдрукаваныя толькі паветамі, ня было адпаведнага ліку статыстычных адзінак для аналізу; мэтод аналізу хронолёгічных зьмен, а яго можна было дапасаваць і карыстаючыся павятовымі адзінкамі [1]) быў сьвядома закінут польскай крытыкай на карысьць мэтоду крытыкі па пасрэдных крыніцах. Мэтод этнографічнай экспэртызы, хаця яго можна было таксама добра ўжыць, карыстаючыся шматлікімі этнографічнымі дасьледваньнямі (і сынтэзам гэтых дасьледваньняў, дадзеным акад. Е. Ф. Карскім),—таксама быў адкінуты польскай крытыкай.

Польскія дасьледчыкі крытыкавалі перапіс 1897 году, галоўным чынам, па мэтоду пасрэдных крыніц; такімі дасьледчыкамі былі: W. Wakar, E. Romer, J. Czekanowski, E. Maliszewski і інш. Пасрэдныя крыніцы, скарыстаныя гэтымі аўтарамі, не адпавядаюць аднак, як гэта было разабрана вышэй, ні прынцыпу рэпрэзэнтатыўнасьці, ні прынцыпу ідэнтычнасьці структуры (нацыянальная статыстыка зямляўладаньня і зямляўласьнікаў, статыстыка прадстаўнікоў у земства), ні прынцыпу цес-

[1]) Хаця-б па перапісу 1909 г.

най сувязі абраных паказчыкаў з нацыянальнай прыналежнасьцю (нацыянальна-рэлігійная статыстыка). Польская крытыка таму не дасягнула сваіх навуковых мэт, хаця дасягнула сваю політычную мэту, дзякуючы шматлікім публікацыям з паралельнымі тэкстамі на некалькіх чужаземных мовах. Гэта шчыра прызнае адзін з польскіх аўтараў—Jan Czekanowski:

„Mimo swego niezdecydowanego charakteru i wielkiej chwiejności w poglądach... Krytyka polska osiągnięła jednak jeden ze swych głównych celów. Udało się jej przecie zwrócić uwagę autorów zachodnich na tendencyjny charakter statystyki rosyjskiej“ [1]).

„Krytyka polska przyczyniła się przecież do zdemaskowania tendencyjnej statystyki rosyjskiej w oczach Europy“ [2]).

Польская крытыка ня высьветліла нацыяняльныя адносіны Заходняй Беларусі, а толькі больш зацямніла іх у вачох эўропейскае навукі і грамадзкасьці: бо карысталася яна няпэўнымі ў навуковым сэнсе крыніцамі і мэтодамі крытыкі.

Калі скарыстаць для крытыкі перапісу 1897 г. некаторыя іншыя пасрэдныя крыніцы, больш здавальняючыя прынцып рэпрэзэнтатыўнасьці і ідэнтычнасьці структуры, як напрыклад нацыянальную статыстыку вучняў па школьным перапісу 1911 г., дык можна атрымаць яскравы даказ пэўнасьці вынікаў перапісу 1897 году [3]).

Мэтод хронолёгічнага аналізу зьмен, хаця-б за дзьве даваенныя даты—1897 і 1909 г. г.—паказвае ў 8-мі найбольш каталіцкіх паветах Заходняй Беларусі (звыш 35% каталікоў[1]) вялікую ўстойлівасьць процанту беларусаў-каталікоў сярод усіх каталікоў, блізкасьць процанту беларусаў-каталікоў спаміж усіх каталікоў па перапісу 1909 г. да процанту іх па ведах перапісу 1897 г. Абсолютны лік беларусаў-каталікоў у гэтых 8-мі паветах вырас з 505,1 тыс. да 690,4 тыс. чалавек у 1909 годзе, а па ўсёй Заходняй Беларусі нават з 809,3 тыс. да 1147,9 тыс. Гэта сьведчыць аб рэальнасьці існаваньня беларусаў-каталікоў і бязумоўна блізкай да запраўднасьці іх рэгістрацыі ў 1897 годзе.

Але найбольш бліскуча сьцьвярджаецца пэўнасьць нацыянальнай статыстыкі па перапісу 1897 г. мэтодам этнографічнай экспэртызы: працамі польскіх об'ектыўных дасьледчыкаў—Rozwadowski, Zakzewski, Czyński, Anonim і г. д. Сынтэтычная праца акад. Карскага па ўстанаўленьні мяжы беларускага народу зьяўляецца рэалізацыяй гэтага мэтоду. Праца Карскага, заснаваная і на досьледах польскіх вучоных,

[1]) „Stosunki“, стар. 12.
[2]) „Stosunki“, стар. 40.
[3]) Гл. стар. 31-32. Беларускімі па школьным перапісу зьяўляюцца ўсе паветы Зах. Белар. апрача Віленскага (польскі) і Троцкага (літоўскі).

[4]) Паветы	% кат. у 1897 г.	% беларусаў сярод каталікоў		Лік беларусаў каталікоў (тыс.)	
		1897 г.	1909 г.	1897 г.	1909 г.
Ашмянскі . . .	58,6	89,2	74,8	118,3	148,2
Віленскі	65,5	36,6	29,3	86,9	58,2
Лідзкі	65,4	78,5	67,7	100,9	149,1
Сьвянцянскі . .	80,9	48,9	45,1	65,8	82,3
Троцкі	85,2	17,3	5,6	29,4	22,0
Сакольскі . . .	69,4	98,1	82,4	75,1	91,0
Беластоцкі . . .	47,1	27,3	57,5	26,6	77,8
Бельскі	36,6	3,5	73,2	2,1	61,8
				505,1	690,4

У паветах—Аўгустовскім ня было перапісу 1909 г.; па Браслаўскаму—лічбы ня зусім параўнальны. Узяты пав. з проц. каталікоў звыш 35. Дакладна гл. табліцу № 6.

паказвае ў асноўным блізкасьць да запраўднасьці ведаў перапісу 1897 г. і наяўнасьць адхіленьняў толькі ў бок зьмяншэньня беларусаў, а не наадварот.

Такім чынам, трэба прызнаць у адносінах да перапісу 1897 г.

а) аднабокасьць польскай крытыкі гэтага перапісу, бо карысталася яна пераважна мэтодам пасрэдных крыніц і прытым, такіх крыніц, якія не здавальняюць вымаганьняў прынцыпа рэпрэзэнтацыйнасьці, ідэнтычнасьці структуры і цеснай зьвязанасьці ўкосных паказчыкаў пасрэдных крыніц другога роду з нацыянальнай прыналежнасьцю.

б) Немагчымасьць зарэгістраваньня палякоў або расійцаў беларусамі пры поўнай магчымасьці адваротнае зьявы.

в) Блізкасьць вынікаў перапісу 1897 г. да вынікаў школьнага перапісу 1911 г., які здавальняў вымаганьні рэпрэзэнтацыйнасьці.

г) Блізкасьць азначэньня беларусаў-каталікоў па перапісу 1897 г. і 1909 г.

д) Згоднасьць вынікаў перапісу 1897 г. у асноўным з вынікамі этнографічных дасьледваньняў.

А таму наагул можна лічыць вынікі нацыянальнай статыстыкі Заходняй Беларусі паводле перапісу 1897 г. у асноўным блізкімі да запраўднасьці.

Перапіс 1909 г. можна скарыстаць толькі для азначэньня процанту ў насельніцтве палякоў. Дапасаваць да перапісу 1909 г. усю схэму мэтодаў крытыкі нацыянальнай статыстыкі немагчыма; скарыстоўваем толькі мэтод хронолёгічнага аналізу зьмен [1]). Процанты палякоў у насельніцтве па перапісу 1897 г. і перапісу 1909 г. амаль цалком супадаюць, за выключэньнем Троцкага і Віленскага паветаў, у якіх беларусам належаць толькі больш-менш значныя часткі тэрыторыі і большасьць у насельніцтве захоўваецца за палякамі і ліцьвінамі, і Беластоцкага і Бельскага паветаў, дзе заўважаецца нібы зьніжэньне палякоў і павялічэньне беларусаў. У блізкасьці процантаў палякоў у 1897 і 1909 г.г.—даказ таго, што вынікі перапісу 1909 г. у асноўным ня былі далёкія ад запраўднасьці.

Першы польскі перапіс на абшарах Заходняй Беларусі, перапіс 1919 г., ня меў дакладнай польскай-жа крытыкі. Выдаўца вынікаў гэтага перапісу проф. E. Romer не дае сам крытычнага разгляду лічбаў нацыянальнай статыстыкі 1919 г.; замест гэтага ён прыводзіць крытычнае заключэньне аб выніках перапісу амэрыканскага проф. E. Durand'a, былога кіраўніка Статыстычнага Бюро Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі, члена Дарадчай Тэхнічнай Місіі Амэрыканцаў у Польшчы. Думкі, выказаныя E. Durand'ам нібы вызваляюць E. Romer'a ад даказаў об'ектыўнасьці перапісу: „Opinja ta w znacznej mierze zwalnia mię od dyskusji na temat objektywności, a więc i naukowej wartości spisu“ [2]).

Проф. E. Durand у довад таго, што вынікі перапісу 1919 г. „адпавядаюць запраўднасьці, або да яе дужа блізкія“, прыводзіць такія меркаваньні:

1. Вялікая лічба правадзіўшых аблічэньні, што рабіла цяжкай усякую акцыю тэндэнцыйнага ўмаўленьня між імі.

2. Факт, што пры правядзеньні сьпісу працавалі толькі цывільныя асобы.

3) Факт, што вялікая частка насельніцтва змагла прызнаць сябе толькі як „тутэйшыя“, без паказаньня сваёй нацыянальнасьці.

[1]) Гл. та бл. № 2. E. Romer не даючы дакладнай крытыкі, лічыць што лічбы 1909 г. „są... zupełnie niepewne“. Rocznik..., 1917, стар. 4.

[2]) „Spis“, стар. 8.

4. Факт, што многа каталікоў паказалі сваю нацыянальнасьць рускаю, а замест гэтага многа праваслаўных залічылі сябе да польскай нацыянальнасьці.

5. Факт, што паколькі процант палякоў у пэўных аколіцах многа вышэйшы, чым нам яго дае ўрадовы расійскі перапіс 1897 г., пастолькі адпавядае таму географічнае разьмяшчэньне гэтай нацыянальнасьці і згодзен ён з іншымі вядомымі фактамі.

6. Перш-на-перш факт, што польскі перапіс паказвае, большасьць няпольскай нацыянальнасьці на пэўных малых абшарах, на якіх у выпадку фальшаваньня перапісу, адпавядала-б польскім інтарэсам польская большасьць. Можна гэта заўважыць на вялікіх пасах тэрыторый на ўсход ад Берасьця і на паўднёвы захад ад Менску [1]).

Проф. E. Durand лічыць, што даныя перапісу 1919 г. блізкія да праўды, і што „вялікі пас абшару, які ляжыць на паўночным усходзе Кангрэсовае Польшчы і канчаецца далёка за Вільняю, ёсьць пераважна польскі, у той час як поўдзень і ўсход тых абшараў насяляе пераважна насельніцтва беларускае і праваслаўнае“ [2]).

Так у думцы самога E. Durand'a „абшар званы звычайна Беларусьсю“ [3]), зрабіўся польскай этнографічнай тэрыторыяй. Меркаваньні-ж E. Durand'a былі цікавыя для проф. E. Romer'a ня столькі таму, што яны пазбаўлялі яго самога ад крытычных заўваг, колькі таму, што гэтыя меркаваньні паважнага вучонага чужаземца маглі карыстацца большаю даверлівасьцю замежных вучоных, грамадзкіх, палітычных колаў.

Сам E. Durand ня прысутнічаў пры правядзеньні перапісу [4]). Разгледзім яго крытычныя меркаваньні.

Першая заўвага, што нібы вялікая лічба перапішчыкаў рабіла немажлівым тэндэнцыйныя ўмаўленьні між імі, ня мае ніякага значэньня, паколькі не паказаны нацыянальны склад саміх перапішчыкаў; усякі статыстычны дэмографічны перапіс праводзіцца вялікім лікам перапішчыкаў, але-ж гэта ня значыць, што ўсе перапісы праходзяць без тэндэнцыйнага ўплыву перапішчыкаў. Важна ня столькі ўмаўленьне між перапішчыкамі ў момант перапісу, колькі іх асноўныя адносіны да нацыянальнага пытаньня і тэй ці іншай нацыянальнасьці краіны.

У другой заўвазе E. Durand лічыць станоўчым факт, што перапіс праводзіўся цывільнымі асобамі. Дакладных вестак, хто былі гэтыя „цывільныя асобы“ мы ня маем. Але ясная рэч, што імі маглі быць толькі прадстаўнікі інтэлігенцыі; інтэлігенцыя-ж Заходняй Беларусі належала або да палякоў, або да расійцаў; значыцца і ў першым і ў другім выпадку інтэлігенцыя была варожа беларускаму працоўнаму народу і беларускаму нацыянальна-рэволюцыйнаму руху.

Перапіс 1919 г. праходзіў у выключна напружаных палітычных абставінах, калі здавалася, што і вынікі перапісу маглі вырашыць на доўгія часы палітычны лёс цэлага краю. Найбольш актыўным палітычным элемэнтам выступала польская інтэлігенцыя, пачаўшая ствараць самастойную польскую дзяржаву і ў нацыяналістычным захапленьні марыўшая аб межах 1772 г. і ўключэньні ў польскую дзяржаву беларускіх-каталіцкіх зямель па меншай меры. Расійская інтэлі-

[1]) „Spis“, стар. 8.
[2]) „Spis“, стар. 11. E. Durand дзякуе тым, хто „навуковую справу перапісу“ давёў да канца, надаўшы вынікам перапісу „напрадзіў ясную і вучоную форму табліц, а асабліва map і дыяграм“. На жаль ня ўсе табліцы і мапы выдрукаваны.
[3]) „Spis“, стар. 12.
[4]) „Spis“, стар. 11.

генцыя, якая варожа адносілася і да ідэі стварэньня польскае дзяржавы і тым больш да ідэі самастойнае Беларусі, калі гэтая інтэлігенцыя і ўдзельнічала ў перапісу, то імкнулася павялічыць лік расійцаў.

Польскія аўтары лічаць усё-ж, што і перапіс 1919 г., як і перапіс 1897 г., быў спрыяючым беларусам. Władysław Studnicki піша [1]):

„Spis 1919 r. faworyzował Białorusinów. Zaliczył on do Białorusinów-katolików wielu należących przeważnie do narodowości polskej, lub ściślej biorąc tak samo obcych poczuciu narodowemu bialoruskiemu, jak i polskiemu, ale domagających się języka polskiego w kościele i szkole. Prócz tego znaczna część inteligencji rosyjskiej zapisywala się jako Bialorusini, chcąc wykazać, że niema nic wspólnego z Rosją bolszewicką".

„Chęć robienia Białej Rusi z jednej strony, z drugiej korzystanie z pracy spisywaczy es-erów, ktorzy pracowaly w dawnem ziemstwie rosyjskiem, wpływały na zwiększenie Bialorusinów kosztem Polaków".

Што расійская інтэлігенцыя, у тым ліку эс-эры, партыя, якая найбольш варожа ставілася ў адносінах да беларускага нацыянальнага руху, не магла спрыяць беларусам і запісваць у іх лік палякоў, паказвае простае параўнаньне: у Горадзенскай губ., дзе ня было земстваў і дзе ў перапісу ня прымалі ўдзелу земскія працаўнікі, звычайна на Беларусі належыўшыя да расійскай інтэлігенцыі, лік расійцаў быў у 1897 г.—50.523, або 4,53%, а ў 1919 г.—толькі 4.981 чал., або 0,81%—рэзкае зьмяншэньне; а якраз у земскай губэрні, як прыкладам Меншчына, лік расійцаў з 83.999 або 3,95% у 1897 г. вырас да 118.366 або 6,47% [2]). Лік палякоў у гэтых губэрнях узрос нязвычайна: у Горадзеншчыне з 32.909, або 2,93% да 199.296 або 32,73% усяго насельніцтва, у Меншчыне з 64.617 або 3,01% да 221.381 або 12,11% і ў Віленскай з 130.054 або 8,17% да 754.784 ці 56,87% усяго насельніцтва [3]).

З гэтых лічбаў вынікае, што „цывільныя асобы"—і палякі, і расійцы—ня спрыялі беларусам.

Трэці пункт заўваг E. Durand'a, што вялікая частка насельніцтва прызнала сябе толькі „тутэйшымі", без паказаньня сваёй нацыянальнасьці зьяўляецца якраз даказам таго, што ў нацыянальнай статыстыцы краіны з „тутэйшымі" можа быць шмат статыстычных фікцый.

Насельніцтва, якое ня ведае сваёй нацыянальнасьці, якое ня вышла яшчэ са стадыі этнографічнай масы, найлепш надаецца, каб яго запісаць да тэй нацыянальнасьці, да якой хоча сам перапішчык.

Чацьверты пункт заўваг E. Durand'a зьяўляецца перш-на-перш ня зусім правільным. Ня „многа" каталікоў паказала сябе беларусамі, а толькі 66,5 тыс. з 1.133 тыс. усіх каталікоў, або толькі каля 1/20 часткі іх, тады як у 1897 і 1909 г.г. беларусаў-каталікоў было звыш трох чвэртак ўсіх каталікоў, а абсолютна 809,3 т . і 1.147,9 тыс. чал.; праваслаўных-палякоў налічана толькі 58,3 тысячы. Падругое E. Durand палічыў ледзьве няроўназначнымі два зусім розных факты: тады, як група праваслаўных-палякоў ня існуе, не існавала, і прызнаньне яе рэальнасьці пярэчыла-б усім фактам польскай гісторыі і культуры,—група каталікоў-беларусаў рэальна існавала і была двойчы зарэгістравана сплашнымі статыстычнымі перапісамі, як асноўны элемэнт насяленьня Заходняй Беларусі. Але зьяўленьне групы праваслаўных-палякоў, павялічэньне гэтае групы, азначае той самы факт, што і зьмяншэньне ці нават раптоўнае зьніканьне групы каталікоў-беларусаў—

[1]) Zarys statystyczno-ekonomiczny ziem północno-wschodnich z tablicami statystycznemi. Wilno, 1922, стар. 39.

[2]) Лічбы падае W. Studnicki, „Zarys", стар. 43.

[3]) „Zarys", стар. 32.

факт фальшывасьці, незапраўднасьці першага польскага перапісу 1919 г. Ня вывучыўшы нацыянальных адносін Заходняй Беларусі за ранейшыя часы, выкінуўшы зусім з сваёй крытыкі нацыянальнай статыстыкі адзін з важнейшых мэтодаў яе—мэтод хронолёгічнага аналізу зьмен, проф. E. Durand застанавіўся толькі на падкрэсьліваньні самага факту наяўнасьці некаторай групы беларусаў-каталікоў (каталікоў-расійцаў) і праваслаўных-палякоў, без бліжэйшага вызначэньня генэзісу і дынамікі гэтых груп.

Пятая заўвага E. Durand'a нібы ня скончана, яна цалком не акрэсьленая. E. Durand лічыць: а) што павялічэньне значэньня палякоў па перапісу 1919 г. супроць перапісу 1897 г. адпавядае географічнаму размяшчэньню польскай нацыянальнасьці па абшары Заходняй Беларусі і б) што гэтае павялічэньне „згодна з іншымі вядомымі фактамі". Якімі фактамі, E. Durand не вызначае, таму бездаказная спасылка гэтая на іншыя вядомыя факты сама сабою адкідаецца. Паглядзім, ці ёсьць-жа запраўды сувязь у павялічэньні процанту палякоў і іх ранейшым і сучасным географічным разьмяшчэньнем.

Падамо таблічку процанту палякоў па паветах у 1897 і 1919 годзе і ступень зьмены гэтага процанту [1]):

П А В Е Т Ы:	% палякоў у насельніцтве		Павялічэньне % палякоў у колькі разоў.
	1897 г.	1919 г.	
Віленскі. . . .	12,1	87,3	7
Троцкі	11,0	53,0	5
Браслаўскі . . .	8,4	53,0	7
Сьвянцянскі . . .	5,5	44,5	8
Лідзкі	4,2	78,3	19
Берасьцейскі . . .	3,0	21,3	7
Горадзенскі . . .	3,0	54,0	18
Дзісьненскі . . .	2,4	38,1	15
Вялейскі. . . .	2,2	31,7	15
Кобрынскі . . .	2,1	11,8	6
Пінскі	2,0	3,5	2
Ваўкавыскі . . .	1,9	59,8	30
Ашмянскі . . .	1,6	68,7	43
Навагрудзкі . . .	1,6	15,7	10
Пружанскі . . .	1,4	11,7	8
Слонімскі . . .	1,3	32,4	25

Узрастаньне процанту палякоў ідзе зусім нераўнамерна па абшары Заходняй Беларусі і бяз усякай зьвязанасьці з процантам палякоў па першым перапісу, а таксама і па другім перапісу. Самае моцнае ўзрастаньне ў Ашмянскім, Ваўкавыскім, Слонімскім, Лідзкім, Горадзенскім, Дзісьненскім і Вялейскім паветах—больш чым у 15 разоў; у гэтую групу, як бачым, трапляюць і паветы з розным папярэднім процантам палякоў і паветы з розным процантам палякоў па перапісу 1919 г. і паветы, разьмешчаныя па розных куткох Заходняй Беларусі тэрыторыяльна.

[1]) Паветы разьмеркаваны па велічыні процанту ў іх палякоў; узяты проц. палякоў у паселішчах негарадзкога тыпу.

Факт, на які спасылаецца E. Durand у пункце пятым сваіх меркаваньняў,—няправільны.

Пунктам шостым сваіх крытычных уваг E. Durand лічыць, што калі-б палякі хацелі сфальшаваць перапіс 1919 г., то для чаго-б паказвалі-б яны ў сваёй статыстыцы большасьць няпольскай нацыянальнасьці на некаторых абшарах Заходняй Беларусі. Такія абшары можна заўважыць на ўсход ад Берасьця і паўднёвы захад ад Менску. E. Durand узяў толькі адну з дэталяй больш шырокага мэтоду крытыкі—хоролёгічнага аналізу разьмяшчэньня паказчыкаў нацыянальнага складу насельніцтва. Калі-б першы польскі перапіс насельніцтва Заходняй Беларусі адпавядаў запраўднасьці, ён падаў-бы больш-менш устойлівае і компактнае разьмяшчэньне нацыянальных груп па тэрыторыі. Для польскай нацыянальнасьці гэтая ўстойлівасьць і компактнасьць павінна быць ня большай, чым устойлівасьць і компактнасьць разьмяшчэньня каталікоў, асабліва калі прыняць пад увагу, што і польская статыстыка і польскія дасьледчыкі ставяць знак роўнасьці між польскасьцю і каталіцызмам.

Такой устойлівасьці і компактнасьці няма ў разьмяшчэньні паасобных нацыянальных груп па абшарах Заходняй Беларусі згодна польскаму перапісу 1919 г. Мапаграма № 5 паказвае разьмяшчэньне па валасьцёх беларускай нацыянальнасьці. Цяжка выявіць сабе большую няўстойлівасьць, стракатасьць у разьмяшчэньні, чым гэта ёсьць для разьмяшчэньня беларусаў у 1919 г.

Абшары з абсолютнай няпольскай большасьцю (беларусы) можна спаткаць ня толькі на ўсход ад Берасьця, ці на паўднёвы захад ад Менску, аб чым пісаў E. Durand, а скрозь па Заходняй Беларусі: на поўдзень ад Вялейкі, на ўсход ад Ашмян, на поўдзень ад Ліды, на захад ад Ваўкавыску, на ўсход ад Пружан, на поўдзень ад Слоніму і г. д. Больш значныя абшары—плямы з абсолютнай няпольскай большасьцю (беларусы) можна бачыць у шырокім раёне навакол Пінску, на захад ад Пружан, на поўдзень ад Навагрудку і г. д. Але і наадварот: можна спаткаць раптоўныя правалы, дзе няпольская нацыянальнасьць (беларусы) амаль цалком зьнікае; такія правалы ёсьць каля Навагрудку, каля Слоніму, на поўдзень ад Горадні, каля Ваўкавыску, на поўнач ад Пружан на поўдзень ад Берасьця, каля самога Пінску, шырокая пляма каля Кобрыну і на ўсход ад яго і г. д.

Будзем лічыць, што сярэдняе квадратовае ўхіленьне (σ) і аднаснае сярэдняе квадратовае ўхіленьне (σ_0) па асобных паветах для двух нацыянальных (беларусы і палякі) і двух рэлігійных груп (праваслаўныя і каталікі) паказваюць нам большую ці меншую ўстойлівасьць разьмяшчэньня паказчыкаў рэлігійнай і нацыянальнай прыналежнасьці па тэрыторыі [1]).


У большасьці паветаў устойлівасьць паказчыкаў рэлігійнай прыналежнасьці павінна была-б быць значна вышэйшай, чым устойлівасьць паказчыкаў нацыянальнай прыналежнасьці. Для праваслаўных гэта так і ёсьць, за выключэньнем паветаў: Браслаўскага, Ашмянскага, Лідзкага, Горадзенскага і Ваўкавыскага, у якіх разьмяшчэньне палякоў больш устойліва, чым разьмяшчэньне праваслаўных. Разьмяшчэньне каталікоў наадварот менш устойліва, чым разьмяшчэньне нацыяналь-

[1]) Гл. табліцу № 11. Паветы разьмеркаваны ў географічным парадку.
Вылічэньні зроблены па формуле:

$$\sigma = \sqrt{\frac{\Sigma (x - M)^2}{n}} \text{ і } \sigma_0 = \frac{\sigma}{M},$$

дзе x — % нацыянальнай або рэлігійнай групы у паасобнай воласьці, M—сярэдні процант па павету, n—лік валасьцей у павеце.

№ 5. Разьмяшчэньне беларусаў па абшары Заходняй Беларусі ў 1919 годзе (па валасьцёх).
Distribution of White-Ruthenians on the territory of West-White-Ruthenia in 1919 (in volosts).



Тлумачэньні. Explanation.

Да 10% below

10—25%

25—50%

50—75%

Звыш 75% above

ных груп—палякоў і беларусаў. У паветах, дзе праваслаўныя менш устойлівыя, чым палякі,—малы процант праваслаўных і больш значны процант палякоў [1]). У гэтую групу трапілі ўсе паветы з найменшым процантам праваслаўных у Заходняй Беларусі. Паветы, дзе каталікі менш устойлівы, чым палякі або беларусы,—маюць малы процант каталікоў і параўнальна значны процант палякоў і беларусаў; але ў гэтую групу трапляюць і паветы з высокім процантам каталікоў, але з яшчэ большым (пераважаючым процант каталікоў) значэньнем палякоў [2]). Максімальную ўстойлівасьць у разьмяшчэньні параўнальна з усімі іншымі паказчыкамі маюць праваслаўныя. Устойлівасьць каталікоў пераважае ўстойлівасьць праваслаўных толькі ў некаторых паветах: Ваўкавыскі, Лідзкі, Ашмянскі і Браслаўскі,—гэта ёсьць—у найбольш каталіцкіх паветах Заходняй Беларусі.

Згодна перапісу 1919 г. іншыя нацыянальныя групы, апрача палякоў і беларусаў, былі прадстаўлены ў Заходняй Беларусі вельмі слаба, асабліва украінцы і расійцы; больш моцна прадстаўлены ліцьвіны ў Сьвянцянскім, Троцкім і Браслаўскім паветах. Таму, калі-б трымацца аксіомы польскіх дасьледчыкаў, што ўсе палякі ёсьць каталікі і ўсе беларусы ёсьць праваслаўныя, мы павінны былі-б мець устойлівасьць разьмяшчэньня па абшары палякоў вельмі блізкай да ўстойлівасьці разьмяшчэньня каталікоў (бо быццам няма значных каталіцкіх груп сярод іншых нацыянальнасьцяй) і ўстойлівасьць разьмяшчэньня беларусаў вельмі блізкай да ўстойлівасьці разьмяшчэньня праваслаўных (бо няма іншых значных груп праваслаўных, апрача беларусаў—выключэньнем маглі-б быць „тутэйшыя“ ў Кобрынскім павеце і расійцы ў Дзісьненскім павеце).

Запраўднасьць дае якраз адваротныя факты (згодна перапісу 1919 г.):

Паветы	Устойлівасьць разьмяшчэньня	
	Праваслаўн. %	Беларусаў %
Пінскі	0,087	0,503
Наваградзкі . .	0,246	0,328
Пружанскі . . .	0,252	0,340
Слонімскі . . .	0,254	0,798
Кобрынскі . . .	0,269	3,550
Дзісьненскі . .	0,465	1,124
Вялейскі . . .	0,485	0,500
Горадзенскі . .	0,641	0,758
Ваўкавыскі . .	0,826	1,479
Ашмянскі . . .	0,898	1,232
Браслаўскі. . .	1,103	1,299
Лідзкі	1,136	1,558

[1])

Паветы	% праваслаўн.	% палякоў
Браслаўскі . . .	3,9	67,6
Ашмянскі . . .	34,3	58,7
Лідзкі	20,6	78,3
Горадзенскі . . .	37,0	54,0
Ваўкавыскі . . .	36,1	59,8

[2])

Паветы	% катал.		
Пінскі	4,1	% беларусаў	—75,0
Пружанскі . . .	14,0	„ „	71,8
Берасьцейскі . .	10,2	„ „	45,3
Наваградзкі . . .	18,0	„ „	69,2
Слонімскі . . .	20,8	% палякоў	— 32,4
Ваўкавыскі . . .	52,7	„ „	59,8
Горадзенскі . . .	48,3	„ „	54,0
Лідзкі	72,9	„ „	78,3
Вялейскі	35,5	% беларусаў	—56,0

Разьмяшчэньне беларусаў значна менш устойліва параўнальна з разьмяшчэньнем праваслаўных (большая σ_0). Прычым найбольшае разыходжаньне ў устойлівасьці ёсьць у паветах, дзе ўстойлівасьць праваслаўных максімальная і дзе процант праваслаўных вышэйшы. Відавочна ўжо ў 1919 г. польскай статыстыкай была зроблена спроба разьбіць адналітасьць беларускага этнографічнага абшару нават там, дзе гэтая адналітасьць абсолютна бясспрэчна. (У паветах з максімальным значэньнем праваслаўных, —што цалком адпавядае аксіоме польскіх-жа дасьледчыкаў). Палякі ствараюць невялікія штучныя выспы па ўсёй паўднёвай палавіне Заходняй Беларусі; гэтыя штучныя польскія выспы асабліва вылучаюцца ў Берасьцейскім і Слонімскім паветах.

Устойлівасьць палякоў то вышэй, то ніжэй устойлівасьці каталікоў у адных і тых-жа паветах, прытым паветах, нават, найбольш каталіцкіх:

Паветы	Устойлівасьць разьмяшчэньня	
	Каталікоў σ_0	Палякоў σ_0
Браслаўскі . . .	0,096	0,358
Лідзкі	0,303	0,295
Горадзенскі . .	0,499	0,476
Ашмянскі . . .	0,510	0,543
Дзісьненскі . .	0,569	0,722
Ваўкавыскі . .	0,577	0,528
Слонімскі . . .	0,726	0,685
Наваградзкі . .	0,739	0,848
Пружанскі . . .	0,800	0,949
Вялейскі . . .	0,803	0,808
Кобрынскі . . .	0,900	1,543
Берасьцейскі . .	1,255	1,155
Пінскі	1,440	1,630

Устойлівасьць разьмяшчэньня каталікоў значна бліжэй да ўстойлівасьці палякоў у 1919 г., чым устойлівасьць праваслаўных да ўстойлівасьці беларусаў. Найбольшае разыходжаньне ў устойлівасьці каталікоў і палякоў заўважаецца ў Браслаўскім, Дзісьненскім, Пружанскім Кобрынскім і Наваградзкім паветах. Найчасьцей спатыкаецца вышэйшая ўстойлівасьць каталікоў, чым палякоў.

Усе крытычныя заўвагі проф. E. Durand'а або няверны або няпоўны, не дэталёвы, галоўнае-ж няпоўны. Бо E. Durand зусім прамінуў мэтод хронолёгічнага аналізу, таксама прасторава-географічны мэтод разгляду разьмяшчэньня паказчыкаў нацыянальнага складу (хоролёгічны аналіз) і мэтод этнографічнай экспэртызы ці этнографічных параўнаньняў. Заўвагі E. Durand'а ня сьведчаць аб об'ектыўнасьці перапісу 1919 г.

Абагульваючы, можна лічыць, што вынікі перапісу 1919 г. у азначэньні нацыянальнага складу Заходняе Беларусі не адпавядаюць запраўднасьці:

1. Перапіс адбываўся ў час выключнай напружанасьці політычнай барацьбы навакол нацыянальнага пытаньня і далейшага політычнага лёсу Заходняе Беларусі. Перапіс меў зусім выразную політычную мэту: падрыхтаваць матар'ял для даказу польскай большасьці ў Заходняй Беларусі, як грунт для „об'ектыўнай" окупацыі беларускіх зямель пан-

скай Польшчай; гэта не магло не адбіцца на організацыі і кіраўніцтве перапісам.

2. Кіраўніцтва перапісу было ў руках польскага цывільнага ўраду Усходніх Зямель. (Z. C. Z. W.).

3. Перапіс праводзіўся ў асноўнай масе польскай (і часткова расійскай) інтэлігенцыяй, няспрыяўшай беларусам і іх нацыянальна-рэволюцыйнаму руху.

4. Сярод беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі толькі нядаўна распачаўся процэс крышталізацыі нацыянальна-палітычнай сьвядомасьці. Насельнікі гэтага „клясычнага краю няпісьменнасьці"—беларусы—„найбольш цёмныя і неасьвечаныя масы Эўропы"[1]) пасьля векавых прыгнечаньняў, соцыяльных і нацыянальных, з боку пануючых клясаў суседніх народаў,—знаходзіліся ў стане этнографічнай масы, у стане нацыянальнай неконсолідаванасьці, калі нацыянальная прыналежнасьць лёгка можа быць падменена прыналежнасьцю рэлігійнай. Гэта дало грунт, пры сьвядомай палітыцы польскага „цывільнага" ўраду беларускіх зямель, лёгка ператварыць усіх беларусаў-каталікоў у палякі, а, дзякуючы ўдзелу ў перапісе расійскай інтэлегенцыі, ператварыць значныя масы беларусаў-праваслаўных у расійцаў; нацыянальная нескрышталізаванасьць дала падставу для зьяўленьня такіх груп, як „тутэйшыя", „невядомыя", „простыя" і г. д.

5. Вынікі перапісу 1919 г. ня згодны з вынікамі пасрэдных крыніц перадваеннага часу, як нацыянальная статыстыка вучняў, па школьным перапісу 1911 г., і з вынікамі пасрэдных крыніц пазьнейшага часу, як нацыянальная прыналежнасьць рэпатрыянтаў Заходняй Беларусі за 1918—1924 гады.

6. Хронолёгічны аналіз вынікаў 1919 г. параўнаўча з перапісам 1897 і часткай 1909 г. паказвае: а) раптоўнае зьніканьне беларусаў параўнаўча з перапісам 1897 г. б) Раптоўнае, амаль поўнае, зьнікненьне беларусаў-каталікоў параўнаўча з 1897 і 1909 годам. в) Раптоўнае павялічэньне процанту палякоў у дзесяткі разоў супраць перапісу 1897 і 1909 г. г) Адсутнасьць географічнай законаўпарадкаванасьці ў разьмяшчэньні павялічэньня процанту палякоў. д) Зьяўленьне новай групы праваслаўных палякоў.

7. Хороллёгічны разгляд паказчыкаў нацыянальнага складу (па валасьцёх) сьведчыць аб надзвычайнай стрыкатасьці і няўстойлівасьці разьмяшчэньня паказчыкаў палякоў і беларусаў (вялікая σ_0), нязгоднасьці разьмяшчэньня паказчыкаў і іх устойлівасьці між сабою—разьмяшчэньне рэлігійных груп больш устойлівае, чым разьмяшчэньне груп нацыянальных (праваслаўныя), разьмяшчэньне асноўнай нацыянальнасьці-беларусаў менш устойлівае, чым усіх іншых нацыянальных і рэлігійных груп, разьмяшчэньне і ўстойлівасьць палякоў не адпавядае разьмяшчэньню і ўстойлівасьці каталікоў[2]), устойлівасьць і разьмяшчэньне беларусаў не адпавядае разьмяшчэньню і ўстойлівасьці яго ў праваслаўных.

8. Нязгоднасьць вынікаў перапісу 1919 г. з усім ранейшымі этнографічнымі дасьледваньнямі польскімі і іншымі, адсутнасьць этнографічных дасьледваньняў за гады пасьля перапісу, якія сьцьвярджалі-б пэўнасьць перапісу 1919 г.

Неадпаведнасьць запраўднасьці вынікаў перапісу 1919 г. найбольш яскрава была выяўлена другім польскім перапісам на абшарах Заходняй Беларусі, перапісам 1921 г. Вынікі гэтага перапісу крытычна

[1]) E. Romer „Spis",—стар. 6.

[2]) Калі прыняць нават, што аксіома польскіх дасьледчыкаў аб саўпаданьні рэлігійных і нацыянальных груп у Зах. Беларусі правільна.

разабраў выдатны польскі эканоміст-статыстык Ludwik Krzywicki [1]). L. Krzywicki адзначае, што ў агульнай няпрыхільнасьці, якую сустрэў перапіс 1921 г. у Польшчы, выключэньне рабілі толькі крэсы, дзе ніякай няпрыхільнасьці да перапісу ня было:

„Natomiast, przebieg spisu na Kresach Wschodnich był niezmiernie spokojny. Przysłowiona bierność ludności białoruskiej wystąpiła w całej pełni".

На крэсах было спакойна, хоць ішла агітацыя, і відаць, са ўсходу [2]). Перапішчыкі па L. Krzywick'аму мелі належныя інструкцыі запісваць нацыянальнасьць насельніцтва толькі згодна волі і паказаньню самога насельніцтва:

„Komisarze mieli instrukcję wypełniać odnośną rubbrykę kwestjonaijusza (аб нацыянальнасьці Г.Г.), taksamo jak rubrykę co do języka ojczystego, ściśle wedlug oświadczeń osób spisywanych i przestrzegali naogół skrupulatnie tych przepisów instrukcij. Wypadki, w których komisarze spisowi działali wbrew instrukcji były rzadkie. Wynika to chociażby z małej liczby protestów"...[3]) „Перапісныя камісары", дзякуючы адсутнасьці мясцовай інтэлігенцыі, былі прывезены ў Заходнюю Беларусь з іншых частак Польшчы [4]).

Ніякай агітацыі супроць перапісу з боку нацыянальных меншасьцяй Заходняй Беларусі ня было. Гэта L. Krzywicki адзначае таксама [5]):

„Jest to terytorjum wyróżniające się brakiem wyrobienia politycznego, a w chwili spisu nieobecnością inteligencji miejscowej, która mogła by się podjąć jego dokonania. Gl. U. Statystyczny musiał tu wysłać znaczną liczbą komisarzy spisowych z Warszawy i Lwowa do pomocy władz miejscowych. Komisarze spisowe otrzymali polecenie nienarzucania ludności czegokolwiek wbrew jej woli. Wolno przeto przepuszczać, że spis uchwycił należycie nastroje tamtejsze Mówimy „nastroje", gdyż o świadomem określeniu swej narodowości niema tam jeszcze mowy. O jakich kolwiek agitacjach natury narodowościowej protokóły nie wspominają"...

L. Krzywicki прызнае, што на Крэсах Усходніх „świadomość narodowa szerokich rzesz ludności jest niesłychanie niska, natomiast przynależność wyznaniowa bardzo ważną odgrywa rolę". Таму прыналежнасьць нацыянальная часта падмянялася прыналежнасьцю рэлігійнай [6]).

Аднак ня гледзячы на тое, што пры насельніцтве з нізкай нацыянальнай сьвядомасьцю заўсёды магчымы памылкі ў вызначэньні нацыянальнай прыналежнасьці проф. L. Krzywicki апраўдвае цалком польскую статыстыку 1921 г. у адносінах вызначэньня нацыянальнага складу насельніцтва:

„Naogół w województwie wołynskiem podało się jako Polacy 14,5% ogółu ludności, w poleskiem 21,8%, w nowogródzkiem 50,0%—liczby,

[1]) Rozbior krytyczny wyników spisu. Miesięcznik Statystyczny, t. V, 1922 z. 6.

[2]) Там-жа, стар. 9.

[3]) Там-жа, стар. 21.

[4]) Аб прысылцы „перапісных камісараў" у Заходнюю Беларусь з карэннай Польшчы піша і Jan Piekalkiewicz—былы кіраўнік аддзелу Перапісу Насельніцтва ў Галоўнай Статыстычнай Управе Польшчы. (Organizacja pierwszego powszechnego spisu ludności w Polsce. Mies. stat. t. V. 1922. z. 4).

„Niektóre jednak powiaty, głównie na Kresach, nie mogły liczyć z powodu braku inteligencji (польскай!) na uzyskanie na miejscu niezbędnych im komicarzy spisowych. Dla tego też konieczne było przerzucenie pewnej ilości osób z ośrodków kulturalnych do tych powiatów". (стар. 130).


Дзеля гэтага былі накіраваны на перапіс у Заходнюю Беларусь з Варшавы, Львова, Лодзі і Любліна „перапісныя камісары". Усяго паслана з Варшавы 655 чалавек, з іх на Беларусь 557 чал. у тым ліку на Навагрудзкае ваяводства—203 чал. і ў Беларускую частку Палескага ваяводства—354 чалавекі.

[5]) „Rozbiór"..., стар. 30.

[6]) Там-жа, стар. 22.

№ 6. Разьмяшчэньне беларусаў па абшары Заходняе Беларусі ў 1921 годзе (па валасьцёх).

Distribution of White-Ruthenians on the territory of West-White-Ruthenia in 1921 (in volosts).



Тлумачэньні. Explanation.

Да 10% below

10—35%

25—50%

50—75%

Звыш 75% above

które naszem zdaniem odpowiadają w przybliżeniu liczbie Polaków, albo z tych katolików Białorusinów i nielicznych Żydów, którzy stanowczo ciążą ku Polsce i prędziej lub później zleją się z narodowością polską"[1]).

Паважны польскі вучоны прызнаў такім чынам лічбы перапісу 1921 г. адпавядаючымі запраўднасьці. Другі паважны польскі дасьледчык проф. Lofja Daszyń'ska-Golińska[2]) таксама прызнаё перапіс 1921 г. больш-менш пэўным, па меншай меры ў вызначэньні лічбы палякоў.

„narodowość jest właściwością bardzo złożoną, zależną przedewszystkiem od uświadomienia narodowej przynależności i woli jednostek. Na tem stanowisku stanął spis polski z r. 1921. Nastręcza to wielką trudność ponieważ setki tysięcy, zwłaszcza wśród Białorusinów, nie są narodowo uświadomione. Otrzymujemy jednak pewne dane dla ludności pozostałej.

Naogół powiększyła się liczba Polaków, a obniżyła liczba ludności niemieckiej, ruskiej, białoruskiej a nawet żydowskiej". „Dotychczas ogłoszony materjał spisowy pozwala na stwierdzienie liczebne siły narodowościowej Polaków".

Паданыя прыклады сьведчаць аб бяскрытычнай гатоўнасьці польскай навукі прыняць і веды перапісу 1921 г. за запраўдныя веды. Проф. L. Krzywicki, які меў спэцыяльную мэту разгледзець крытычна вынікі перапісу 1921 г., абмежаваўся ў крытыцы лічбаў нацыянальнай прыналежнасьці па перапісу 1921 г. толькі адным самым прымітыўным мэтодам—мэтодам аналізу ўмоў перапісу, не закрануўшы зусім іншых 4-х мэтодаў крытыкі нацыянальнай статыстыкі (мэтод крытыкі па пасрэдных крыніцах, хронолёгічны аналіз, хоролёгічны аналіз, этнографічная экспэртыза). L. Krzywicki не зьвярнуў ніякай крытычнай увагі на ўнутраную нясупярэчнасьць лічбаў нацыянальнай статыстыкі між сабою, на іх нутраную законаўпарадкаванасьць і ўзаемную ўвязку. Публітыстычная праца K. Srokowsk'ara ў гэтым сэнсе бліжэй да навуковай крытыкі нацыянальнай статыстыкі, чым „крытычны разгляд" проф. L. Krzywick'ara. K. Srokowski піша[3]):

„Ściślejsze studjum nasuwa wniosek o konieczności znacznych poprawek wykazanych cyfr (перапісу 1921 г. Г. Г.) na korzyść Białorusinów. Wyniki spisu bowiem stoją w sprzeczności zarówno z wynikami poprzednich spisów, przez rząd rosyjski przedsiębranych, jak z badaniami osób prywatnych, jak wreszcie z faktami notorycznemi. Przedewszystkiem jednak dane spisu wrześniowego są sprzeczne same z sobą".

Да нешматлікіх цьвярозых і об'ектыўных ацэнак перапісу 1921 г. трэба аднесьці і ацэнку, якую дае E. Maliszewski[4]): пра сьпіс 1921 г. ён піша, што гэты перапіс „nie może oczywiście rościć bynajmniej pretensji do zupełnej dokładności". Бо організацыя перапісу была дрэнная, і насельніцтва на Крэсах усё яшчэ нескрышталізавана ў нацыянальныя групы. Шмат беларусаў запісалася палякамі, напрыклад, у Навагрудзкім ваяводстве[5]).

„Znowu wypada stwierdzić, że aczkolwiek proces utrwalania polskości w mielu okolicach odbywa się obecnie, w ramach państwowości polskiej w tempie bardzo nieraz szybkiem, jednakowoż niepodobna jeszcze brać

[1]) Там-жа, стар. 30.
[2]) Zagadnienia polityki populacyjnej. Warszawa 1927. стар. 191-192.
[3]) Sprawa narodowościówa na kresach wschodnich. (стар. 5), Курсыў мой Г.Г.
[4]) Stosunki narodowosciowe w Rzeczypospolitej Polskiej. Warszawa. 1923.
[5]) Там-жа, стар. 16.

na serjo tych wszystkich oświadczeń polskich ludności pochodzenia białoruskiego, były to bowiem niewątpliwie w wielu wypadkach akcesy nietyle do kultury i narodowości polskiej, ile do samej tylko państwowości polskiej, które dla tych drobnych rolników, marzących jedynie o spokojnej pracy na własnym zagonie, wydawała się w okresie spisu 1921 r. jedyną ostoją tego wymarzonego ładu i porządku. Na tych mieszanych obszarach polsko-białoruskich z przewagą nastrojów „tutejszości" nieprędko jeszcze wogóle oczekiwać można ostatecznego skrystalizowania samych pojęć o narodowości, cóż dopiero poczucia narodowego. Stąd też podczas następnych spisów oczekiwać tu można dużych wahań i odchyleń w kierunku zarówno polskości, jak i białoruszczyzny".

Жорсткую ацэнку польскага перапісу 1921 г. дае ў адносінах вызначэньня украінцаў на Галічыне проф. І. Шимонович [1]).

„Австрійський перепис точно подає число населення, але хибує що до означення проценту окремих національностей. Польский же 1921 р. невірний є в одному і другому, бо українське населення Галичини бойкотувало цей перепис, а урядова польска статистика ставила при перепису лише два питання „польскої" і „непольскої" народности та дуже фальшувала всі спостерігання".

Разгледзім, аднак, вынікі перапісу 1921 г. згодна прынятай намі схэмы мэтодаў крытыкі нацыянальнай статыстыкі.

1. Умовы перапісу 1921 г. былі такія, што з разгляду іх апрыоры можна гаварыць аб няспрыяльнасьці, неспагаднасьці вынікаў перапісу для нацыянальных меншасьцяй наагул. Польская дэмократычная рэспубліка ў нацыянальным пытаньні фактычна прыняла і праводзіла політыку народнай дэмократыі, політыку поўнай асыміляцыі нацыянальных меншасьцяй, асабліва такіх, як беларусы, г. зн. несьвядомых нацыянальна, або блізкіх да палякоў па рэлігіі (беларусы-каталікі) [2]). Гэтая асноўная політычная ўстаноўка польскае дзяржавы ў нацыянальным пытаньні не магла не адбіцца на выніках перапісу 1921 г.;—падругое перапіс праводзіўся ў Заходняй Беларусі сотнямі „перапісных камісараў"—палякоў, якія прыехалі з карэннай Польшчы; зразумела, якая магла быць „об'ектыўнасьць" організацыі перапісу і рэгістрацыі нацыянальнасьцяй пры такіх умовах.

2. Вынікі перапісу нязгодны з вынікамі пасрэдных крыніц—перад- і пасьляваеннага часу: школьнага перапісу 1911 г., нацыянальнай статыстыкі рэпатрыянтаў.

3. Хронолёгічны аналіз зьмен у нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі па перапісу 1921 г. параўнаўча з перапісам 1897 г. і 1909 і 1919 г. г. паказвае вельмі рэзкія зьмены ў нацыянальным складзе, якія не маглі рэальна адбыцца і зьяўляюцца ня больш, як статыстычнымі фікцыямі [3]): а) рэзкае спаданьне яўрэяў і расійцаў у гарадох і нібы раптоўнае зьяўленьне і павялічэньне палякоў, б) рэзкае павялічэньне процанту палякоў за два гады ў паселішчах негарадз-

[1]) Західна Украіна. Львів. 1926. Стар. 6.

[2]) Гл., напрыклад, развагі St. Grabsk-ara Uwagi o bieżącej historycznej chwili Polski. Warszawa. 1923.


„Niema zaś innego rozwiązania tego zagadnienia (нацыянальнага Г. Г.), jak tylko przez wytworzenie na ziemiach rzeczonych narodowej większości polskiej lub przynajmniej takiej przewagi żywiołu polskiego, by decydował on o całem życiu społeczno-politycznem kraju (69).

„O ile w odpowiednim czasie nie potrafimy jakej kolwiek części wschodnich naczych województw zjednoczyć w ten sposób z narodowem polskiem terytorjum-grozić nam będie utracenie jej, tak jak atraciliśmy u 17-tym wieku lewobrzeżną Ukrainą" (70).

Лічыць, што спольшчыць беларускія землі можна ня ў доўгім часе (70), асабліва латва Віленшычну.

[3]) Гл. стар. 22-25, вышэй.

№ 7. Разьмяшчэньне каталікоў па абшары Заходняе Беларусі ў 1921 годзе (па валасьцёх).
Distribution of the catholics on the territory of West-White-Ruthenia in 1921 (in volosts).



Тлумачэньні. Explanation.

Да 10% below

10—25%

25—50%

50—75%

Звыш 75% above

кога тыпу, прычым найбольшае павялічэньне гэтага процанту нібы там, дзе палякоў было найменш у 1919 г., в) зьнікненьне „тутэйшых", расійцаў, ліцьвіноў і г. д. У абсолютных лічбах зьмены ў нацыянальным і рэлігійным складзе Заходняй Беларусі з 1919 да 1921 г. г. адбыліся такія (па абшарах, перапісаных па першым і па другім перапісах—у тысячах чалавек):

Групы	Гарады			Негарадзкія паселішчы			Разам		
	1919 г.	1921 г.	+%	1919 г.	1921 г.	+%	1919 г.	1921 г.	+%
Беларусы . . .	17,4	26,4	+ 51,8	807,2	942,3	+16,7	824,5	968,7	+17,5
„Тутэйшыя" . .	0,1	0,0	—	147,5	27,7	—81,2	147,5	27,7	—81,2
Палякі	38,3	76,7	+100,2	644,2	929,2	+44,2	682,5	1005,9	+47,4
Яўрэі	82,5	82,9	+ 0,5	103,2	96,8	— 5,7	185,7	179,7	— 3,2
Каталікі	29,4	49,0	+ 66,8	625,1	632,5	+ 1,2	654,5	681,6	+ 4,1
Праваслаўныя . .	21,1	38,3	+ 81,6	1079,1	1238,9	+14,8	1100,2	1277,3	+16,1
Юдзеі	94,1	100,8	+ 7,2	148,0	130,5	—11,8	242,1	231,3	— 4,5
Усё насельніцтва .	145,8	190,2	+ 30,5	1881,1	2031,5	+ 0,8	2026,9	2221,7	+ 9,6

Нязгоднасьць зьмены палякоў і каталікоў устанаўляецца гэтымі лічбамі цалком для ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, ахопленай двойчы перапісамі. Па гэтай тэрыторыі лік палякоў узрос на 323,4 тыс. чал., лік каталікоў толькі на 27,1 тыс. чал.; лік беларусаў узрос на 144,2 тыс., лік праваслаўных на 177,3 тыс. чалавек. Палякоў было больш чым каталікоў у 1919 г. на 28 тыс. чал., у 1921 г. ужо на 324,3 тыс. чал.

Асабліваcьцю перапісу 1921 г. было далейшае зьмяншэньне групы беларусаў-каталікоў і павялічэньне групы праваслаўных-палякоў: беларусаў-каталікоў у 1919 г. было яшчэ налічана 66,5 тыс. чалавек, у 1921 г. у трох ваяводзтвах (Беластоцкае, Наваградзкае і Палескае)—толькі 24,1 тыс. чалавек; праваслаўных-палякоў у 1919 г. было 58,3 тыс., у 1921 г. у трох ваяводзтвах ужо 332,9 тыс. Фальшываcьць польскага перапісу 1921 г. тут бясспрэчна.

4. Хорологічны аналіз разьмяшчэньня паказчыкаў нацыянальнага складу сьведчыць аб такой-жа няўстойлівасьці разьмяшчэньня па тэрыторыі Заходняй Беларусі палякоў і беларусаў у 1921 г., як гэта было і паводле перапісу 1919 г. Мапаграма № 6 прадстаўляе разьмяшчэньне беларусаў па абшары Заходняй Беларусі згодна перапісу 1921 г. Надзвычайная няўстойлівасьць і стракатасьць разьмяшчэньня беларусаў відавочны. Плямы абсолютнай большасьці беларусаў зноў раскіданы па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі. Але скрозь гэтыя плямы нібы бляднеюць, асабліва на поўначы і захадзе: зьмяншаецца пляма абсолютнай большасьці беларусаў на поўдні і поўначы-ўсходзе ад Горадні, на захад і ўсход ад Ліды, на поўдзень і ўсход ад Наваградку, на захад ад Пружан; меншую выяўленасьць атрымоўвае вялікі абшар з беларускай большасьцю на паўночны-ўсход ад Пінску (было звыш 75%, цяпер толькі ад 50 да 75% беларусаў), але ўзмацнілася пляма на поўдзень ад Слоніму, на поўдзень і поўнач ад Берасьця і г. д.

Разьмяшчэньне па тэрыторыі Заходняй Беларусі каталікоў у 1921 г. (мапаграма № 7) значна больш устойліва, чым разьмяшчэньне беларусаў. Групы мясцовасьцяй з абсолютнай большасьцю каталікоў разь-

мешчаны кампактнымі масамі доўгаю вузкаю ўскрайкаю на самым захадзе Заходняй Беларусі і на шырокім масыве на поўначы-захадзе. (Заходняя палавіна паўночнае часткі Заходняй Беларусі). Кампактнай тэрыторыяй зьяўляюцца і абшары, дзе процант каталікоў ня звыш 10. Гэта ўся паўднёвая палавіна Заходняй Беларусі, апрача вузкай заходняй ускрайкі і значныя часткі поўначы-ўсходу Заходняй Беларусі. У той час як у разьмяшчэньні беларусаў па тэрыторыі ня можна заўважыць выразна выяўленай законаўпарадкаванасьці ў кірунку паступовага ўзрастаньня значэньня беларусаў,—у разьмяшчэньні каталікоў такую законамернасьць кірункаў лёгка заўважыць: гэта паступовае ўзрастаньне каталіцызму з поўдня-ўсходу на поўнач-захад.

Некаторы дзіўны бег этнографічнай мяжы беларускай нацыянальнасьці, калі яе правесьці згодна перапісу 1921 г. (мапа-схэма № 4 у параўнаньні з мапаграмай № 7) цяпер можа быць растлумачана: у асноўным гэта—усходняя мяжа каталіцызму.

Для выяўленьня ўстойлівасьці разьмяшчэньня паказчыкаў па тэрыторыі скарыстаем зноў сярэдняе квадратовае ўхіленьне і адноснае сярэдняе квадратовае ўхіленьне (σ_0). (Чым σ_0 менш, тым больш устойліва разьмяшчэньне)[1]).

У паветах з максімальным лікам праваслаўных найбольш устойліва разьмешчаны з усіх груп праваслаўныя: (паветы—Слонімскі, Навагрудзкі, Берасьцейскі, Пружанскі, Кобрынскі і Пінскі—праваслаўных звыш 70 процантаў). Каталікі больш устойлівы, чым іншыя групы, толькі ў адным Браслаўскім павеце: у гэтым ёсьць падабенства да 1919 г., калі каталікі былі разьмешчаны больш устойліва, чым іншыя групы, толькі ў двух паветах.


Разыходжаньне ў устойлівасьці разьмяшчэньня каталікоў і палякоў зрабілася ў 1921 г. больш рэзкім, чым яно было ў 1919 г.

Устойлівасьць разьмяшчэньня:

Паветы	У 1921 г.		У 1919 г.	
	Каталікоў σ_0	Палякоў σ_0	Каталікоў σ_0	Палякоў σ_0
Браслаўскі	0,091	0,224	0,096	0,358
Лідзкі	0,325	0,225	0,303	0,295
Ашмянскі	0,509	0,328	0,510	0,543
Горадзенскі	0,548	0,406	0,499	0,476
Дзісьненскі	0,550	0,544	0,569	0,722
Ваўкавыскі	0,604	0,340	0,577	0,528
Пружанскі.	0,629	0,542	0,800	0,949
Слонімскі	0,752	0,498	0,726	0,685
Вялейскі	0,796	0,460	0,803	0,808
Навагрудзкі	0,966	0,556	0,739	0,848
Берасьцейскі	1,020	0,570	1,255	1,155
Пінскі	1,273	0,971	1,440	1,630

[1]) Гл. табліцу № 12; паветы ідуць у географічным парадку.

№ 8. Разьмяшчэньне па абшары Заходняе Беларусі зьмены абсолютнага ліку каталікоў з 1919 г. да 1921 г. (па валасьцёх).
The distribution alterations taken place in the absolute number of the catholics on the territory of West-White-Ruthenia from 1919 to 1921 (in volosts).



Тлумачэньні. Explanation.

Да +10% below
+10—25%
+25—50%
+50—75%
Звыш +75% above
—п%

Выключэньнем зьяўляецца толькі Браслаўскі, Дзісьненскі і Кобрынскі паветы, дзе разыходжаньне ў устойлівасьці разьмяшчэньня каталікоў і палякоў менш у 1921 г., чым было ў 1919 г.

У 1919 г. толькі ў пяці паветах устойлівасьць палякоў была вышэй, чым устойлівасьць разьмяшчэньня каталікоў. У 1921 г. такіх паветаў дзесяць, і толькі тры з устойлівасьцю меншаю ў палякоў, чым у каталікоў. Гэта сьведчыць аб усё большым пашырэньні палякоў за кошт далучэньня да сябе іншых нацыянальных груп, некаталікоў па рэлігіі: большая ўстойлівасьць палякоў, чым каталікоў, магла быць створана толькі шляхам далучэньня такіх груп. Аб гэтым-жа сьведчыць большае разыходжаньне ўстойлівасьці разьмяшчэньня каталікоў і палякоў у 1921 г., чым у 1919 г.

Разыходжаньне ўстойлівасьці праваслаўных і беларусаў параўнаўча з 1919 г. было ў 1921 г. такім:

Устойлівасьць размяшчэньня:

Паветы	1921 г.		1919 г.	
	σ_0 Праваслаўных	σ_0 Беларусаў	σ_0 Праваслаўных	σ_0 Беларусаў
Пінскі . . .	0.089	0,213	1,087	0,503
Кобрынскі . . .	0,114	0,782	0,269	3,550
Пружанскі . . .	0,197	0,543	0,252	0,340
Слонімскі . . .	0,208	0,231	0,254	0,798
Берасьцейскі . .	0,225	0,288	0,323	0,938
Навагрудзкі . . .	0,231	0,421	0,246	0,328
Дзісьненскі . . .	0,437	0,424	0,465	1,124
Вялейскі . . .	0,466	0,412	0,485	0,500
Горадзенскі . . .	0,526	0,708	0,641	0,758
Ваўкавыскі . . .	0,621	0,960	0,826	1,479
Ашмянскі . . .	0,743	0,871	0,898	1,232
Браслаўскі . . .	1,024	0,966	1,103	1,299
Лідзкі	1,076	1,122	1,136	1,558

Устойлівасьць праваслаўных была і ў 1919 годзе і ў 1921 годзе значна вышэй, чым устойлівасьць беларусаў; устойлівасьць разьмяшчэньня каталікоў наадварот ніжэйшая, чым устойлівасьць разьмяшчэньня палякоў. Гэта сьведчыць усё аб адным і тым-жа факце: аб залічэньні значных груп праваслаўных у лік іншых нацыянальных груп, апрача беларускай („праваслаўныя-палякі“).

Хорологічны разгляд зьмены паказчыкаў нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Беларусі дае магчымасьць устанавіць няўстойлівасьць ня толькі ў разьмяшчэньні паасобных нацыянальнасьцяй, але няўстойлівасьць разьмяшчэньня і іх зьмен, незаконаўпарадкаванасьць саміх зьмен. Мапаграмы № 8 і № 9 паказваюць зьмены па валасьцёх абсолютнага ліку каталікоў і палякоў з 1919 да 1921 г. Зьмены ліку каталікоў і нязначныя па разьмеры і вельмі кампактна разьмешчаны па абшары Заходняй Беларусі. Некаторая стракатасьць і наагул больш значнае павялічэньне каталікоў заўважаецца на самым поўдні Заходняй Беларусі. Павялічэньне-ж ліку палякоў перш-на-перш вельмі рэзка: па большай частцы тэрыторыі Заходняй Беларусі, асабліва ў паўднёвай палавіне, лік палякоў нібы ўзрос за два гады больш чым

на 75 процантаў; падругое, зьмены ліку палякоў значна больш нераўнамерна, значна больш няўстойліва разьмешчаны па тэрыторыі, чым зьмены ліку каталікоў; асаблівая стракатасьць у павялічэньні ліку палякоў ёсьць у цэнтральнай і паўночна-ўсходняй частцы Заходняй Беларусі.

Устойлівасьць зьмены паказчыкаў нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасьці можна таксама вымераць адносным сярэднім квадратовым ухіленьнем (σ_0). Гэта адноснае ўхіленьне для зьмены з 1919 да 1921 году ў абсолютным ліку беларусаў, палякоў, праваслаўных і каталікоў было такое:

Устойлівасьць разьмяшчэньня зьмены ліку:


Паветы	Беларусаў σ_0	Палякоў σ_0	Праваслаўных σ_0	Каталікоў σ_0
Браслаўскі . . .	4,028	109,546	8,696	7,228
Дзісьненскі . . .	0,769	4,235	[200,000]	7,364
Вялейскі . . .	6,148	2,834	65,875	7,808
Ашмянскі . . .	0,696	1,507	10,239	3,074
Лідзкі	69,250	14,100	5,579	11,600
Горадзенскі . . .	2,796	0,764	0,482	18,286
Ваўкавыскі . . .	5,363	4,619	0,782	4,171
Слонімскі . . .	0,568	16,598	0,929	11,949
Навагрудзкі . . .	2,077	0,744	2,812	15,707
Берасьцейскі. . .	0,483	5,401	0,501	3,041
Пружанскі . . .	4,222	0,589	1,581	5,173
Кобрынскі . . .	—	—	2,401	20,408
Пінскі	2,863	0,689	6,844	0,782

Цяжка ўявіць сабе большую няўстойлівасьць у зьменах ліку асноўных нацыянальных і рэлігійных груп Заходняй Беларусі, чым яна была зарэгістравана перапісамі 1919—1921 году. Няўстойлівасьць зьмен і нязьвязанасьць тэмпу зьмен палякоў і каталікоў відна і з непасрэднага параўнаньня процанту зьмены па паасобных паветах.

Зьмены з 1919 да 1921 году ліку беларусаў,—палякоў, праваслаўных і каталікоў ($\pm$ % %) у негарадзкіх паселішчах:

Паветы	Беларусы:	Палякі	Праваслаўныя	Каталікі
Браслаўскі . . .	— 18,1	— 1,1	+ 4,6	— 6,6
Дзісьненскі . . .	+ 126,3	+ 11,5	— 0,1	+ 2,2
Вялейскі . . .	— 9,5	+ 39.2	— 1,6	— 2,6
Ашмянскі . . .	+ 296,1	+ 21,9	+ 6,3	+ 2,7
Лідзкі	— 2,0	+ 2,0	+ 11,4	+ 0,5
Горадзенскі . . .	+ 14,7	+ 123,5	+ 43,6	+ 4,2
Ваўкавыскі . . .	+ 37,8	+ 39,1	+ 45,8	+ 4,1
Слонімскі. . . .	+ 93,9	+ 8,2	+ 35,0	— 3,9
Навагрудзкі . . .	— 18,2	+ 162,9	+ 5,3	+ 3,4
Берасьцейскі. . .	+ 93,6	+ 32,9	+ 41,9	+ 26,9
Пружанскі . . .	— 13,1	+ 385,1	+ 30,3	+ 33,0
Кобрынскі . . .	+ 480,1	+ 281,1	+ 38,9	+ 7,6
Пінскі	+ 8,0	+ 353,1	+ 6,4	+ 14.7
Іншыя паветы . .	— 16,8	+ 111,9	+ 12,6	— 8,3

№ 9. Разьмяшчэньне па абшары Заходняе Беларусі зьмены абсолютнага ліку палякоў з 1919 г. да 1921 г. (па валасьцёх).
The distribution alterations taken place in the absolute number of Poles on the territory of West-White-Ruthenia from 1919 to 1921 (in volosts).



Тлумачэньні. Explanation.

Да+10% below
+25--50%
Зрыш+75% above
+10—25%
+50—75%
—n%

Ні ў напрамку, ні ў тэмпе зьмены абсолютнага ліку асноўных груп насельніцтва Заходняй Беларусі няма ніякае сувязі паміж сабою, асабліва ў зьменах лічбы палякоў і каталікоў. Найбольш законамерна зьмяняецца лік праваслаўных, ён стала павялічваецца (зварот уцекачоў-рэпатрыянтаў) і найбольш у паўднёвых частках Заходняй Беларусі. Павялічэньне каталікоў ідзе значна цішэйшым тэмпам, за выключэньнем Пружанскага, Пінскага і Берасьцейскага паветаў. Узрастанне-ж палякоў ідзе бурлівым тэмпам ня толькі ў гэтых паветах, (Пружанскі, Пінскі, Берасьцейскі), але нават і ў такіх паветах, дзе лік каталікоў зьніжаецца (Слонімскі і Вялейскі), або дзе ён вельмі слабы (Кобрынскі, Ваўкавыскі і Горадзенскі).

Больш дакладнае разыходжаньне велічыні процанту палякоў і каталікоў паказана на мапаграме № 10 (па валасьцёх). У большай частцы Заходняй Беларусі па тых самых тэрыторыяльных адзінках процант палякоў у 2—5 разоў больш, чым процант каталікоў; у значнай частцы валасьцей у 5—10 разоў больш, і ў немалым ліку валасьцей на поўдні Заходняй Беларусі процант палякоў больш чым у 10 разоў перавышае процант каталікоў!

Такога разыходжаньня ў процанту палякоў і каталікоў, да якога прывёў перапіс 1921 году, ня было і ў 1919 годзе (цэлыя паветы).

Паветы	1919 год.			1921 год.		
	% палякоў	% каталікоў	± %%	% палякоў	% каталікоў	± %%
Браслаўскі . . .	83,3	67,6	+ 15,7	80,9	69,6	+ 11,3
Лідзкі	77,1	71,2	+ 5,9	77,0	69,9	+ 7,1
Ашмянскі . . .	58,7	59,6	— 0,9	71,1	60,9	+ 10,2
Ваўкавыскі . . .	57,8	50,9	+ 6,9	69,6	46,3	+ 23,3
Горадзенскі . . .	49,3	44,6	+ 4,7	55,5	41,2	+ 14,3
Дзісьненскі . . .	38,6	37,5	+ 0,6	42,1	37,8	+ 4,3
Вялейскі . . .	31,2	34,8	— 3,6	45,2	35,0	+ 10,2
Слонімскі . . .	30,8	20,1	+ 10,7	28,0	16,2	+ 11,8
Берасьцейскі . . .	24,8	11,1	+ 13,7	31,2	15,0	+ 16,2
Наваградзкі . . .	15,5	17,8	— 2,3	38,3	18,1	+ 20,2
Кобрынскі . . .	15,2	4,4	+ 10,8	38,4	4,1	+ 34,3
Пружанскі . . .	11,4	13,7	— 2,3	44,3	14,8	+ 29,5
Пінскі	4,4	4,4	+ 0,0	17,0	5,0	+ 12,0
Іншыя паветы . .	21,9	27,9	— 6,0	44,3	24,3	+ 20,0

Па ўсёй Заходняй Беларусі процант палякоў у 1919 годзе (33,5) больш процанту каталікоў (32,3) вельмі нязначна. У 1921 годзе процант палякоў (47,3) ужо значна вышэй, чым процант каталікоў (30,7), вышэй больш, чым у паўтары разы.

Такім спосабам хоролёгічны аналіз разьмяшчэньня паказчыкаў нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Беларусі і разьмяшчэньня зьмены гэтых паказчыкаў упэўнівае ў бясспрэчнай недакладнасьці перапісу 1921 году, большай недакладнасьці, чым яна была нават у перапісу 1919 году.

5. Нязгоднасьць вынікаў перапісу 1921 году—ёсьць і з перадваеннымі этнографічнымі дасьледваньнямі і з вынікамі гэтых дась-

ледаваньняў—абагульваючай працай акад. Карскага. Ніякіх новых этнографічных дасьледваньняў пасьля перапісу 1921 г., якія сьцьвярджалі-б хаця-б у малой меры пэўнасьць вынікаў перапісу 1921 г., ня было.

ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ.

Крытычны разгляд непасрэдных і пасрэдных крыніц ведаў аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі паказвае, як далёкі вынікі польскіх перапісаў 1919 і 1921 году ад запраўднасьці і об'ектыўнасьці ў сэнсе высьвятленьня нацыянальных адносін у Заходняй Беларусі. Відавочна, што бяскрытычнае скарыстаньне вынікаў гэтых перапісаў (а перапіс 1921 году быў апошнім перапісам на тэрыторыі Заходняй Беларусі, значыцца найноўшым) для ўстанаўленьня этнографічнай мяжы Заходняй Беларусі ў Польшчы,—немагчыма.

Якія-ж папраўкі можна ўнесьці ў перапіс 1921 году, а часткова і ў перапіс 1919 году, каб скарыстаць іх багатыя і параўнаўча новыя матар'ялы аб насельніцтве Заходняй Беларусі?

